WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

17 КРАСАВІКА 2010 г.
СУБОТА
№ 74
(26682)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ДАРУЧЫЎ ДЗЯРЖАЎНЫМ СМІ АБМЕЖАВАЦЬ ТРАНСЛЯЦЫЮ ЗАБАЎЛЯЛЬНЫХ ПРАГРАМ 18 КРАСАВІКА

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка даручыў усім дзяржаўным сродкам масавай інфармацыі ў нядзелю, 18 красавіка, у сувязі з пахаваннем Прэзідэнта Польшчы Леха Качыньскага і іншых загінуўшых у выніку авіякатастрофы пад Смаленскам абмежаваць трансляцыю забаўляльных праграм з 12.00 да 18.00. Кіраўнік дзяржавы прапанаваў недзяржаўным СМІ таксама перагледзець сетку свайго вяшчання ў гэтыя гадзіны.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Рэзананс

НАПІСАНАЕ ЗАСТАЕЦЦА

У нумары «Звязды» за 2 сакавіка было змешчана апавяданне Фелікса Шкірманкова «Шуруй, доктар!». Галоўны герой яго — не прыдумка аўтара, а наш дарагі і любімы бацька, кіраўнік антыфашысцкай падпольнай групы Пётр Антонавіч Норка.

Гэта ён, выконваючы адно з баявых заданняў, быў вельмі цяжка паранены ў нагу. Гэта яму патрабавалася ампутацыя. Прычым тэрміновая. І доктар быў. А больш...

Не мелася ні адпаведных інструментаў, ні наркозу. Так што, наліўшы пацыенту першаку і, так бы мовіць, «закілзаўшы», каб не адкусіў сабе язык, рэзалі нагу і сапраўды звычайнай нажоўкай... Нават уяўляць гэта жудасна. А ўжо перажыць...

Мужыкі, якія трымалі нашага бацьку, і сапраўды страчвалі прытомнасць... Сам ён заходзіўся і роў ад болю. Але ж, як аддзякаваць Богу?! Вытрымаў, выжыў...

Пра гэты трагічны выпадак (і пра многія іншыя) тата, зразумела ж, расказваў нам, сваім чатыром дочкам, зяцям, унукам, знаёмым. Але адна справа была пачуць, зусім іншая — праз столькі гадоў прачытаць у газеце, якая выходзіць шматтысячным тыражом...

Публікацыя ў газеце «Звязда» ажывіла памяць, з'яднала ўсіх, хто любіў і ведаў нашага бацьку (ён пайшоў з жыцця 11 кастрычніка 1994 года). Мы, яго родныя, знаёмыя, былыя партызаны, раскіданыя па розных гарадах і нават краінах, зноў успаміналі яго, тэлефанавалі адзін аднаму, праглядалі фотаздымкі...

Гэтае ж апавяданне стала пачаткам размовы-сустрэчы віляйчан са старшынёй Мінскай абласной арганізацыі ветэранаў апошняй (дай Бог!) вайны Аляксандрам Іванавічам Слабадой, інфармацыі ў раённай газеце, урокаў у школе.

Таму наш нізкі паклон аўтару Феліксу Шкірманкову, а таксама вядучаму конкурсу на лепшае апавяданне слыннаму пісьменніку Віктару Казько, рэдакцыі «Звязды». Напісанае, як вядома, застаецца. І, зразумела ж, не толькі на паперы, а яшчэ і ў сэрцах, у памяці людзей, дзеля якіх жыў, ваяваў і працаваў наш бацька — інвалід Вялікай Айчыннай Пётр Антонавіч Норка.

З павагай і ад імя яго вялікай сям'і дачка — Ганна Пятроўна ШЭПЕЛЕВА (Норка), *г. Вілейка*

Большасць беларусаў галасуе, кіруючыся практычнымі меркаваннямі

Такія вынікі апытання, праведзенага Інфармацыйна-аналітычным цэнтрам пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Для большай часткі выбаршчыкаў (70 %) мае значэнне прафесійная прыналежнасць кандыдата ў дэпутаты: арыентаваныя на кіраўнікоў і спецыялістаў прадпрыемстваў і арганізацый з рэальнага сектара эканомікі 24 % рэспандэнтаў, на работнікаў адукацыі, аховы здароўя, культуры, навукі — 19 %, прадстаўнікоў дзяржаўных органаў улады, палітычных і грамадскіх дзеячаў — 15 %.

У параўнанні з выбарамі 2007 года гэтыя сацыяльныя групы сталі больш значнымі для выбаршчыкаў (гл. дыяграму).

ЧЫМ ВЫ ЗВЫЧАЙНА КІРУЕЦЕСЯ, ГАЛАСУЮЧЫ ЗА КАНДЫДАТА Ў ДЭПУТАТЫ?

(у % ад колькасці апытаных)



Практычнымі меркаваннямі: дапаможа вобласці, раёну, нашаму прадпрыемству і да т.п.
Яго незаплямленай рэпутацыяй
Яго палітычнымі поглядамі
Хутчэй сімпатыяй да чалавека

БПС-БАНК

ОАО «БПС-Банк» сообщает, что с 19 апреля 2010 года по вновь привлекаемым денежным средствам в срочный банковский депозит в белорусских рублях **«Праздничный»** устанавливается процентная ставка в размере 19,5 % годовых.

Одновременно прекращается прием денежных средств на условиях срочного банковского депозита в белорусских рублях **«Сберегательный»**.

С 26 апреля 2010 года вводится в действие срочный банковский депозит в белорусских рублях **«Баланс интересов»** на следующих условиях:

Размер процентов	за 1–4 месяцы – СР + 6 (19 % годовых); за 5–10 месяцы – СР + 7 (20 % годовых); за 11–12 месяцы – СР + 10 (23 % годовых).
Срок хранения	1 год
Сумма первоначального взноса	300 000 белорусских рублей.
Максимальная сумма депозита	Не ограничивается.
Дополнительные взносы	Без ограничения суммы и периодичности внесения в течение 10 месяцев после заключения договора.
Условия частичного востребования средств	Не производится.
Условия досрочного востребования средств	до 1-го месяца включительно – ставка текущих счетов физических лиц; свыше 1 месяца – установленная ставка по депозиту; за неполные месяцы – ставка последнего начисления процентов.
Порядок начисления и выплаты процентов	Ежемесячная капитализация с возможностью их востребования за любое количество сроков начисления либо ежемесячно начисленные проценты переводятся на карт-счет с начислением процентов, установленных для карт-счетов физических лиц.
Карт-счет к депозиту	Перечисление ежемесячно начисляемых процентов и суммы депозита по окончании его срока.
Иные условия	Возможность заключения договора на имя другого лица.

ОАО «БПС-Банк» предоставляет клиентам Банка возможность пополнения и получения средств с вкладных, текущих счетов в любом подразделении Банка на территории Республики Беларусь.

В соответствии с Декретом Президента Республики Беларусь № 22 от 04.11.2008, государство гарантирует полную сохранность денежных средств физических лиц в белорусских рублях и иностранной валюте, размещенных на счетах и (или) во вклады (депозиты) и возмещение 100 процентов суммы этих средств в валюте счета либо вклада (депозита).

Дополнительную информацию можно получить в любом учреждении ОАО «БПС-Банк», на сайте банка www.bpsb.by или по телефонам:

- **148** в стационарной сети;
- МТС (029) **5-148-148, 2-148-148;**
- Velcom (044) **77-00-148, 77-55-148.**

Проценты, выплаченные по депозитам в белорусских рублях в течение 2009 г. (млрд. руб.): январь – 4,6; февраль – 4,0; март – 4,8; апрель – 4,8; май – 4,7; июнь – 5,0; июль – 4,9; август – 4,9; сентябрь – 4,9; октябрь – 5,1; ноябрь – 5,6; декабрь – 5,8.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 13.11.2008 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673. ОАО «БПС-Банк».

Гаспадары

СІМАНІЦКІЯ КААПЕРАТЫВЫ: БОРЦЕВЫ І ШПАЧЫНЫ

У колішнія часы ў вёсцы Сіманічы кожны гаспадар быў бортнікам. І нікога гэта не здзіўляла. Асабліва на Убарцкім Палессі. Гэта цяпер на пчаліную калоду пазіраеш, як на нешта незвычайнае, не зусім уяўляючы, як магчыма аднаму падняць важкі і аб'ёмісты кавалак дрэва больш чым на 10-метровую вышыню і надзейна прымацаваць. А ўбачыць адразу дзесяць альбо пятнаццаць борцяў?! Здаецца, прасцей сярод белага дня спаткаць іншапланецяніна. Вяскоўцы нярэдка прыводзяць гасцей на ўсходнюю частку Сіманіч, каб паказаць пчаліную гаспадарку **Мікалая ХВАЦІКА** — сапраўдную «разынку» не тое што вёскі — паляшуцкага краю.

— Усіх калод у мяне каля трыццаці штук, і яшчэ сем звычайных рамачных вулляў, — кажа 81-гадовы патомны бортнік. — Здабычай дзікага мёду займаліся мае і дзед, і бацька. Адной з калод, якая перайшла ад дзеда, каля 200 гадоў, іншым жа па трыццаць—пяцьдзясят.

І хоць гэткіх майстроў найстаражытнейшага традыцыйнага промыслу, як Мікалай Гаўрылавіч Хвацік, у вёсцы цяпер можна па пальцах пералічыць, але яны ўсё ж ёсць. І адзін з іх — **Міхаіл КАЗАЧЭНКА**. Але школьны вартаўнік здзіўляе аднавяскоўцаў не пчалінымі калодамі, а звычайнымі шпакоўнямі. Нядаўна ён папоўніў шпачыны кааператыў у сваім агародзе яшчэ дзвюма хаткамі.

— Клапаціцца пра птушак ніколі не позна, — кажа Міхаіл.

З дзяцінства ён змайстраваў і развесіў навокал дзясяткі шпакоўняў, такіх падобных на вялікія пчаліныя калоды.

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

Лельчыцкі раён.

Прэзідэнт Беларусі даручыў Камітэту дзяржкантролю вывучыць сітуацыю з падтрымкай асабістых падсобных гаспадарак

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 16 красавіка прыняў з дакладам Старшыню Камітэта дзяржаўнага кантролю Зянона ЛОМАЦЯ.

Кіраўнік кантрольнага ведамства далажыў аб мерах, што прымаюцца па ўдасканальванні дзейнасці галоўнага кантрольнага ведамства і накіраваны на забеспячэнне эканамічнай бяспекі краіны, папярэджанне і выяўленне сістэмных парушэнняў заканадаўства і адмоўных тэндэнцый у эканамічнай сферы. Размова ішла таксама аб сітуацыі з асабістымі падсобнымі гаспадаркамі.

(Падрабязнасці ў наступным нумары.)

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

РАСІЯ ПАГАДЗІЛАСЯ ЗРАБІЦЬ СКІДКУ НА ГАЗ УКРАІНЕ

Урады Расіі і Украіны ўхвалілі новыя дамоўленасці па газе на аснове прапаноў прэзідэнта Украіны Віктара Януковіча. Фактычна гэта азначае, што Расія пагадзілася даць Украіне скідку на газ у 2010 годзе.

Гэта азначае, што цана на паліва павінна знізіцца з цяперашніх 330 долараў за тысячу кубаметраў да 200—245 долараў за той жа аб'ём. Узамен скідкі на газ Украіна можа прапанаваць Расіі супрацоўніцтва ў атамнай сферы, у прыватнасці, па будаўніцтве трэцяга і чацвёртага блокаў Хмяльніцкай АЭС. РФ можа ініцыяваць узвядзенне ва Украіне завода па вытворчасці ядзернага паліва. Уладзімір Пуцін ужо называў прапановы Украіны «цікавымі».

ПАХ ШАШЛЫКУ ПЕРАШКОДЗІЎ ПРАЦЫ МІНІСТЭРСТВА АБАРОНЫ ЭСТОНІІ

Працаваць належным чынам супрацоўнікам эстонскага міністэрства абароны ў апошнія некалькі дзён стаў перашкаджаць моцны пах шашлыку.

Пах распаўсюджваецца па ўсім будынку. Асабліва моцна ён адчуваецца ў кабінетах, якія выходзяць на вуліцу Сакала. «Некаторыя не могуць супрацьстаяць і ідуць есці», — заявіў прадстаўнік міністэрства. Журналісты высветлілі, што пах смажанага мяса распаўсюджваецца з рэстарана Lido, які знаходзіцца праз дарогу. Нядаўна там якраз пачаўся «сезон барбекю». Дырэктар па маркетынгу адзначыла, што колькасць кліентаў з міністэрства абароны апошнім часам павялічылася.

АВІЯПЕРАВОЗКІ «НАКРЫЛА» ПОПЕЛАМ. ВУЛКАНІЧНЫМ

Як ужо паведамлялася, на працягу апошніх некалькіх дзён праца многіх еўрапейскіх аэрапортаў была паралізаваная з-за вывяржэння вулкана на поўдні Ісландыі, які падняў над Паўночнай Еўропай велізарныя воблакі вулканічнага попелу. Лётаць у такіх умовах надзвычай небяспечна, таму службы бяспекі палётаў шэрагу еўрапейскіх краін цалкам або часткова закрылі паветраныя прасторы сваіх краін. Па інфармацыі за мінулыя дні, адменена ці затрымана больш за 6 тысяч рэйсаў. А між тым, па звестках па стане на мінулыя суткі, частка воблака ўжо ўвайшла ў паветраную прастору Расіі...

16 красавіка Нацыянальная авіякампанія «Белавія» адмяніла рэйсы Мінск — Лондан — Мінск, Мінск — Берлін — Мінск і Мінск — Рыга — Мінск якраз у сувязі з неспрыяльнымі ўмовамі ў Вялікабрытаніі, Германіі і Латвіі. Прычым па рэйсе на Лондан, які павінен быў адбыцца раніцай, рашэнне прымалася напярэдадні ўначы. Напярадзе выхадныя дні, у людзей, магчыма, былі запланаваныя пералёты. Якія для пасажыраў папярэднія прагнозы адносна магчымай адмены яшчэ нейкіх рэйсаў? Гэтае пытанне «Звязда» адрасавала намесніку генеральнага дырэктара авіякампаніі «Белавія» Ігару Чаргінцу.

Паводле слоў суразмоўцы, на момант нашага звароту ніякіх дакладных прагнозаў не толькі на некалькі дзён наперад, але нават на

бліжэйшы час не было. Ігар Міхалаевіч зазначыў, што ўсё будзе залежаць ад аператыўнай абстаноўкі, выходзячы з якой і будзе прымацца канкрэтнае рашэнне. Пасля такога кроку інфармацыя будзе аператыўна даносіцца да пасажыраў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

19 красавіка 2010 г. у 15.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4) прадоўжыць работу чацвёртая сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання.

ЗАКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ СТРАХОВОЕ ОБЩЕСТВО БЕЛНЕФТЕСТРАХ

УНП 101143603

ГОДОВОЙ БАЛАНС ЗАКРЫТОГО АКЦИОНЕРНОГО СТРАХОВОГО ОБЩЕСТВА «БЕЛНЕФТЕСТРАХ» ЗА 2009 ГОД

220004, г. Минск, пр. Победителей, 23, кор. 1, тел. (017) 226 78 88

млн руб.

АКТИВ		ПАССИВ	
1	2	3	4
Основные средства	8 938,8	Источники собственных средств – всего	13 055,1
Нематериальные активы	89,1	в том числе: уставный фонд	7 641,6
Финансовые вложения – всего	513,3	резервный фонд	282,4
в том числе: инвестиции в дочерние общества	-	добавочный фонд	3 511,2
инвестиции в другие организации	513,3	фонд накопления	-
облигации и другие долговые обязательства	-	фонд потребления	-
прочие финансовые вложения	-	целевое финансирование	9,0
Доля перестраховщиков в страховых резервах	1 333,0	нераспределенная прибыль прошлых лет	26,9
Дебиторы – всего	4 696,2	нераспределенная прибыль отчетного года	1 584,0
В том числе: дебиторская задолженность по операциям страхования, сострахования и перестрахования	1 161,7	Страховые резервы и фонды – всего	22 528,6
депо премий по рискам, принятым в перестрахование	-	в том числе: страховые резервы	22 104,8
дебиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования)	3 534,5	фонд предупредительных (превентивных) мероприятий	418,9
Прочие активы – всего	25 738,6	гарантийные фонды	4,9
В том числе: незавершенное строительство	142,1	Кредиторы – всего	2 852,4
материальные ценности и затраты	1 945,5	В том числе: кредиторская задолженность по операциям страхования, сострахования	143,4
денежные средства	23 651,0	кредиторская задолженность по операциям перестрахования	726,0
собственные акции (доли)	-	депо премий по рискам, переданным в перестрахование	-
прочие активы	-	заемные средства	911,0
Непокрытые убытки прошлых лет	-	кредиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования)	1 072,0
Непокрытые убытки отчетного года	-	Прочие пассивы	2 872,9
БАЛАНС	41 309,0	БАЛАНС	41 309,0

ОТЧЕТ О ФИНАНСОВЫХ РЕЗУЛЬТАТАХ ЗАСО «БЕЛНЕФТЕСТРАХ» ЗА 2009 ГОД

млн руб.

Наименование показателя	Код строки	За отчетный период
1	2	3
I. Страхование жизни Страховые взносы (премии)	010	-
Страховые выплаты	020	-
Изменение резерва по страхованию жизни (+ или -)	030	-
Отчисления в гарантийный фонд	040	-
Расходы на ведение дела	041	-
Результат от операций по страхованию жизни (+ или -)	050	-
II. Страхование иное, чем страхование жизни Страховые взносы (премии) нетто – перестрахование	064	49 923,9
Изменение резерва незаработанной премии – нетто-перестрахование (+ или -)	067	- 4 900,3
Оплаченные убытки (страховые выплаты) – нетто-перестрахование	082	23 544,9
Изменение резервов убытков – нетто-перестрахование (+ или -)	092	- 1 545,7
Изменение других технических резервов (+ или -)	100	-
Изменение иных страховых резервов (+ или -)	105	-
Отчисления в фонд предупредительных (превентивных) мероприятий и гарантийные фонды	110	2 845,8
Расходы на ведение дела	120	16 638,2
Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, переданным в перестрахование	121	250,7
Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, принятым в перестрахование	122	265,5
Результат от операций по видам страхования иным, чем страхование жизни (+ или -)	130	434,2
III. Прочие доходы и расходы, не отнесенные в разделы I и II Операционные доходы	140	2 271,8
Операционные расходы	145	73,5
Внереализационные доходы	150	4 128,3
Внереализационные расходы	155	1 692,4
Финансовый результат	157	5 068,4
Использовано прибыли	158	3 484,4
Нераспределенная прибыль (убытки) отчетного периода (+ или -)	170	1 584,0

Достоверность баланса и отчета о финансовых результатах Закрытого акционерного страхового общества «Белнефтестрах» подтверждены ОДО «Промаудит» (специальное разрешение (лицензия) на право осуществления аудиторской деятельности № 02200/0495307 от 19.12.2008 г. выдано Министерством финансов Республики Беларусь со сроком действия до 02.02.2014 г.)

ЗАКЛЮЧЕНИЕ
общества с дополнительной ответственностью «Промаудит»
о бухгалтерской (финансовой отчетности) закрытого акционерного страхового общества «Белнефтестрах»

По нашему мнению, бухгалтерская (финансовая отчетность) ЗАСО «Белнефтестрах», сформированная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь, отражает финансовое положение ЗАСО «Белнефтестрах» на 1 января 2010 года и результаты финансово-хозяйственной деятельности за 2009 год. При этом совершенные ЗАСО «Белнефтестрах» финансовые (хозяйственные) операции соответствуют законодательству.

25.02.2010 г. ОДО «Промаудит»

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 17.04.2010 г. (для б/н разлікаў)

▲1 долар ЗША	2 963,00	1 чэшская крона	159,34
▼1 еўра	4 010,12	1 польскі злоты	1 035,89
1 латвійскі лат	5 663,77	▼1 расійскі рубель	102,06
1 літоўскі літ	1 161,64	1 украінская грыўня	374,00

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

USD	29,0325
10 UAH	36,4501
1000 BYR	9,8215
EUR	39,2723

Агенцтва Уладзіміра Грачова

«Прамая лінія» Старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь Зянона Ломаця

19 красавіка 2010 г. з 13.00 да 16.00 адбудзецца «прамая лінія» Старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Зянона Кузьміча Ломаця з жыхарамі г. Мінска і Мінскай вобласці.

Падчас «прамой лініі» можна задаць пытанні пра найбольш надзённыя праблемы рэгіёна, выказацца пра працу службовых асобаў, дзейнасць кантралюючых і наглядных органаў ва ўмовах дзеяння Указа № 510 кіраўніка дзяржавы, які рэгламентуе ажыццяўленне кантролю.

Зянон Ломаць чакае ад вас прапановіц, накіраваныя на выяўленне адмоўных тэндэнцый у эканоміцы, пошук рэзерваў для сацыяльна-эканамічнага развіцця Мінскай вобласці і краіны ў цэлым, павышэнне ўзроўню жыцця грамадзян. Пад пільнай увагай Камітэта дзяржкантролю — дзейнасць прадпрыемстваў і арганізацый па разгрузцы складскіх запасаў і рэалізацыі айчыннай прадукцыі. Вы можаце выказаць свае ідэі наконт прасоўвання беларускіх тавараў у краіне і за мяжой.

Сёння Камітэт дзяржкантролю адказвае за эканамічную бяспеку краіны. Для галоўнага кантрольнага ведамства аднолькава важныя як інтарэсы дзяржавы, так і праблемы простага чалавека. Таму кожны факт парушэнняў стане прадметам стараннага разбору, а слушныя прапановы паслужаць асновай для аналізу.

Звярнуцца да Зянона Кузьміча Ломаця і задаць сваё пытанне падчас «прамой лініі» можна па тэлефоне 8 017 210 01 65.

АД ЧАЛАВЕКА ДА ЧАЛАВЕКА

У Беларусі з Ізраілем трывалыя сувязі, утвораныя найперш лёсам людзей

Ад Беларусі да Ізраіля і назад — шмат мастоў, масткоў і сцяжынак, пракладзеных людзьмі, што звязалі свой лёс з абедзвюма краінамі. Мноства выхадцаў адсюль пасталелі і адбыліся як прафесіяналы там... Ды што там, у многіх з нас сябры ці сваякі ў Ізраілі, а калі весці гаворку пра турызм, хутчэй трэба казаць пра паездкі ў госці або настальгічныя вандроўкі. І напярэдадні нацыянальнага свята сваю сустрэчу з журналістамі пасол Эдуард ШАПІРА правёў пад знакам «народнай дыпламатыі» — ад чалавека да чалавека... Не столькі канцэнтраваўся на эканамічных ды палітычных складніках узаемадзеяння (хоць і там ёсць чым пахваліцца — адбываюцца ўзаемныя візіты на высокім узроўні, ізраільскія бізнэсмены лічаць удалымі для капіталаўкладання тутэйшую сельскую гаспадарку і сферу высокіх тэхналогій, буйныя праекты ў гэтых галінах ужо развіваюцца, а інтарэс да сектара аховы здароўя толькі-толькі праяўляецца і ёсць спадзяванне, што дагавор аб супрацоўніцтве ў гэтай галіне будзе падпісаны сёлета), колькі на крос-культурных стасунках.

Выстава «Гонар нацыі», прысвечаная слынным дзеячам Ізраіля родам з Беларусі, пройдзе ў буйных гарадах нашай краіны. У 62-ю гадавіну незалежнасці Ізраіля, 20 красавіка, беларуская публіка ўпершыню пабачыць незвычайны ўзор сучаснага балета — «Рустэр», пастаўлены на замову Цэнтра сцэнічнага мастацтва Сюзан Далаль (які сёлета ўганараваны вышэйшай дзяржаўнай прэміяй Ізраіля за асаблівыя заслугі ў развіцці танцавальнага мастацтва). А ў рамках мерапрыемстваў, прысвечаных 65-годдзю Вялікай Перамогі, група праведнікаў народаў свету (неяўрэі, якія выратоўвалі яўрэяў, рызыкуючы ўласным жыццём) з Беларусі пабывае ў Ізраілі.

— Мы ў неаплатным даўгу перад гэтым пакаленнем, і гэты візіт — сімвал нашай удзячнасці, — адзначыў дыпламат.

Увогуле ж у справе ўзаемных паездак хіба не самая важная акалічнасць — візавая. Пакуль сярод нашых суседзяў толькі расіяне могуць наведваць Ізраіль без дазвольнай адзнакі ў пашпарце. Калі пачыналіся перамовы з расійскім бокам, Ізраіль «нацэльваўся» на аналагічныя дамоўленасці з усімі краінамі СНД. Так што і беларускае пытанне — на разглядзе. На думку пасла, праблемы тут няма — толькі тэматыка для абмеркавання. Натуральна, будзе абмяркоўвацца яна і падчас візіту ў Ізраіль міністра спорту і турызму Алега Качана (паездка мае адбыцца 25 красавіка). Дыпламат акцэнтаваў, што «намеры ізраільскага боку ў гэтай сферы пазітыўныя», і беларускі, паводле яго выразу, «выразна выказвае меркаванне аб жаданні падпісаць адпаведную дамову».

— Не магу абяцаць і гаварыць пра канкрэтныя даты толькі з-за асцярожнасці, — падкрэсліў кіраўнік дыпмісіі.

Пакуль жа спецыяльны дазвол патрэбны, пасольства робіць усё, каб працэдура афармлення дакументаў была простай.

— Зусім няцяжка атрымаць візу ў Ізраіль, гэта займае адзін дзень, беларускія грамадзяне могуць звяртацца як напрамую, так і праз турагенцтвы. Колькасць адмоў мінімальная, — запэўнівае пасол, — менш за адзін адсотак. Сардэчна запрашаем!

Аднак хочацца ўсё ж спадзявацца, што хутка для паездкі ў Ізраіль дастаткова будзе... проста купіць білет! Балазе, ужо ўлетку (пасля паўтарагадовага перапынку) узнаўляюцца прамыя рэйсы ў Тэль-Авіў ізраільскай авіякампаніі. З чацвёртага чэрвеня перавозіць пасажыраў з Мінска пачне Sun D'Or, даччыная фірма нацыянальнага авіяперавозчыка Ізраіля EL AL.

— Мы пачынаем з аднаго палёту ў тыдзень, але спадзяёмся, што з цягам часу іх колькасць павялічыцца, — кажа Э. Шапіра.

Поруч з трыма рэйсамі Белавіі гэта дае беларусам чатыры варыянты вылету ў Тэль-Авіў штотыдня. Так што сувязі між людзьмі мацуюцца і сувязямі транспартнымі. Узаемадзеянне і на міжнароднай арэне. Так, ізраільскі бок разлічвае на падтрымку Беларусі ва ўрэгуляванні блізкаўсходняга канфлікту.

— Беларусь як член сусветнай супольнасці можа адыгрываць і адыгрывае пазітыўную ролю ў падтрымцы імкненняў Ізраіля ў дасягненні міру, — лічыць дыпламат.

Ён усведамляе, што пры гэтым, «натуральна, Беларусь мае свае прыярытэты, свае асаблівасці знешнепалітычнай пазіцыі, і гэта абсалютна нармальна». Аднак, на яго думку, «садзейнічаць урэгуляванню блізкаўсходняга канфлікту павінна кожная дзяржава». Выкарыстоўваць свой уплыў, сваю вагу, на думку дыпламата, можа і Беларусь, улічваючы яе неблагія сувязі ў рэгіёне.

Паводле меркавання пасла, менавіта Ізраіль павінен іграць вядучую ролю ў эканамічным развіцці Блізкаўсходняга рэгіёна. Канфлікт у рэгіёне, на яго думку, не будзе вычарпаны, пакуль не з'явіцца ўсведамлення, што «няма іншага шляху, апроч наладжвання канструктыўных адносінаў з Дзяржавай Ізраіль». Егіпет і Іарданія толькі выйгралі ад перамір'я, падкрэслівае дыпламат.

Ала МАЧАЛАВА.

Леанід КОЗІК, старшыня ФПБ:

«ФЕДЭРАЦЫЯ ПРАФСАЮЗАЎ НАВЕДАЕ КОЖНАГА АДЗІНОКАГА ВЕТЭРАНА»

Дэлегацыя прафсаюзных лідараў Беларусі падчас візіту ў Нараўлянскі раён наведала адзінокіх ветэранаў. Сёлета ФПБ аб'явіла акцыю «Адзінокім ветэранам наш клопат». Прафсаюзныя лідары напярэдадні Дня Перамогі наведаюць кожнага з пяці тысяч адзінокіх ветэранаў Беларусі.

Фота Валерыя КАРТУЛЯ.

— Праходзьце-праходзьце, — пры поўным парадзе на інвалідным крэсле сустракае дэлегацыю 87-гадовы ветэран **Мікалай ЮДЭНКА.** — Я ўжо вас чакаю.

Мікалай Юдэнка жыве ў двухпакаёвай кватэры на першым паверсе. Просты ложак, вышываныя сурвэткі на шафе і фотаздымкі родных на сцяне. У кватэрцы — сціплая абстаноўка, але чыста і акуратна. Па гаспадарцы ветэрану дапамагае сацыяльны работнік Ірына. Яна прыносіць прадукты, прыбірае, мые і гатуе ежу.

З родных у Мікалая Анікеевіча засталася толькі ўнучка, якая цяпер жыве ў Мінску. Літаральна адзін за адным памерлі сын, пасля ад анкалагічнага захворвання жонка, потым дачка...

Пасля вяртання з вайны Мікалай Юдэнка жыў у невялічкай вёсцы каля Нароўлі. Пасля 1986 года яго з многімі іншымі перасялілі ў горад. Сам Мікалай Анікеевіч быў адселены з сям'ёй з вёскі Дзёрнавічы ў 1986 годзе.

— Дарма мяне адсялілі, — кажа ветэран. — Перад аварыяй на ЧАЭС было вельмі добрае жыццё. Радыяцыя? А чаго яе баяцца, той радыяцыі.

Патрэбы ў дзядулі — невялікі пандус паставіць ды пагнутае кола ў крэсле выправіць.

— А яшчэ ўрач не выпісала лекі. Мне прапісаныя былі дарагія. А яна сказала: «Шкада». І не выпісала. Маўляў, шмат грошаў каштуюць, — плача ветэран, — дык я купіў такія ж лекі за дваццаць тысяч, а яна не выпісала.

— Такое адбываецца досыць часта, — кажа Леанід Козік, — не вы першы скардзіцеся. Я пра гэта абавязкова паведамлю міністру аховы здароўя.

На 9 мая Мікалай Анікеевіч кажа, што пойдзе гуляць у парк. Разам з астатнімі ветэранамі (а іх у раёне засталося 28 чалавек) яны ўспомняць франтавыя гады, вып'юць па чарцы..

— Чакаю свята, — плача Мікалай Анікеевіч. — Жывецца зараз добра — ціха і спакойна.

Мікалаю Юдэнка федэрацыя прафсаюзаў уручыла мікрахвалевую печ.

Уладзімір Іванавіч МАСЛАК сустракае нас разам са сваёй жонкай Кацярынай Іванаўнай у вёсцы Галоўчыцкая Буда. На падворку, зрываючыся з ланцуга, брэша сабака.

— Ён ды куры — уся наша гаспадарка, — уздыхае Кацярына Іванаўна.

Уладзімір Іванавіч на фронт адправіўся, па словах Кацярыны Іванаўны, малалеткам. З-за гэтага пасля вайны яму давялося служыць яшчэ тры гады.

— Ваяваў я на Паўночна-заходнім фронце ў 1942 годзе, а таксама на Арлоўска-Курскай дузе, пасля ў Чэхаславакіі, потым у Венгрыі, а пасля ў Турцыі. Там і Перамогу сустрэлі , — успамінае Уладзімір Іванавіч. — А служыў у артылерыі ўсю вайну. Намі Жукаў камандаваў. Ён прылятаў на кукурузніку да шашы. Сядзе, указанні аддасць — і паехаў. Любілі яго моцна салдаты...

У 1948-м Уладзімір прыйшоў з арміі і ажаніўся з Кацярынай.

— Як пазнаёміліся? Бацькі сказалі — добры хлопец. Дык яны мяне сілком аддалі ў шаснаццаць гадоў. Як гэта ён са мной быў ды не прагнаў? Я ж нічога не ўмела ды не ведала. Дык бацькі добра выбралі, бачыце. Усё жыццё мы адзін аднаго любілі і паважалі, — распавядае бабуля. — Каб не Валодзя, дык я галадала б сёння, пенсія ў мяне, як былой працаўніцы калгаса, 200 тысяч. А ў яго большая. Ды абавязкова напішыце, што мы 62 гады пражылі ў любові ды клопаце. Ніякіх спрэчак, ніякіх сварак. Так ён мяне любіў. Я яго ніколі п'янага не бачыла. Пасля працы ён ішоў адразу дадому да дзяцей.

Прадукты да Маслакоў прывозіць сацыяльны работнік, ды дачка-пенсіянерка з Мазыра прыязджае. А ў горад пераязджаць старыя не хочуць.

— Ды ўжо б тут дажыць, — кажуць у адзін голас яны. — Хату ж сваімі рукамі пабудавалі.

Федэрацыя прафсаюзаў падаравала Уладзіміру ды Кацярыне Маслакам новы тэлевізар, замест старога чорна-белага.

— Акцыя прымеркаваная да 65-годдзя Перамогі. Гэта маштабная рэспубліканская акцыя. 5000 ветэранаў у Беларусі пражывае адзінока. Мы вырашылі, што сёлета да іх патрэбна зайсці і спытаць: ну як ты тут жывеш адзін, чым табе дапамагчы? Дапамога гэтая няцяжкая для нашых прафсаюзаў. Я вас запэўніваю, што Федэрацыя прафсаюзаў наведае кожнага ветэрана, — кажа Леанід Козік.

Настасся ЗАНЬКО.

Абзац

◢ У Пружанскай райбальніцы 15 красавіка ўвечары памёр другі пілот мотадэльтаплана, які пацярпеў крушэнне. Гэта жыхар Кобрына 1959 года нараджэння. Як паведамлялася, аварыя мотадэльтаплана, на борце якога знаходзіліся два пілоты, адбылася 15 красавіка прыкладна за 3 км ад Пружан пры правядзенні вучэбна-трэніровачных палётаў. Адзін з пілотаў памёр адразу, другога даставілі ў бальніцу.

◢ **Мінамётная міна часоў Вялікай Айчыннай выяўлена пры перакопванні клумбы на тэрыторыі дзіцячага садка ў вёсцы Хальч Веткаўскага раёна. У вёску выклікалі міліцыю і выратавальнікаў, тэрыторыю ачапілі. 22 выхаванцаў і выхавальнікаў перавезлі ў адзін з дзіцячых садкоў райцэнтра. Спецыялісты вывезлі міну і знішчылі. Тэрыторыя праверваная дадаткова — іншых падобных знаходак не выяўлена.**

Поўны абзац

◢ 64-гадовы жыхар ПАР памёр у чарзе за білетамі на матчы чэмпіянату свету па футболе, які пройдзе ў гэтай краіне з 11 чэрвеня па 11 ліпеня. Урачы лічаць, што прычынай смерці стаў сардэчны прыступ. У чарзе за білетамі балельшчык, які памёр, быў 565-м. Свабодны продаж білетаў на матчы ЧС-2010 пачаўся ў ПАР у чацвер, 15 красавіка. Аднак балельшчыкі пачалі займаць чаргу яшчэ ў сераду. Усяго ў рознічны продаж паступіла 500 тысяч білетаў.

◢ **У штаце Сент-Луіс мужчыны, якія носяць вусы, для таго, каб даглядаць іх, просяць ва ўладаў падатковых ільготаў. Заяўнікі адзначаюць, што ім патрабуецца $250 падатковага стымулу для падтрымання стылю «вусатага амерыканца». Мужчыны заявілі, што гэтыя грошы пойдуць не толькі на нажніцы, але і на воск, расчоскі і люстэркі.**

◢ Мэрам невялікага гарадка Трэйсі-Сіці ў амерыканскім штаце Тэнэсі стаў нябожчык. Справа ў тым, што 55-гадовы Карл Гіры, які памёр каля месяца таму ад сардэчнага прыступу, незадоўга да смерці зарэгістраваўся ў якасці кандыдата ў мэры горада. На выбарах ён апярэдзіў сваю суперніцу — дзейнага мэра Барбару Брок. Самі жыхары тлумачаць свой выбар тым, што мёртвы кандыдат лепшы за цяперашняга кіраўніка гарадка. Яны аддалі голас за Гіры ў знак пратэсту супраць палітыкі Брок. «Магчыма, мы паступілі неразумна, але мы проста хацелі падкрэсліць, што хочам бачыць на пасадзе мэра іншага чалавека», — сцвярджаюць гараджане. У падтрымку Гіры выказаліся 285 чалавек, а Брок падтрымалі 85.

◢ **Пастаялец аднаго з матэляў у Паўднёвай Караліне (ЗША) ударыў свайго суседа змяёй па твары. Перапалка паміж мужчынамі пачалася з-за таго, што адзін з іх слухаў вельмі гучную музыку. Пастаялец, незадаволены гэтым, зрабіў суседу заўвагу, пасля чаго пачалася спрэчка. Неўзабаве амаратар музыкі знік, але вярнуўся і прынёс з сабой паўтарамятровага пітона. Ён зайшоў у пакой суседа і ўдарыў таго змяёй па твары. Ахвяра кінулася ў паліцыю, крыўдзіцеля забралі ва ўчастак. Пітона перадалі родзічам мужчыны.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Погляд

ЦІ ТРЭБА ПАВЫШАЦЬ УЗРОСТ ВЫХАДУ НА ПЕНСІЮ?

ПРА некаторыя аспекты і асаблівасці гэтай злабадзённай праблемы наш карэспандэнт гутарыць з вядомым беларускім эканамістам, членам Грамадска-кансультацыйнага савета пры Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Л.Ф. ЗАІКАМ.

— Леанід Фёдаравіч, сёння людзі сярэдняга і сталага ўзросту актыўна абмяркоўваюць вераногнасць павышэння тэрміну выхаду на пенсію. Якія толькі не даводзіцца чуць аргументы за і супраць. І цікавая складваецца карціна: большасць удзельнікаў гэтай дыскусіі з цяжкасцю, але пагаджаюцца, што пазбегнуць гэтай меры не атрымаецца. І амаль усе ўспамінаюць, што на Захадзе, у заможных краінах больш высокая ўзроставая планка выхаду на пенсію.

— Давайце спачатку паглядзім, у якіх умовах і пры якіх абставінах стваралася наша пенсійная сістэма. Яна канчаткова сфарміравалася ў канцы 50-х гадоў мінулага стагоддзя. Тады пасля цяжкіх выпрабаванняў ваеннага і пасляваеннага ліхалецця лічылася, што жанчына ўжо не здольная паўнацэнна працаваць у 55 гадоў, а мужчына — у 60 гадоў. І гэта быў аб'ектыўны прававерны падыход. Бо сярэдняя працягласць жыцця мужчын не перавышала 60 гадоў. Вельмі шмат іх загінула на вайне, многія былі знявечаныя, перанеслі страшэнныя стрэсы. Доля насельніцтва ўзростам за 60 складала амаль 10%. Зразумела, дзяржава тады магла забяспечыць сваіх звычайных (не персанальных) пенсіянераў сціплай пенсіяй. Ды і людзі былі не вельмі патрабавальнымі да ўмоў жыцця, выбару прадуктаў харчавання, адзення. Выжылі, гэта галоўнае.

І не забывайце, што ў 30-х гадах, яшчэ нават перад вайной пенсію атрымлівалі ў асноўным рабочыя, служачыя, інтэлігенцыя, а вяскоўцы, якія складалі пераважную большасць насельніцтва, былі пазбаўленыя гэтых сацыяльных выплат. І толькі пры Хрушчове сталым калгаснікам пачалі нешта плаціць на старасць, літаральна драбязу.

— І чаму так ставіліся да калгаснікаў?

— А таму, што калгаснае сялянства ўяўляла сабой недзяржаўны кааператыўны сектар, прадстаўнікі якога, на погляд тагачаснай улады, маглі паклапаціцца самі пра сябе ў сталым узросце. І толькі ў 60-х гадах былі прыняты законы, якія ахоплівалі пенсійным забеспячэннем усе пласты насельніцтва.

— Па прагнозах Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, да 2025 года кожны шосты жыхар планеты дасягне 60-гадовай мяжы. З гэтай нагоды часта гавораць, што пенсійныя сістэмы большасці дзяржаў чакае глыбокі крызіс. Нас таксама?

— Я бы так не палохаў людзей, незалежна ад іх узросту і ўзроўню адукацыі. Так, у развітых краінах сярэдні ўзрост выхаду на пенсію — 65 гадоў, і там дзе-нідзе рыхтуюцца да яго павышэння. У некаторых краінах ужо тэрмін і 65 і 67 гадоў. Узнікае натуральнае пытанне: а ці не пайсці нам гэтым шляхам? Можна, але б я не раіў вось так адразу бегчы за цывілізаваным светам.

— Цікава, чаму?

— У кожнай краіны ёсць свае нацыянальныя традыцыі і асаблівасці яе развіцця. У Еўрасаюзе дагэтуль няма адзінай сістэмы пенсійнага забеспячэння. Пакуль яно знаходзіцца, у асноўным, у кампетэнцыі кожнай з краін—членаў ЕС. У адрозненне ад нас працягласць жыцця ў Заходняй Еўропе, ЗША, Японіі і шэрагу іншых развітых краін вышэй, чым у былых постсавецкіх рэспубліках. Даўжэй за ўсіх жывуць у Японіі: жанчыны — больш за 84 гады, мужчыны — 77,4 года. Працаваць усе японцы павінны да 70 гадоў. У ЗША сярэдняя працягласць жыцця 76,7 года, а пенсійны ўзрост для грамадзян абодвух палоў надыходзіць у 65 гадоў.

У Еўропе жывуць у сярэднім 75,5 года. У Італіі мужчыны выходзяць на пенсію ў 65 гадоў, жанчыны — у 60. У Францыі нядаўна павысілі пенсійны ўзрост з 60 да 62,5 года, сярэдняя працягласць жыцця складае 74,7 года. У Вялікабрытаніі жанчыны жывуць прыкладна 81 год, а мужчыны — 75 гадоў, пры гэтым пенсійны ўзрост для мужчын надыходзіць у 65 гадоў, для жанчын — у 60.

— Аднак у апошнія некалькі гадоў назіраюцца зрухі ў бок павышэння пенсійнага ўзросту ў нашых суседзяў і былых паплечнікаў па сацлагеру.

— У большасці краін былога сацыялістычнага лагера пенсійны ўзрост для іх грамадзян быў прыкладна такі, як і ў Беларусі, Расіі, Украіне: для мужчын — 60 гадоў, жанчыны — у 55—56. Але многія дзяржавы, асабліва тыя, якія сталі членамі Еўрасаюза, узнялі пенсійную ўзроставую планку. Напрыклад, у Венгрыі, Чэхіі, Літве. У краінах СНД таксама думаюць пра павышэнне пенсійнага ўзросту. У Казахстане ён ужо ўзняты для жанчын да 58 гадоў, мужчын — да 63.

> **Перавага накапляльнай сістэмы ў тым, што пасля смерці чалавека назапашаныя ім на пенсію сродкі перадаюцца ў спадчыну нашчадкам.**

Менавіта рост працягласці жыцця, дабрабыту, паляпшэнне медыцынскага абслугоўвання падштурхоўвае ўрады і парламенты многіх дзяржаў пераглядаць пенсійнае заканадаўства, асабліва што датычыць павелічэння ўзросту выхаду на пенсію. Аднак там, у заможных і адносна заможных краінах, па маіх назіраннях, пенсіі ўжо не такая надзвычай актуальная праблема. У свеце ўжо прыйшлі да высновы: каб у сталым узросце жыць годна, трэба мець дзве-тры фінансавыя крыніцы існавання. Сама працоўная пенсія, даходы ад акцый, аблігацый, здачы ў арэнду нерухомасці: кватэры, дачы, загараднага дома. І яшчэ выкарыстанне спецыяльных сістэм страхавання. Я лічу, што нашым будучым пенсіянерам таксама варта падумаць пра дадатковыя крыніцы даходаў.

— Ведаеце, ёсць такая, калі не памыляюся, тэлеперадача «Лёгка сказаць». А як на практыцы рэалізаваць рэформу нашай пенсійнай сістэмы?

— У нас кожны, хто атрымлівае афіцыйную зарплату, а не «шэрую» ў канверце, рэгулярна робіць унёскі ў пенсійны фонд. З яго сродкаў потым фарміруюцца пенсійныя выплаты. А ёсць і іншая пенсійная сістэма — накапляльная. Яе, дарэчы, прытрымліваюцца ў многіх цывілізаваных краінах свету. Сутнасць гэтай сістэмы ў наступным. На працягу працоўнага жыцця чалавек адкладвае пэўную частку свайго заробку на спецыяльны рахунак у пенсійным ці інвестыцыйным фондзе, камерцыйным банку. Перавага накапляльнай сістэмы ў тым, што пасля смерці чалавека назапашаныя ім сродкі на пенсію перадаюцца ў спадчыну нашчадкам. А ў нас пасля адыходу бацькоў у лепшы свет — нічога. Думаю, гэта не зусім справядліва. Правільна было б пакідаць грошы ў распараджэнні сям'і.

— А якая будзе роля дзяржавы ў выпадку пераходу да накапляльнай сістэмы?

— Дзяржаўныя органы могуць зрабіць такое пенсійнае забеспячэнне абавязковым, сачыць за тым, каб грошы пенсіянераў былі пад гарантыяй, каб на іх не квапіліся прайдзісветы і махляры, каб не «з'ела» інфляцыя.

— А калі ўявіць, што нехта жыве не па правілах айчыннага пенсійнага заканадаўства. Яму можна будзе выжыць, калі прыйдзе старасць?

— Можна, але для гэтага асобнаму грамадзяніну спачатку трэба набіраць 10 тысяч долараў ЗША, пераевесці іх у беларускія рублі і пакласці ўсю суму ў Беларусбанк на дэпазіт пад 21 % гадавых, і тады кожны месяц атрымліваць некалькі сотняў тысяч рублёў, так бы мовіць, уласна прызначанай самому сабе пенсіі. Вядома, можна пакласці на дэпазіт 15 ці 20 тысяч долараў, і тым самым павысіць сваю пенсію. І пасля смерці гэтага грамадзяніна штомесячныя выплаты працэнтаў па дэпазіце будуць атрымліваць яго дачка ці сын, а можа і ўнукі. Карацей, блізкія людзі. Ну як вам падабаецца гэта?

— Цікавая форма пенсійнага забеспячэння, асабліва што дастычыць спадчыны для ўнукаў. Упэўнены, ім гэта вельмі спадабаецца. Разумею, вы гэты прыклад прывялі як ілюстрацыю работы пенсійнай сістэмы па накапляльным прынцыпе. Так?

— Так. Галоўнае ў ёй тое, што выгада тут не для аднаго пакалення. Таму я і мае многія калегі-эканамісты прапануюваем паступова перайсці да накапляльнай пенсійнай сістэмы. За ёй — будучыня. Бо чалавек пачне загадзя фарміраваць памер сваёй пенсіі, якая можа быць удвая, а пры жаданні і ўтрая вышэйшай за цяперашнюю стандартную пенсію. І тады яму не прыйдзецца шукаць дадатковы заробак. Ёсць сэнс, пры ўмове пераходу на накапляльную сістэму, стварыць некалькі буйных пенсійных фондаў. Скажам, сем рэгіянальных фондаў у кожнай вобласці і сталіцы.

— Як мне здаецца, накапляльная сістэма будзе выгаднай пры ўмове, што чалавек на працягу доўгага перыяду меў высокааплатную работу, збіраў сабе на старасць, без напружання выдаткоўваў пэўную суму ў пенсійны фонд. А калі ў жыцці не ўсё гладка: працяглая хвароба, беспрацоўе, празмерна зацягнутыя пошукі сябе ў гэтым жыцці. Ці мала якія могуць узнікнуць акалічнасці, людзі і бамжамі становяцца. Як тут назапашваць пенсію?

— Вы ведаеце, як працуе пенсійная сістэма ў Швецыі? Там для ўсіх, незалежна ад лёсу і былых заробкаў ці ўвогуле іх адсутнасці, для рознага роду няўдачнікаў і, чаго хаваць, шчырых лайдакоў, абібокаў, гультаёў, існуе пенсія — сацыяльная. Прыкладна ў памеры 400—500 долараў ЗША (вельмі сціплыя па шведскіх мерках грошы). Мінімальны пражытковы ўзровень. Але затое ён дазваляе чалавеку не галадаць, апранацца, мець нейкі дах над галавой і г. д. Гэтая народная пенсія выплачваецца кожнаму, хто дасягнуў пенсійнага ўзросту. Такая пенсія ёсць у Даніі, Нарвегіі і многіх іншых краінах.

— Але і ў нас ёсць сацыяльная пенсія...

— Сапраўды. На пачатак гэтага года сацыяльная пенсія складала 191600 рублёў. Вядома, цяжка жыць на гэткія грошы. Такую пенсію для пэўных катэгорый грамадзян можна павялічыць да 100-доларавага эквіваленту.

— Аднак існуе такі народны выраз «маладая пенсіянерка» ці «малады пенсіянер». Яго ўжываюць, калі хочуць падкрэсліць, што чалавек пенсійнага ўзросту яшчэ поўны сілаў і энергіі, можа і папрацаваць не адзін год. Ці не само жыццё падказвае павысіць узрост выхаду на пенсію?

— Зразумела, ёсць у нас фізічна моцныя індывідуумы, якія здольныя эфектыўна працаваць пасля 55-60 гадоў. І такіх нямала. Але не на іх трэба раўняцца. Я не бачу асаблівага сэнсу павышаць узрост выхаду на пенсію. Прычын некалькі. У Беларусі існуе залішняя занятасць: беспрацоўных усяго менш 1% ад працаздольнага насельніцтва. А перад намі стаіць задача правесці рэструктурызацыю і мадэрнізацыю прадпрыемстваў, скараціць у межах эканамічнай мэтазгоднасці іх персанал. Няхай людзі ідуць на пенсію. Другі момант. Сталых людзей амаль заўсёды «выціскалі» і будуць «выціскаць» з пасад, таму што эканоміка патрабуе новых кадраў і новых падыходаў. Жорстка, але справядліва. Нельга дапускаць, каб моладзь заставалася без перспектыў кар'ернага росту, з маленькімі зарплатамі або наогул без працы. А краіне сёння востра патрэбны кадры новай кваліфікацыі, асабліва сярэдняга звяна. Непазбежнае ўзмацненне канкурэнцыі паміж маладымі і сталымі работнікамі можа прывесці да павелічэння перыяду пошуку працы маладымі людзьмі, якія ўпершыню апынуліся на рынку працы. А гэта можа справакаваць рост беспрацоўя сярод моладзі.

У склададанай сусветнай эканамічнай сітуацыі, можа, лепшым было б стымуляваць датэрміновы выхад на пенсію. Скажам, за 2 гады да наступлення пенсійнага ўзросту.

— Кажуць, што павышэнне пенсійнага ўзросту дазволіць скараціць лік пенсіянераў і зэканоміць значную частку сродкаў.

— На мой погляд, прыкметнага эканамічнага эфекту гэтая мера не прынясе. Таму сёння, як вы казалі, існуе досыць шмат аргументаў (дэмаграфічных, эканамічных, сацыяльных і г. д.) як на карысць павышэння пенсійнага ўзросту, так і супраць гэтага. Няма адзінства меркаванняў і аб тым, якім чынам яго павышаць. Можа, пачакаем з эксперыментамі

— Асобныя эксперты лічаць, што калі не пачаць паступова павялічваць тэрмін выхаду на пенсію, то праз 10—20 гадоў такая недальнабачнасць прывядзе да таго, што ўся сацыяльная сістэма паваліцца?

— Не думаю.

Гутарыў Леанід ЛАХМАНЕНКА.

ТРЫЦІКАЛЕ ВЫЙШЛА БОКАМ?..

Старшыня аднаго з сельскагаспадарчых вытворчых кааператываў Валожынскага раёна і галоўны бухгалтар гэтай гаспадаркі падазраюцца ў крадзяжы збожжа.

Як паведамілі ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама, у адносінах да кіраўніка гаспадаркі пракуратурай раёна па матэрыялах АБЭЗ РАУС і УБЭЗ КМ УУС заведзена крымінальная справа. Як мяркуецца, падазроны разам з галоўным бухгалтарам з кастрычніка 2007 года па жнівень мінулага выкралі 47 820 кілаграмаў трыцікале. Кошт «прыхватызаванага» — 9 мільёнаў 468 тысяч рублёў.

ЗНЁС $34 ТЫСЯЧЫ

Сталічныя праваахоўнікі расшукваюць невядомага зладзюжку, які «гасцяваў» у адной з кватэр дома па праспекце газеты «Правда» і выкраў адтуль $34 тысячы і сотавы тэлефон.

Вядома, што пацярпелай стала 32-гадовая мінчанка, якая пасля таго, як выявіла прапажу, звярнулася па дапамогу ў міліцыю. Яна заявіла пра тое, што невядомы, які з дзвюх гадзін дня 14 красавіка да гадзіны ночы 15-га знаходзіўся ў яе кватэры, учыніў крадзеж грошай і тэлефона.

Ігар ГРЫШЫН.

ПА КІМ СУБОТНІК ПЛАЧА

Чацвёра маладых людзей з Камянецкага раёна напіліся і не знайшлі іншага прымянення віруючай энергіі, як напасці на дарожныя знакі. Пацярпелі пяць дарожных указальнікаў у раёне вёскі Пагранічная. Неўзабаве былі ўстаноўлены асобы хуліганаў — з іх трое не працуюць. Іх неўтаймаваную энергію накіраваць бы на добраўпарадкаванне дарог і вуліц...

Яна СВЕТАВА.

«Шэўрале» ад Янкі Купалы

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Толькі на працягу трох дзён, з 16 па 18 красавіка, у Мінску каля Дзяржаўнага літаратурнага музея Я. Купалы можна пабачыць унікальны музейны прадмет — легкавую машыну Янкі Купалы «Шэўрале», падораную першаму народнаму паэту Беларусі ўрадам. Гэта менавіта той аўтамабіль, на якім пісьменнік 24 чэрвеня 1941 года пакінуў Мінск і, на жаль, больш сюды не вярнуўся. Машына знаходзіцца ў калекцыі музея і да нядаўняга часу экспанавалася ў філіяле музея «Ляўкі» Аршанскага раёна. У лістападзе мінулага года аўтамабіль быў прывезены ў Мінск для рэўстаўрацыі, і цяпер усе мінчане і госці сталіцы атрымалі магчымасць не толькі ўбачыць «Шэўрале» паэта, (цяперашнім коштам прыкладна 100 тысяч еўра), а таксама пазнаёміцца з матэрыяламі выстаўкі «Клічу вас я на пабеду...» з фондаў Купалавага музея.

Работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне намесніку начальніка ўпраўлення дзяржаўнага, адміністрацыйнага і крымінальнага заканадаўства Галоўнага экспертна-прававога ўпраўлення Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Арлову Леаніду Канстанцінавічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.

30 апреля 2010 года в 12.00
СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «МИНСКЭНЕРГОСТРОЙ»
ПОВЕСТКА ДНЯ:
1. Утверждение разделительного баланса.
2. Изменение уставного фонда ОАО «Минскэнергострой».
3. Внесение изменений в устав ОАО «Минскэнергострой».
Собрание состоится по адресу: г. Минск, ул. Монтажников, 39.
Начало регистрации в 11.30. УНП 100008291

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
ПО ПОРУЧЕНИЮ ОАО «БЕЛОМО – ММЗ ИМЕНИ С.И. ВАВИЛОВА» КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»
ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН
по продаже складского комплекса, расположенного по адресу: Минский район, Колодищанский с/с, Промузел «Колодищи» в составе:
1) Здание арочного складского помещения № 5, 679,5 кв.м; **2)** Здание арочного склада № 8, 697,5 кв.м; **3)** Здание арочного склада № 6, 373,3 кв.м; **4)** Здание склада, 652,8 кв.м; **5)** Здание котельной, 251,7 кв.м; **6)** Здание проходной, 36,6 кв.м; **7)** Здание сборно-щитового домика, 58,4 кв.м; **8)** Здание склада цемента и мела, 33,9 кв.м; **9)** Здание склада, 4316,5 кв.м; **10)** Здания блока металлических складов, 324,5 кв.м; 326,3 кв.м; **11)** Здание металлического склада, 68,2 кв.м; **12)** Здание склада древесного пека, 54,8 кв.м; **13)** Здание автовесов, 25,2 кв.м; **14)** Здание трансформаторной подстанции, 117,7 кв.м; **15)** Здание насосной станции, 57,5

ПЕРАВАРОТ У «АЎСЯНЦЫ»

Цяпер у гэтай гаспадарцы працаўнікі кантралююць кіраўніцтва, а не наадварот. Таму што ў СВК «Аўсянка» Горацкага раёна ўкаранілі новы гаспадарчы разлік — індывідуальна-камерцыйны.

Неэканамічная «валоўка»

— Хочам мы гэтага альбо не хочам, але і ў аграпрамысловым комплексе мы прыйдзем да гаспадарчага разліку, — рашуча **выказаўся старшыня СВК «Аўсянка» Адам САЛДАЦЕНКА**. — Жыццё прымусіць!

Адам Пятровіч узгадвае ўжо далёкія часіны, калі ўгнаенні сыпалі колькі хочаш і палілі без абмежаванняў паліва. Самае галоўнае было — вал прадукцыі. Дайце мяса, малако і збожжа, але якой цаной? Эканоміку ніхто не лічыў.

Так склалася, што «Аўсянка» сутыкнулася з гэтай праблемай раней за іншых. Перад базавай гаспадаркай паставілі задачу дасягнуць узроўню вытворчасці даперабудовачнага 1990 года. Гэта была нясложная задача, і яе выкананне, як цяпер кажуць, не заўсёды стасавалася з эканамічнай логікай.

— У пагоні за валам мы самі сябе загналі: урэшце не ведалі, як выплаціць людзям заробак, — прызнаецца Салдаценка. — Але тыя часіны ўжо сталі гісторыяй і мінулі незваротна. Сёння жыццё павярнулася так, што трэба лічыць кожную капейчыну. Каб быў меншым сабекошт, каб большай была рэнтабельнасць, каб, урэшце, больш грошай атрымлівалі сельскія працаўнікі.

Калі ў «Аўсянцы» сталі шукаць выйсце з тупіка, то ўзгадалі пра старыя і добры гаспадарчы разлік. Але звычайныя схемы ўсё ж сябе не апраўдвалі. Гавораць, што за гады ўсеагульнай «валоўкі» сяляне страцілі разуменне свайго асабістага і, з другога боку, грамадскага. Як заўсёды: на хатняй гаспадарцы працуюць з імпэтам, а ў калгасе — наплюваць.

— І мы пачалі шукаць шлях, каб зацікавіць чалавека, — расказвае кіраўнік «Аўсянкі». — Няхай бы ён зразумеў, што і ў гаспадарцы, нягай і не на 100%, але ўсё ж яго. І добра ведаў, што яго цяперашні заробак і светлае будучае залежаць ад працы, яго і ўсіх. Мы свой шлях урэшце знайшлі — гэта індывідуальна-камерцыйны гасразлік.

Даяркі экстра-класа

На ферме ў Гулідаўцы — чысціня і парадак. Даяркі адразу хваляцца сваімі «добрымі кароўкамі». У агульным пакоі акрамя ручнікоў ёсць вялікая дошка са шматлікімі паперкамі, паводле якіх кожная даярка можа вылічыць свой заробак за кожныя 10 дзён.

— У мяне цяпер заробак 1,2 мільёна рублёў, — бадзёра дае справаздачу **даярка Наталля АНЦІПЕНКА**. — А калі поўны месяц будзем даіць малако экстра-класа, то будзе яшчэ болей. Гэта магчыма, але трэба прыкласці ўсё старанне.

Даярка на лічбах пераконвае, што ім імкнуцца рабіць лепш і больш вельмі выгадна.

— Так, яны ўсе расцэнкі ведаюць, — пацвярджае **загадчыца фермы Людміла ЗАЛУЖНАЯ**. — Гэта сапраўды проста: калі надаіла 20 тон малака і здала гатункам «экстра», то 700 тысяч рублёў атрымае за малако і 780 тысяч — за якасць. Калі вышэйшым гатункам, то ўжо меней.

Даяркі ўзгадваюць, што яшчэ некалькі гадоў таму яны атрымлівалі тысяч 400 і бясконца скардзіліся на малыя заробкі. Урэшце старшыня СВК сабраў сход і рытарычна спытаўся: «Хочаце атрымліваць болей?» Эканамісты гаспадаркі распрацавалі цэлую сістэму, дзе даплаты можна атрымаць за якасць працы, рост прадукцыйнасці, санітарны стан, эканомію кармоў і гэтак далей.

— Калі ўсё зрабіць на 100 %, то можна і 3 мільёны рублёў за месяц атрымаць, — гавораць на ферме. — Пакуль так яшчэ не атрымліваецца, але мы шчыруем.

Пасля таго як працаўнікі «Аўсянкі» пагадзіліся з новай сістэмай, ніхто не пашкадаваў аб ранейшым, можа, і больш прывольным, але і меней грашовым працоўным жыцці. Штомесяц людзі збіраюцца на сход і абмяркоўваюць: адна даярка атрымала 1,5 мільёна, а другая — 600 тысяч рублёў. Значыць, па-рознаму працавалі.

— Прычым ад паказчыкаў залежыць не толькі заробак даяркі, але і мой, загадчыцы фермы, — адзначае Людміла Залужная. — А таксама і слесараў, якія рамантуюць абсталяванне. І жывёлаводаў, якія клапоцяцца пра кароў, каб яны былі сытыя і ў чысціні. Так што мы тут усе разам, у адной звязцы.

Працаўнікі камандуюць

— Мы далі ім неабходную базу: працуйце, давайце вынік, атрымлівайце грошы, — каментуе Адам Салдаценка. — Заданне атрымлівае кожны выканаўца. Напрыклад, мы гаворым: вось група кароў, генетычны патэнцыял навукоўцы ацанілі ў 6 тысяч літраў у год. А гэта кармы каровам. Калі будзеце даіць гатунак «экстра» — самы высокі заробак, а калі першы — зусім капейкі. Усё проста і сумленна, выгадна для гаспадаркі і чалавека.

Старшыня тлумачыць, што цяпер кіраўніцтва гаспадаркі і спецыялісты зусім не спяшаюцца з праверкамі на фермы і мехдвары. Навошта? Працаўнікі ў імкненні да лепшых заробкаў самі пільна сочаць за парадкам, бо ён наўпрост уплывае на вынікі працы, а значыць — на колькасць грашовых знакаў у кішэні.

— У нас высокая культура на фермах, — гаворыць Адам Пятровіч. — Цяпер з дапамогай дзяржавы ў сельскай гаспадарцы будуюцца новыя жывёлагадоўчыя комплексы, якія мы палацамі называем. Там укараняюцца новыя тэхналогіі, гэта наша перспектыва.

У «Аўсянцы» нават дайшло да таго, што самі людзі сталі кантраляваць кіраўніцтва, каб быў фронт працы і ўсё неабходнае для выканання. Цяпер на фермах няякасныя кармы ніхто не прыме: «А як на іх забяспечыць вышэйшыя гатункі малака?»

— Так, сёння ўжо не выканаўцы баяцца кіраўніцтва, а мы іх, — пацвярджаюць спецыялісты гаспадаркі. — Працаўнікі атрымалі магчымасць намі камандаваць. Што ж, такая ў нас праца: стварацца умовы для таго, каб гаспадарка атрымала якасную прадукцыю, а яе людзі — прыстойны заробак.

У майстэрні бачныя куты

Індывідуальна-камерцыйны гасразлік датычыцца не толькі жывёлаводаў, а ахоплівае ўсе віды дзейнасці ў гаспадарцы.

Механізатар атрымлівае ў пасяўную поле і паліва: калі зробіць раней за нарматыў ці зэканоміць паліва без шкоды для справы — значыць, заробіць болей.

Нарыхтоўка кармоў таксама мае новыя падыходы. Спачатку дамовіліся, што гадзіну працуем — 10 хвілін адпачываем. Падлічылі такім чынам, што за працоўны дзень трэба зрабіць 9 рэйсаў. Усё, што вышэй за норму, падлягае двайной аплаце.

— Таму нам і не трэба стаяць над рабочымі і бясконца кантраляваць іх, як гэта было раней, — пераконвае Салдаценка. — Нам удалося павысіць адказнасць людзей і даць ім магчымасць зарабіць. Нягай і па 10 мільёнаў зарабляюць, я буду толькі рады.

Эканамісты «Аўсянкі» заўважылі, што зашмат часу патрабуе рамонт сельгастэхнікі. Асабліва рамонтам злоўжываюць лайдакі. Чаму ж не? Нават за простой у майстэрні грошы плацілі спраўна штодзень. Атрымалася ў сярэднім, што кожны механізатар рамантуе тэхніку 45 дзён на год! Але ёсць і такія, якія стаялі больш за 100 дзён на год у майстэрні.

— Прыйшоў той час, калі механізатары бегаюць ад майстэрні! — расказвае Адам Пятровіч. — Проста стала нявыгадна станавіцца на працяглы рамонт, таму што да заробку плацяць 8 % за тое, што тэхніка працавала без прастояў. Так што прасцей стала самому ў вольны час падкруціць гайкі, каб не падцякала. Гэта ёсць нармальны тэхнічны догляд тэхнікі.

Цяпер, жартуюць у гаспадарцы, у майстэрню прыемна зайсці — куты бачныя. А раней тэхнікі было столькі, што не праціснуцца. Так у «Аўсянцы» здолелі падтрымаць тых, хто працуе, і падцягнуць астатніх, хто аддаваў перавагу таптанню ў майстэрні.

Эканамісты варушаць мазгамі

Толькі год з лішкам таму ў СВК «Аўсянка» запрацавала новая сістэма — індывідуальна-камерцыйная. Але вынікі яе ўкаранення ўжо ёсць.

Цяпер у гаспадарцы валавая вытворчасць прадукцыі да ўзроўню 1990 года складае 226 %. Прадукцыйнасць працы — 61 мільён на аднаго працаўніка. Гэта самая высокая лічба ў Горацкім раёне, але калі раўняцца на цывілізаваны захад, то можна давесці яе да 90-100 мільёнаў рублёў.

І, вядома, павялічыўся заробак. Сярэдні заробак за мінулы год перавысіў 700 тысяч рублёў. Плюс дадатковыя выгады ў выглядзе парасят, апрацоўкі кожнаму чалавеку гектара зямлі, бясплатнага басейна і іншых. Прычым важна, што сёння «Аўсянка» мае магчымасць плаціць заробак сваім працаўнікам своечасова, а калі трэба — дык і наперад аддаць!

Новыя падыходы да стымулявання працы ў СВК «Аўсянка» ўжо адзначыў як станоўчы вопыт старшыня Магілёўскага аблвыканкама Пётр Руднік. Нядаўна на базе гаспадаркі прайшоў семінар, дзе спецыялісты дзяліліся новым досведам.

— Самае каштоўнае, што ў людзей мяняецца мысленне і стаўленне да працы, — тлумачыць Адам Салдаценка. — Безумоўна, мы яшчэ не дасягнулі жаданага ўзроўню свядомасці і працавітасці. Гэта складаны і карпатлівы працэс, на які патрэбен час.

Кіраўнік упэўнены, што яго «Аўсянцы» пашанцавала з разумнымі эканамістамі, якія варушаць мазгамі, як атрымаць больш і танней. Цяпер у гаспадарцы тры эканамісты, і Адам Пятровіч мяркуе браць на працу чацвёртага:

— Таму што сёння час такі, што патрэбны розум, які пралічыць эканоміку і вызначыць экспертызу. Тады і прадукцыя будзе, і людзі будуць атрымліваць 500 долараў. І скажу, што «Аўсянка» адна з першых у краіне павінна падысці да такога сярэдняга заробку.

Ілона ІВАНОВА.

Горацкі раён.

САМАЛЁТ КРУЖЫЎ НАД ВЁСКАЙ...

У кожнай краіне існуюць законы, па якіх жывуць яе грамадзяне. Ёсць яшчэ розныя палажэнні ды інструкцыі, якімі рэгулюецца дзейнасць арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў...

Вёска Альсевічы знаходзіцца на тэрыторыі Крошынскага сельсавета і яе акружаюць землі СВК «Крошын». Калі не лічыць невялікай вуліцы-апендыкса, вёска працягнулася стужкай даўжынёй у кіламетр і шырынёй метраў у дзвесце.

Альсевічы знаходзяцца побач з Крошынам — цэнтральнай сядзібай сельгаскааператыва, але вёска лічыцца неперспектыўнай, бо тут жывуць пенсіянеры, тыя, хто не працуе ў гаспадарцы, ды дачнікі. Гадоў 25 таму і я купіў у Альсевічах сабе хатку, якая і стала для маёй сям'і прытулкам на лета.

6 красавіка прыехаў паглядзець, што робіцца на агародзе — вясна ж ідзе. І вось у гэты дзень над вёскай з'явіўся самалёт і пачаў апрацоўваць пасевы.

Паміж Альсевічамі і Крошынам знаходзіцца поле шырынёй прыкладна 600 метраў, дык вось, каб яго апырскваць «кукурузнік» раз-пораз пралятаў на брыючым над вёскай.

Назіраў за самалётам і не мог зразумець: чаму, калі ён пралятае над галавой, з-пад яго крылаў цягнецца лёгкі шлейф туману. Шлейф той не такі шчыльны, як над пасевамі, але ж ён быў. Напачатку гэта мяне асабліва не турбавала, але калі на твары асела імжа, пабег за фотаапаратам, бо яшчэ невядома было, што сыпалася з самалёта.

Сусед, які жыве праз вуліцу, здзівіўся:

— Падышоў да машыны і не магу зразумець — стаяла чыстая, а тут быццам плёнкай пакрытая.

Непакой з'явіўся, калі праз два дні я на агародзе знайшоў нежывых дразда-рабінніка і берасцянку, а сусед на сваім двары падняў мёртвага вераб'я. У птушак розная кармавая база, але яны загінулі па нейкай адной прычыне. Неабходна было ва ўсім разабрацца.

— У СВК «Крошын» праводзілася падкормка пасеваў мінеральнымі ўгнаеннямі, — заявіў **начальнік упраўлення сельскай гаспадаркі Баранавіцкага райвыканкама Міхаіл ПАЛУЯН**, *— сельгаскааператыў дзейнічаў напрамую з гродзенскім авіяатрадам, і ўпраўленне дачынення да гэтага не мае. А што датычыцца загінулых птушак, то неабходна ўстанавіць, па якой прычыне гэта здарылася.*

Сітуацыя часткова праяснілася.

Патэлефанаваў у інспекцыю аховы навакольнага асяроддзя і пачуў ад **намесніка начальніка Алега ЗАГУРСКАГА** наступнае:

— Мы не ў курсе гэтага. Калі самалёт лятаў над вёскай, то за лепшае было б звярнуцца ў санэпідэмстанцыю. За населеныя пункты адказвае санітарная служба, а наша інспекцыя трымае пад кантролем прыродаахоўныя зоны запаведнікаў, вадаёмаў... Ды і наконт загінулых птушак, напэўна, неабходна звярнуцца да іх.

Урач санэпідэмстанцыі Валянцін АЛЕКСАНДРОВІЧ таксама не ўнёс яснасці:

— Я кантралюю добраўпарадкаванне населеных пунктаў, і вам неабходна звярнуцца да экалагічнай інспекцыі. А што датычыцца птушак, то экспертызу ў нашым горадзе ніхто не зробіць.

Птушак шкада, але праблема не ў іх.

На вуліцы гулялі дзеці і пазіралі на самалёцік, які вельмі нізка кружыў над імі, і дарослым не магло прыйсці ў галаву нешта кепскае. Я і сам напачатку падумаў, што ёсць кіраўнік гаспадаркі, авіятары, экалагічная інспекцыя, і ўсё павінна быць добра.

Нехта скажа, што я раздзімаю праблему, бо «кукурузнік» сыпаў не атруту, а азотныя ўгнаенні.

А пытанне не ў гэтым. Я ўпэўнены, што лапік зямлі, заціснуты паміж дзвюма вёскамі, апрацоўваць самалётам нельга. Як бы пілот ні стараўся, а з вышыні некалькіх дзясяткаў метраў ён абавязкова захопіць сумежную тэрыторыю. У нашым выпадку пасевы ўшчыльную падступаюць да вёскі — гэта па-першае, а па-другое, кожны населены пункт мае ахоўную зону, і «кукурузніку» там рабіць няма чаго. А можа, я памыляюся?

Чаму пілот не накіраваў самалёт уздоўж вёскі, а «гладзіў» яе шматразова ўпоперак?

А ў нашым выпадку выбар такі: альбо «кукурузнік» захоплівае тэрыторыю вёскі, альбо не цалкам апрацоўвае пасевы. На маю думку, быў выкарыстаны першы варыянт.

Прэтэнзій да кіраўніка СВК «Крошын» Уладзіміра Шчарбацэвіча няма, бо не ён кіраваў тым «кукурузнікам», а вось з **начальнікам авіяатрада сельскагаспадарчай авіяцыі Алегам КАЧАЛАВЫМ** размова не атрымалася. Ён быў катэгарычным:

— Пілоты ўсё рабілі правільна, яны волыт-ныя і кожную раніцу перад палётам праходзяць абследаванне...

Што тут сказаць? Вунь расійскі «боінг» з пасажырамі ўпаў на чыгуначнае палатно, а потым было ўстаноўлена, што пілоты... Але ж гэта ў Расіі, а ў нас пілоты людзі адказныя. Праўда, як яны ляталі пад Баранавічамі, з Гродна відаць не было.

«Кукурузнікі» — не стратэгічная авіяцыя і, магчыма, ім дадзена шырокае поле дзейнасці, але і для іх ёсць абмежаванні.

Апісаны вышэй выпадак будзем лічыць анамаліяй, якая не павінна паўтарыцца. Тут важна прыцягнуць увагу да праблемы.

Вось наша газета надрукавала артыкул «У велікодны дзень на возеры» («Звязда», 6.04.2010 г.), у якім была ўзнята праблема засмечвання Жлобінскага возера, і праз колькі дзён у Баранавічах аб'явілі экалагічны суботнік па навядзенні на возеры парадку.

Робім агульную справу, жывём на адной зямлі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ. Фота аўтара.

Чаму захварэлі школьнікі?

Вучні малодшых класаў з групы падоўжанага дня школы № 7 г. Брэста дома паскардзіліся на боль у жываце. У некаторых былі зафіксаваны кішэчныя расстройствы. Напалоханыя пінскім выпадкам бацькі забілі трывогу. Медыцынская дапамога была аказана 20 школьнікам. Палову з іх шпіталізавалі, але праз дзень выпісалі дадому. Разбор здарэння праводзіць Брэсцкі санальны цэнтр гігіены і эпідэміялогіі.

Яна СВЕТАВА.

НЕ ПАДПАЛЬВАЙ

У апошнія выхадныя супрацоўнікі гаррайінспекцыі аховы навакольнага асяроддзя правялі рэйд па Баранавіцкім раёне. Якраз у гэтыя дні некаторыя жыхары і дачнікі выпальвалі сухую траву. 12 чалавек былі аштрафаваныя. А штраф вагаецца ў межах 10-40 базавых велічыняў.

ЗНІК ВЕЛАСІПЕД І... ЧЫГУНЫ

У хлеўчык пры дачы, якая знаходзіцца ў в. Асніца (Пінскі раён) залез злодзей і абакраў пенсіянерку, жыхарку в. Вылазы. Жанчына засталася без веласіпеда і 8 чыгуноў, якія вывез невядомы.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Белгазпромбанк

Совместное белорусско-российское ОАО «Белгазпромбанк» — уполномоченный банк ОАО «Газпром» в Республике Беларусь

Победитель республиканского конкурса «Лучший предприниматель»

220121, г. Минск, ул. Притыцкого, 60/2, тел. 229 16 16 (администратор)
www.belgazprombank.by

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2010 г.

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	2010 г.	2009 г.
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101		69 690,5	53 054,9
3	Средства в Национальном банке	1102		65 500,8	46 262,2
4	Ценные бумаги	1103		172 910,3	209 220,3
	для торговли	11031		41 597,3	35 006,8
	удерживаемые до погашения	11032		-	-
	в наличии для продажи	11033		131 313,0	174 213,5
5	Кредиты и другие средства в банках	1105		200 412,9	107 380,3
6	Кредиты клиентам	1106		1 352 871,7	1 173 832,3
7	Долгосрочные финансовые вложения	1107		45,9	45,9
8	Основные средства и нематериальные активы	1108		73 820,0	47 222,7
9	Прочие активы	1109		75 361,7	35 292,1
10	**Итого активы**	**110**		**2 010 613,8**	**1 672 310,7**
11	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
12	Средства Национального банка	1202		12 831,5	85 286,7
13	Кредиты и другие средства банков	1205		353 541,0	523 308,8
14	Средства клиентов	1206		974 158,2	630 976,6
15	Ценные бумаги, выпущенные банком	1208		65 317,3	99 272,1
16	Прочие обязательства	1209		47 198,2	40 308,2
17	Всего обязательства	120		1 453 046,2	1 379 152,4
18	**КАПИТАЛ**				
19	Уставный фонд	1211		426 268,8	218 593,8
20	Эмиссионный доход	1212		-	-
21	Резервный фонд	1213		23 015,6	19 623,4
22	Накопленная прибыль	1214		95 319,5	44 550,5
23	Фонд переоценки статей баланса	1215		12 963,7	10 390,6
24	Всего капитал	121		557 567,6	293 158,3
25	**Итого обязательства и капитал**	**12**		**2 010 613,8**	**1 672 310,7**
26	**ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ**				
27	Требования	1301		1 994 674,5	1 498 910,9
28	Обязательства	1302		892 031,9	523 965,7

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2010 г.

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	2010 г.	2009 г.
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		89 801,1	52 479,8
2	Процентные расходы	2012		33 001,0	34 333,7
3	*Чистые процентные доходы*	201		56 800,1	18 146,1
4	Комиссионные доходы	2021		14 014,6	10 421,9
5	Комиссионные расходы	2022		3 941,4	3 094,2
6	*Чистые комиссионные доходы*	202		10 073,2	7 327,7
7	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	203		637,1	6 210,1
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204		3 626,9	77,5
9	Доход в форме дивидендов	205		-	2,1
10	Чистые отчисления в резервы	206		10 823,2	2 243,6
11	Прочие доходы	207		24 084,1	10 863,5
12	Операционные расходы	208		29 277,4	18 572,1
13	Прочие расходы	209		8 023,9	4 712,6
14	Налог на прибыль	210		9 166,3	2 292,7
15	**Прибыль (убыток)**	**2**		**37 930,6**	**14 806,0**

Председатель Правления **В.Д. Бабарико**

Зам. главного бухгалтера **В.А. Коробова**

Дата подписания: 06 апреля 2010 г.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 8 от 27.10.2006, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100429079.

«ПАРУШЭННЯЎ ПА ФАРМІРАВАННІ ЦЭНАЎ НА ТАВАР НЕ ЎСТАНОЎЛЕНА...»

Мы наконт цэнаў у крамах нашага сельскага Савета. Яны ў нас дужа кусаюцца... Прадавец тлумачыць, што ўсё правільна, раённае спажывецкае таварыства правярае падатковая. Яно няхай сабе так і будзе, але пераплачваць таксама не хочацца. Вось гарошак лушчаны: у горадзе 1160 рублёў у шапіку, 1800 — у магазіне, а ў нас 3100. Адкуль такая цана бярэцца? А ў калгасе заробак 200 тысяч рублёў. Гэта добра, што ў краме можна браць усе прадукты пад запіс, але, можа, вы нам хоць бы чым дапаможаце наконт цэнаў...

Жыхары вёсак Сурды, Старое Сяло Бялыніцкага раёна.

Па сутнасці гэты ліст з'яўляецца ананімным (няма дакладнага зваротнага адрасу, прозвішчаў заяўнікаў), таму на цалкам законных падставах рэдакцыя мела права яго не разглядаць. Тым больш змест яго дастаткова бязладны — з аднаго боку, людзі наракаюць на, як яны ўпэўненыя, высокія цэны ў краме, з іншага — дзякуюць за водпуск прадуктаў «на павер». Ды і з канкрэтных лічбаў згадваецца толькі цана на лушчаны гарошак... Тым не менш мы вырашылі не пакідаць ліст без увагі і, патлумачыўшы сітуацыю кіраўніцтву Бялыніцкага раённага спажывецкага таварыства, папрасілі праверыць агучаную заяўнікамі інфармацыю.

Праз нейкі час рэдакцыя атрымала афіцыйнае рэагаванне. «Праўленнем раённага спажывецкага таварыства праведзена праверка крамы ў вёсцы Старое Сяло. У выніку парушэнняў па фарміраванні цэнаў на тавар, што маецца, не ўстаноўлена. Цана на гарох лушчаны складае 1900 рублёў за пакет 0,9 кілаграма, атрыманы па накладной 18 лютага 2010 года. Цэнаўтварэнне ў сістэме Бялыніцкага раённага спажывецкага таварыства праводзіцца ў адпаведнасці з інструкцыяй «Аб парадку фарміравання і выкарыстання цэнаў і тарыфаў» № 183 ад 10 верасня 2008 года. Гандлёвыя надбаўкі выкарыстоўваюцца ў адпаведнасці з Дадаткам №1 да пастановы міністэрства эканомікі № 151 ад 8 верасня 2009 года».

«НЕ Ў ДЗЯДУЛЯХ З ТРАДЫЦЫЙНЫМІ КАШАМІ ПРЫЧЫНА. А Ў ЛЕГАЛІЗАЦЫІ БРАКАНЬЕРСТВА!..»

(Працяг. Пачатак у нумары ад 10 красавіка.)

Працягваем друкаваць водгукі, што паступілі на матэрыял Сяргей Расолькі «Ці быць сеткам-2. Але ўжо з «нацыянальным» каларытам», які быў змешчаны ў «Звяздзе» 8 красавіка. Нагадаем, ідзе абмеркаванне магчымага дазволу выкарыстоўваць пры арганізацыі платнага аматарскага рыбалоўства ў фондзе рыбалоўных угоддзяў, дадзеных у арэнду ці бескарыслівае карыстанне, для прыцягнення замежных турыстаў самародных нацыянальных прыладаў лоўлі, што цяпер знаходзяцца пад забаронай як браканьерскія.

@

Бучы і хапуны — гэта толькі пілотны праект. Будуць яны — праз год-два будуць і сеткі. Паколькі змяншэння рыбных запасаў ад «этнаграфіі» не заўважаць, значыць, і ад сетачак шкоды не будзе. Іх логіка прыкладна такая?

Валюты паляванне яны ўжо назарабляліся — з месяц толькі і чутныя паведамленні, што замежныя паляўнічыя тут паводзяць сябе так, быццам індульгенцыю атрымалі.

Дарэчы, галоўны хітрык цяперашніх новаўвядзенняў у тым, што многія з прапанаваных да дазволу прыладаў будуць больш уловістымі за 25 метраў сетачкі. Некаторыя з іх могуць выкарыстоўвацца схавана і іх складаней знайсці.

І, нарэшце, усё гэта «этнічнае» месіва на практыцы будзе абсалютна бескантрольным. І не кожны інспектар у гэтых «этнаграфізмах» зможа разабрацца. Для іх што, курсы спецыяльныя арганізоўваць будуць?

Людзьмі, якія дзеля іншаземцаў гатовыя падрываць прыродны баланс у сваёй роднай краіне, рухае глыбокае саўковае пачуццё ўласнай непаўнавартаснасці... Прыгадайце, у СССР усё лепшае для інтурыстаў было, і звычайны савок страшна ганарыўся, калі ў інтурыстаўскае месца яму ўдавалася патрапіць. Тое ж самае рэалізуецца і ў сучаснай Беларусі. І, гледзячы на «этнічныя» прылады ў руках замежнікаў у лепшых угоддзях па БТ, кожны пацан з Шабаноў, Пухавічаў і г.д. будзе марыць гэтак жа «палавіць».

Netsky(r).

@

Адным з аргументаў супраць дазволу выкарыстання «спрадвечных» метадаў у аматарскім рыбалоўстве з'яўляецца іх выключна прамысловае прызначэнне. Не выкарыстоўваюцца яны ні для адпачынку, ні для спартыўнай рыбалкі. Адзінае іх прызначэнне — здабыча, промысел. Часта ў адсутнасць рыбалова, што кантралюе іх. Адзін раз паставіў, і збірай здабычу раз у суткі-двое. Адпаведна і выкарыстоўвацца гэтыя прылады будуць па прызначэнні. А здабыча і промысел дзеля 5 кілаграмаў дазволенай да вылаву рыбы бессэнсоўныя. Значыць, рыбалоў, які выкарыстоўвае гэтыя прылады, першапачаткова нацэлены на парушэнне нормы вылаву. Нонсенс.

Алег.

@

Шышоў І.А. не дасказаў аднаго — хто з рыбаловаў, купляючы зараз дарагія прылады, прынады, збіраючы грошы і ў выніку робячы такія набыцці як лодка і матор, прамяняе нармальную рыбалку на «экзатычную»? Не цяжка падлічыць, што ў многіх цана ўсіх выдаткаў на рыбалку за год супастаўная з паўнавартасным гадавым рыбным рацыёнам, прычым з марской, на мой погляд, больш смачнай рыбы. І калі І.А. судзіць сам па сабе — дык не ўсе едуць на вадаём за харчаваннем:)

А такія спосабы лоўлі ў першую чаргу зацікавіць тых, хто ў нядаўнія гады, да ўвядзення нармальных штрафаў, лавіў сеткамі і жыў за кошт гэтага. Многія зноў возьмуцца за ранейшае — брыгаду абібокаў з 3—5 чалавек побач з любой крамай няцяжка сабраць. І хто, цікава, будзе ўсіх гэтых аматараў «нацыянальнай» рыбалкі кантраляваць? Вы, І.А., спецыяльна прыедзеце да нас?

anarchy.

@

Хочуць узаконіць браканьерства!!!!

Многія рыбаловы, з кім даводзілася мець стасункі, супраць гэтых новаўвядзенняў. Амаль у кожнай трэцяй сям'і ёсць рыбалоў, які часта або не вельмі ездзіць на рыбалку. Не ўсе добрасумленныя, і, пры магчымасці, вылоўліваюць нашмат больш рыбы, чым належыць, пры гэтым дзяржінспекцыя не ў сілах за гэтым прасачыць.

Сайт «Звязды»: www.zviazda.by

Калі ўзаконяць «традыцыйныя» спосабы лоўлі, дык абстаноўка на вадаёмах стане жудаснай. Нашы дзеці будуць лавіць толькі п'явак.

НАША МЕРКАВАННЕ — СУПРАЦЬ!!!!

Аляксандр.

@

Мой стаж рыбалова-аматара — 27 гадоў. Памятаю і 80-я гады, і ліхія ў плане разгулу браканьерства 90-я. Нарадзіўся і вырас у вёсцы. На практыцы бачыў, колькі і як можна здабыць рыбы гэтымі, так званымі «традыцыйнымі», прыладамі. Брэднем трыма «лаўцамі» за 2—3 «рыбалкі» меліярацыйная сетка плошчай 1х1 км (гэта каля 10 каналаў) ЦАЛКАМ зачышчаецца ад карасёў, уюноў, шчупака. Венцерамі (жакамі) перагароджваюцца шляхі міграцыі рыбы па пойменных вадаёмах невялікай ракі, і ўся рыба, што ідзе, вылоўліваецца. Павуком за ноч можна, умеючы, нарыхтаваць да 250 кг рыбы. Г.зн. усе гэтыя «традыцыйныя прылады» — чыстай вады браканьерства! Дазваляць іх нельга ні ў якім разе!

Рыбы зараз стала БОЛЕЙ! Натуральна, у тых вадаёмах, дзе не гаспадараць браканьеры ў законе — арандатары, што займаюцца прамлоўляй. І нельга дапусціць новы ўсплёск браканьерства, лазейкай для якога з'яўляюцца гэтыя незразумелыя, ШКОДНІЦКІЯ ініцыятывы па «аднаўленні традыцыйных спосабаў лоўлі»...

Шынгель Сяргей Уладзіміравіч.

@

А хто экспертызу будзе рабіць, што «ручная вязка»?

І для каго ПЛАТНАЯ рыбалка сеткамі? Для дзядулі 70 гадоў? Дык не будзе ён плаціць, а хутчэй паставіць морду, верш ці іншую прыладу так, што ніхто з рыбакоў і не ўбачыць. А вось каго я за 4 гады маёй больш-менш актыўнай рыбалкі на Сожы, Дняпры, Друці і Прыпяці не бачыў, дык гэта рыбінспекцыю. НІ РАЗУ за ЧАТЫРЫ ГАДЫ!!!

Не пра тое клапоцца рупліўцы. А нашы нацыянальныя прылады я з задавальненнем паказаў бы сваім дзецям і сябрам у сваім рыбацкім доміку. У якасці музейнага ЭКСПАНАТА, і толькі так.

serg-gomel.

@

Чамусьці спадар Шышоў не прыгадвае (ці проста не ведае?) пра такі не менш традыцыйны спосаб лоўлі, як лоўля рыбы рукамі, лоўля на арэхавую (бярозавую, ядлоўцавую) паплаўковую вуду (а паплавок з чароту ці гусінага пяра) з лёскай з конскага воласа? Чаму гаворка пераважна пра прылады з сеткаматэрыялаў? Агаворка «самавязаная з натуральных матэрыялаў» не больш чым юрыдычны кручок. А як аператыўна на месцы высветліць, з натуральнага матэрыялу звязаная сетка ці з сінтэтыкі?

andrio.

@

Гэта як трэба ненавідзець родную ПРЫРОДУ, каб да такога дадумацца????

Ні адзін замежны турыст, які сябе паважае, не будзе глядзець, і тым больш удзельнічаць у такім дзікунскім знішчэнні рыбы так званымі «народнымі» прыладамі, не паедуць яны да нас за гэтым... а калі знойдуцца адзінкі (што малаверагодна!!!), хто паедзе, трэба будзе ставіць пытанне адносна іх псіхічнага здароўя. Эканамічная падаплёка гэтай задумы бессэнсоўная...

А негатыўных фактараў набярэм кучу, і галоўным з іх будзе некантраляваны пералоў рыбы, парушэнне асяродку пражывання, падрыў кармавой базы. Можна працягнуць і далей...

Вы будзеце смяяцца... у мяне ёсць адзін знаёмы браканьер. Ну, балуецца сеткамі ... Паціху перавыхоўваю.... ДЫК І ЁН СУПРАЦЬ ЛЕГАЛІЗАЦЫІ СЕТАК І ІНШЫХ «народных» прыладаў... Людзі, апамятайцеся.

himik.

@

Некаторыя рыбаловы могуць спытаць: а як звязаная сучасная рыбалка і легалізацыя старажытных метадаў лоўлі? Адкажу: звязана непасрэдна, прама. Тым, хто палівае брудам усякую рыбалку, акрамя сучаснай тэхналагічнай, добра было б ведаць, што метад лоўлі лабірынт потым выкарыстаны ў народных мордах-жаках—вёршах, метад накідкі выкарыстоўваўся ў надстаўках, касынках... іншымі словамі, усе гэтыя спосабы лоўлі адыходзяць у нябыт. Яны адамруць натуральным чынам, самі па сабе..., як адыходзяць у мінулае верацяно і ткацкія станкі з драўніны. Гэта звычайны ход рэчаў. Але пакуль ёсць носьбіты гэтых традыцыйных спосабаў лоўлі, трэба іх паважаць. Яны паважалі і любілі нашу сінявокую Беларусь не менш за нас, а, магчыма, і больш! Сёння іх загналі ў падполле пад уяўным абвінавачваннем у бра

Камбат Мікалай ГАРБАНЁЎ:

«НА ЎСЁ ЖЫЦЦЁ ЗАПОМНІЎ ГЭТА «ТРЫМАЦЦА...»

Дванаццаць імгненняў вайны. Частка 4.

Ён кіраваў супрацьтанкавай батарэяй. І некалькі разоў, калі пяхота ўцякала, прымаў на сябе асноўны ўдар гітлераўцаў.

Што гэта такое — чакаць падмацавання, калі ты пераўтварыўся ў жывую мішэнь? І чаму пад Берлінам батарэйцы Мікалая Гарбанёва не сталі страляць у немцаў? Пра гэта карэспандэнт «Звязды» распытваў у Героя Савецкага Саюза.

Сустрэцца з Мікалаем Гарбанёвым мы дамаўляліся некалькі разоў. Ведалі, што генерал-маёр «нядобра сябе адчувае», але па маладой наіўнасці думалі: сёння ветэрану нядобра, а заўтра, можа, і лепей стане.

Мікалай Кузьміч запрасіў дадому. І аказалася, што ён ужо доўгі час не падымаецца з інваліднага крэсла, з натугай робіць хоць нейкія павароты галавой, рукамі, з цяжкасцю размаўляе...

Тым не менш, афіцэр не змог адмовіць журналістам. Такая загартоўка ў чалавека: трэба — значыць, трэба. Такім быў і яго шлях у час вайны. Камандзірам батарэі Мікалай Гарбанёў дайшоў амаль да Берліна, выконваў смяротныя заданні, і нават Дзень Перамогі сустрэў у шпіталі, з перабітай нагой. Стары афіцэр прасякнуўся ўспамінамі, з болем і паўзамі вымаўляючы кожны сказ...

«Падбіваць танкі давялося «кактэйлем Молатава»

— Да вайны я скончыў школу, педкаледж, а затым Варонежскі настаўніцкі інстытут. Збіраўся вучыць дзяцей, але вайна ўсё крута змяніла...

Калі ўсе даведаліся пра напад немцаў, я здаваў дзяржаўны экзамен па фізіцы. Я адразу ж быў прызваны ў армію і накіраваны ў Харкаўскае артылерыйскае вучылішча, якое ў той час дыслацыравалася ў Сумах, ва Украіне. Рыхтавалі афіцэраў-супрацьтанкістаў.

Вайны чакалі, таму адразу ж была рэакцыя перамогі і поўнага разгрому ворага. Праз невялікі час вучобы (месяц, не болей) нас паднялі па трывозе, узбройлі — і пад Кіеў, на фронт, сустракаць немцаў. Мне выдалі аўтамат і бутэльку з гаручай вадкасцю («кактэйль Молатава»).

Спачатку мы сустрэліся з авіяцыяй немцаў. Нас выгрузілі на станцыі Варажба ва Украіне, і ў гэты час — налёт, больш за 20 самалётаў. Але мы прынялі гэта першае знаёмства, не пабеглі, не паніковалі, пачалі страляць па праціўніку, хоць агонь гэты быў «пусты», неэфектыўны, бо самалёты ляцелі на вялікай вышыні. Усе курсанты засталіся жывыя...

Потым былі цяжкія баі. Характар іх быў такі. Уначы рыхтавалі рубеж абарончы, удзень адступалі ў боем. Давялося весці барацьбу з танкамі, праўда, вынік быў невысокі — падбіць тэхніку бутэлькай з «кактэйлем Молатава» было немагчыма...

Калі сітуацыя на фронце перастала быць крытычнай, курсантаў павезлі давучвацца. З артылерыйскага вучылішча Мікалай Гарбанёў выйшаў старшым лейтэнантам і стаў камандзірам батарэі 350-га супрацьтанкавага дывізіёна. Пад яго кіраўніцтвам было шэсць супрацьтанкавых 45-міліметровых гармат і каля 30 байцоў.

Кульмінацыя бою была такая: нашы гарматы адкрылі агонь па танках, але снарады браню не бралі. Стала зразумела, што танкі трэба падпусціць бліжэй і потым расстрэльваць. І гэта дало вынік: пяць танкаў варожых былі знішчаныя там.

«Пяхота пабегла, а нам загадалі пратрымацца суткі»

У сакавіку 1943 года Мікалай Кузьміч атрымаў першае раненне і трапіў у вайсковы шпіталь. Тады камбат яшчэ не ведаў, што па-сапраўднаму смяротна небяспечныя баі чакаюць яго наперадзе.

— Бой пад Чаркасамі занеслі ў вайсковыя аналы, — са сціплым гонарам узгадвае ветэран. — Батарэя атрымала загад фарсіраваць раку Дняпро ў раёне Канеўскіх вышыняў. Мы паспяхова выканалі загад, захапілі невялікі плацдарм, які далей развіцця не атрымаў. Немцы ўладарылі над мясцовасцю. Там знакамітыя Канеўскія вышыні давалі праціўніку перавагу. Як зараз памятаю: 7 лістапада 1943 года загадалі пакінуць плацдарм і фарсіраваць Дняпро на поўнач ад Чаркасаў. Пераправіліся, памятаю, яшчэ ліст напісаў дадому пра тое, што Гогаль меў рацыю, бо і сапраўды рэдкая птушка даляціць да сярэдзіны Дняпра...

Занялі абарону на ўскраіне вёскі Свідавак. Баі завязаліся жорсткія, немцы любой цаной вырашылі зваліць нас у Дняпро, ліквідаваць плацдарм. А ў гэты час галоўныя сілы дывізіі перапраўляліся праз раку. Немцы кінулі ў бой танкі, але там лес, і толькі прасекі былі здольныя прапусціць тэхніку. Гэта нам дапамагло. Кульмінацыя бою была такая: нашы гарматы адкрылі агонь па танках, але снарады браню не бралі. Стала зразумела, што танкі трэба падпусціць бліжэй і потым расстрэльваць. І гэта дало вынік: пяць танкаў варожых былі знішчаныя там. Немцы атак не спынялі. І наша пяхота, якая абаранялася метрах у 200—300 спераду ад гармат, пахіснулася і пабегла. Я пішу данясенне камандзіру дывізіёна (Пашкоў такі, Іван Фёдаравіч, царства яму нябеснае). Пішу і пазначаю, што такія складаліся абставіны, немцы атакавалі, пяхота адышла з пазіцый у тыл, у вёску. Прашу ў камандзіра дывізіёна дазволу пакінуць пазіцыі і адысці на ўскраіну вёскі. Ён дасылае пасыльнага з адказам. У ім адно слова: «Трымацца». На ўсё жыццё запомніў гэтае «Трымацца».

— Выходзіць, вас кінулі паміж молатам і кавадлам...

— Гэта было разумнае рашэнне. Калі б мы пакінулі пазіцыі і адышлі, то і самі загінулі б, і аперацыя завалілася б. Тады мы трымаліся суткі і вытрымалі. Потым падышлі галоўныя сілы дывізіі...

Пад вёскай Свідавак было забіта каля 80 гітлераўцаў, знішчана самаходная зброя немцаў і, як расказаў ветэран, падбіта пяць гітлераўскіх танкаў. А камбат Мікалай Гарбанёў за мужнасць атрымаў Зорку Героя.

— Аналагічная сітуацыя здарылася пад Ясамі, у Румыніі, — працягвае Мікалай Кузьміч. — Ішоў 1944 год. У адным з зацятых баёў наша пяхота зноў пахіснулася і пакінула пазіцыі. Галоўны цяжар бою ўзялі на сябе мае батарэйцы. Немцы тады выйшлі на высоты на правым беразе ракі Прут, але былі спыненыя...

Я з групай салдат (5 чалавек) выйшлі з лесу на паляну. І тут жа немцы!.. І вось нейкі шок быў, незразумелы шок ад такога сутыкнення раптам... Разышліся спакойна. Не ведаю, чаму. Абсалютна стыхійна, яны — да сябе ў кусты, мы — да сябе ў кусты...

«Выходзім з лесу — і тут жа немцы!»

Мікалай Кузьміч зрабіў чарговую доўгую паўзу. І замест таго, каб распавесці нам пра чарговыя баі і раненні, узгадаў проста сенсацыйны для савецкага генерала выпадак. Справа здарылася пад Берлінам 24 красавіка 1945 года.

— Мы знаходзіліся на левым флангу групоўкі, якая наступала на Берлін. Там наша дывізія трапіла ў акружэнне. Было загадана выходзіць. Здарылася арыгінальная сустрэча. Я з групай салдат (5 чалавек) выйшлі з лесу на паляну. І тут жа немцы!.. І вось нейкі шок быў, незразумелы шок ад такога сутыкнення раптам... Я пра гэты выпадак распавёў аднойчы афіцэру нямецкай арміі. І ён не паверыў: як такое можа быць, што сутыкнуліся і ніводзін бок не страляў. Разышліся спакойна. Не ведаю, чаму. Можа, таму, што ўжо відавочны быў выход вайны. Абсалютна стыхійна, яны — да сябе ў кусты, мы — да сябе ў кусты...

Воляй лёсу ў гэтых жа баях батарэйцаў Мікалая Гарбанёва абстралялі, не пазнаўшы, свае, чырвонаармейцы. Камбат быў паранены ў нагу і трапіў у шпіталь...

Пасля вайны Мікалай Кузьміч скончыў Акадэмію бранятанкавых войскаў, даслужыўся да генерал-маёра. Кіраваў штабам групы савецкіх войскаў у Аўстрыі, потым — палком у Барысаве. А з сярэдзіны 70-х стаў на чале Казанскага суворaўскага вучылішча. Пасля адстаўкі заслужаны афіцэр захацеў жыць у Беларусі. Такі вайсковы шлях гэтага чалавека. Ветэран меўся яшчэ нешта распавесці, але зрабіў падазрона доўгую паўзу, схіліў галаву.

— Мікалай Кузьміч, можа, вам дрэнна? — пытаемся.

— Так, няважна сябе адчуваю... — *вымавіў ветэран і паспрабаваў усміхнуцца.* Першым прызнацца ў дрэнным самаадчуванні 86-гадовы генерал-маёр не змог. Адчыняем фортку па яго просьбе, дзякуем за гутарку і з тугой пакідаем цесны пакойчык ветэрана. Пакідаем яго сам-насам з успамінамі пра яго вайну, Вялікую Айчынную і сучасную.

Яўген ВАЛОШЫН.

Аляксандр БОЙКА:

«З МЕРКАВАННЕМ СТУДЭНЦКАГА ПРАФСАЮЗА КІРАЎНІКАМ ДАВЯДЗЕЦЦА ЛІЧЫЦЦА...»

Каму даваць месца ў студэнцкім інтэрнаце ў першую чаргу: беларусам ці замежным грамадзянам, якія на платнай аснове атрымліваюць адукацыю ў беларускіх ВНУ? Няцяжка здагадацца, якім будзе адказ на гэта пытанне маладых людзей, якім даводзіцца самастойна шукаць сабе дах над галавой на час свайго навучання ў іншым горадзе, асабліва ў сталіцы, дзе цэны на арэнду жылля моцна «кусаюцца». Між іншым, памер сумы кампенсацыі за наём студэнтамі жылля складае ўсяго 25 працэнтаў базавай велічыні, што выглядае проста смешна ў параўнанні з коштам арэнды. У студэнтаў ёсць сваё меркаванне на гэты конт, і яго агучыла на VI з'ездзе Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі **старшыня прафкама студэнтаў Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна Іна ЖАК**. Спадзяёмся, што ніхто не стане аспрэчваць той факт, што студэнцтва — не толькі самая крытычная настроеная, але і самая ініцыятыўная, самая сацыяльна актыўная частка нашага грамадства, таму да меркавання студэнцкай моладзі заўсёды карысна прыслухацца.

— Мы разумеем, што адукацыйныя паслугі трэба і пашыраць, і экспартаваць. Але ў сувязі з павелічэннем сярод студэнтаў беларускіх ВНУ замежных грамадзян у многіх ВНУ абвастрылася праблема дэфіцыту месцаў у студэнцкіх інтэрнатах, — паведаміла Іна Жак. — У Брэсцкай вобласці, напрыклад, забяспечанасць навучэнцаў жыллём у інтэрнатах вагаецца ад 39 працэнтаў у Брэсцкім дзяржаўным універсітэце імя А.С. Пушкіна да 88 працэнтаў у Баранавіцкім універсітэце. Цяпер, у адпаведнасці з рэкамендацыямі Міністэрства адукацыі, універсітэт вылучае жылую плошчу ў інтэрнаце кожнаму замежнаму грамадзяніну. Мы ж просім даць ВНУ з нізкім працэнтам забяспечанасці жылымі памяшканнямі большую самастойнасць. Слухачоў падрыхтоўчага аддзялення прапануем засяляць у інтэрнаты ўніверсітэта ў абавязковым парадку, а студэнтаў першага і наступных курсаў — з улікам рэальных магчымасцяў ВНУ і жадання саміх студэнтаў.

Яшчэ адна праблема, якую ўзняла ў сваім выступленні Іна Жак, гэта адмена льготаў для студэнтаў на праезд у пасажырскім транспарце. Своеасаблівай кампенсацыяй павінна была стаць матэрыяльная дапамога на праезд тым, хто сапраўды мае ў гэтым патрэбу. Хто можа на яе прэтэндаваць і ў якім памеры, вызначыла Пастанова Урада ад 11 сакавіка 2008 года № 375. Аднак гэты дакумент утрымлівае столькі абмежаванняў, у тым ліку і да сярэдненедушавога даходу сям'і, што ў рэальнасці па кампенсацыі за праезд звяртаюцца толькі адзінкі. Да таго ж, дапамога на праезд можа быць аказана ў выглядзе толькі частковай кампенсацыі (не больш за палову) кошту праязнога дакумента да месца пражывання сям'і. На аўтобусах рэгулярных міжгародніх зносінаў студэнт можа здзейсніць толькі дзве паездкі ў месяц (туды і назад), а на прыгарадным транспарце — чатыры паездкі на працягу месяца. Прычым часткова кампенсаваць можна толькі паездкі ў суботу, нядзелю, святочныя дні і ў дні зімовых канікулаў. А, напрыклад, паехаць да бацькоў у пятніцу, а вярнуцца ў панядзелак, каб быў час не толькі адпачыць, але і дапамагчы бацькам, студэнт не можа. Не зусім зразумела, чаму?

На падставе ўрадавага дакумента ва ўстановах адукацыі былі распрацаваныя адпаведныя лакальныя нарматыўныя дакументы. Рашэнне аб аказанні дапамогі прымае камісія, якая пастаянна дзейнічае ў навучальнай установе.

— Работа вядзецца вялікая, аднак з-за жорсткіх крытэрыяў фінансавую падтрымку атрымлівае дастаткова вузкае кола студэнтаў, — падкрэсліла Іна Жак. — На наш погляд, трэба пашырыць катэгорыі навучэнцаў, якія змогуць прэтэндаваць на атрыманне матэрыяльнай дапамогі. Студэнты пэўных сацыяльных груп (напрыклад, са шматдзетных сем'яў, інваліды) павінны мець магчымасць часцей ездзіць дамоў. І калі няма на гэта сродкаў у дзяржавы, трэба даць права ўносіць гэтыя пазіцыі ў лакальныя дакументы і накіроўваць на гэтыя мэты (зразумела, пры наяўнасці сродкаў ад пазабюджэтнай дзейнасці) грошы саміх ВНУ. Ці ўнесці адпаведную норму ў Галіновае пагадненне паміж прафсаюзам і Міністэрствам адукацыі.

Відавочна, што створаная сістэма кампенсацыі за праезд сёння не працуе і яе трэба мяняць ці хоць бы падняць планку даходаў сем'яў, каб павялічыць кола студэнтаў, якія змогуць прэтэндаваць на атрыманне фінансавай падтрымкі.

Ёсць пэўныя праблемы і з арганізацыяй аздараўлення навучэнскай моладзі.

— Прыемнай навіной для нас стала выдзяленне ў 2010 годзе сродкаў на арганізацыю санаторна-курортнага лячэння і аздараўлення студэнтаў не толькі на базе студэнцкіх санаторыяў-прафілакторыяў, але і ў іншых здраўніцах краіны. І за гэта вялікі дзякуй сацыяльным партнёрам. Аднак, наколькі нам вядома, навучэнцы змогуць прайсці аздараўленне толькі на працягу навучальнага года. Улічваючы асаблівасці арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу ў ВНУ, студэнтам пажадана даваць такія пуцёўкі ў час канікул, бо на практыцы можа атрымацца так, што дапамогу мы прапаноўваць будзем, але скарыстацца ёй змогуць не ўсе студэнты, якія сапраўды маюць патрэбу ў аздараўленні, — патлумачыла сутнасць праблемы Іна Жак.

Пытанне аб стыпендыяльным забеспячэнні заўсёды хвалявала студэнцтва. Трэба заўважыць, што памеры стыпендыі пастаянна павялічваюцца. Дзякуючы асаблівасцям дзеючай у Беларусі сістэмы стыпендыяльнага забеспячэння, стыпендыі выплачваюцца зараз больш як 90 працэнтам навучэнцаў, якія маюць права на іх атрыманне. Ёсць імянныя і прэзідэнцкая стыпендыі. Істотна ўзрасла апошнім часам і аспіранцкая стыпендыя, памер якой складае 611 тысяч рублёў у месяц. Аднак надзвычай нізкім застаецца памер стыпендыі ў студэнтаў другой ступені вышэйшай адукацыі — з улікам надбаўкі яна складае толькі 160 тысяч рублёў. Між іншым, магістранты — гэта людзі з вышэйшай адукацыяй, якія нярэдка ўжо маюць свае сем'і.

Ірына Жак падкрэсліла, што пытанням сацыяльнай падтрымкі навучэнцаў і рэалізацыі іх правоў надаецца шмат увагі на розных узроўнях. Але і прафсаюзная арганізацыя павінна арыентаваць студэнтаў на выкананне імі сваіх непасрэдных абавязкаў. Маецца на ўвазе, у першую чаргу, стаўленне да вучобы членаў студэнцкага прафсаюза.

— Аналіз ахопу стыпендыяльным забеспячэннем, у тым ліку ў Брэсцкім дзяржаўным універсітэце імя А.С. Пушкіна, выявіў тэндэнцыю зніжэння паспяховасці навучэнцаў у апошнія гады, — паведаміла лідар студэнцкага прафсаюза. — Мы спрабуем вырашаць гэту праблему комплексна. У нашым універсітэце актывізавалася работа вучэбнай камісіі прафкама. З мінулага навучальнага года ў прафбюро факультэтаў пачалі дзейнічаць вучэбныя сектары. Яны штомесяц правядзяць маніторынг наведвання заняткаў студэнтамі, і па яго выніках сумесна з дэканатам на інфармацыйным стэндзе факультэта вывешваецца спіс прагульшчыкаў. З такімі студэнтамі праводзяцца тлумачальныя размовы і інфармуюцца іх бацькі. Прафбюро і саветы студэнцкага самакіравання факультэтаў стварылі таксама кансультацыйныя цэнтры з кола студэнтаў-выдатнікаў, якія працуюць па прынцыпе «роўны навучае роўнага».

— Стыпендыяльны фонд, зніжкі са сфарміраванага кошту навучання, перавод на навучанне за кошт сродкаў бюджэту, размеркаванне жылых плошчаў у інтэрнатах, арганізацыя санаторна-курортнага лячэння, прымяненне мераў дысцыплінарнага спагнання, адлічэнне з навучальнай установы — вось далёка не поўны пералік пытанняў, у вырашэнні якіх удзел прафсаюзнай арганізацыі мае вырашальнае значэнне, — паведаміў у сваёй прамове на з'ездзе **старшыня ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Аляксандр БОЙКА**. — Тым не менш, нашы праверкі паказалі, што ў некаторых кіраўнікоў на месцах склалася дастаткова спецыфічнае стаўленне да студэнцкіх прафсаюзных арганізацый. Калі справа тычыцца прынцыповых пытанняў, меркаванне прафкама, здараецца, не ўлічваецца, прычым меркаваннем прафсаюзнай арганізацыі не цікавяцца нават у сітуацыях, калі заканадаўства прадпісвае ўзгадняць вырашэнне пытання з прафсаюзам. Такая сітуацыя недапушчальная, і мы не будзем з ёй мірыцца.

Аляксандр Бойка паведаміў, што дзякуючы ўмяшанню прафсаюзнай арганізацыі ўдавалася дабіцца аднаўлення правоў студэнтаў на выплату ім сацыяльных стыпендый, павелічэння ахопу выплатамі для кампенсацыі выдаткаў па найму жылля навучэнцаў, якім не было вылучана месца ў інтэрнаце. Прафсаюзам была праведзена вялікая кансультацыйная работа па пытаннях вылучэння жылой плошчы ў інтэрнатах. У 2009 годзе ўпершыню за апошнія гады была спынена тэндэнцыя змяншэння забяспечанасці месцамі ў студэнцкіх інтэрнатах ВНУ сістэмы Міністэрства адукацыі. Так, пры зніжэнні забяспечанасці з 64,4 працэнта ў 2006/2007 навучальным годзе да 60 працэнтаў у 2008/2009 навучальным годзе, у гэтым навучальным годзе забяспечанасць інтэрнатамі складае 61,6 працэнта ад патрэбы.

— Безумоўна, гэта з'яўляецца вынікам праведзенай работы па будаўніцтве новых студэнцкіх інтэрнатаў, у тым ліку і ў рамках Студэнцкай вёскі — праекта, ідэя якога была агучана на V з'ездзе Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, дзе дадзенае пытанне ўзнімалася нашым прафсаюзам, — дадаў Аляксандр Бойка.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»:

У 2008/2009 навучальным годзе сума зніжак з платнага кошту навучання склала ў ВНУ больш як 3 млрд рублёў, а ў сярэдніх спецыяльных навучальных установах — 0,2 млрд рублёў.

Правам на атрыманне льготнага крэдыту для аплаты навучання ў дзяржаўных ВНУ скарысталіся ў 2009 годзе 2 388 чалавек — гэта маладыя людзі, якія атрымліваюць першую вышэйшую адукацыю на платнай аснове.

Грунвальдская бітва не толькі выхоўвае патрыятызм, але і дапамагае кінуць курыць

Шэсць стагоддзяў таму 15 ліпеня 1410 года адбылася вельмі значная падзея Сярэднявечча: у Грунвальдскай бітве сышліся вялізныя сілы Тэўтонскага ордэна, з аднаго боку, і Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага — з другога. 600-гадовы юбілей перамогі ў гэтай бітве — дата круглая і вельмі сур'ёзная. За апошні тыдзень прайшлі дзве навуковыя канферэнцыі, прысвечаныя Грунвальду — у Інстытуце гісторыі НАН і на гістарычным факультэце БДУ.

Наогул тэма Грунвальдскай бітвы беларускімі навукоўцамі актыўна пачала распрацоўвацца толькі з 90-х гадоў, шмат гадоў яе вывучаюць польскія гісторыкі, але ў навукоўцаў па-ранейшаму вялікая прастора для дыскусій: дзе дакладна было месца бітвы, колькі было ўдзельнікаў, як ішоў ход бітвы, ці ўцякалі літоўскія воіны і гэтак далей. Але беларускія навукоўцы гатовыя паспрабаваць знайсці адказы на некаторыя пытанні:

— Праблем, звязаных з Грунвальдам, шмат. Новыя крыніцы наўрад ці будуць знойдзеныя, але сур'ёзна падысці да гэтай праблематыкі і асвяціць яе, я мяркую, у бліжэйшыя гады беларуская гістарыяграфія ў стане, — лічыць **Георгій ГАЛЕЧАНКА, доктар гістарычных навук, галоўны навуковы супрацоўнік сектара крыніцазнаўства і археалогіі Інстытута гісторыі НАН**.

— Грунвальдская бітва для сярэдніх вякоў з'яўляецца вельмі неардынарнай падзеяй. Перш за ўсё таму, што гэта адна з найбольш буйных бітваў — некаторыя гісторыкі налічваюць армію ордэна ў 35 тысяч, — лічыць **Руслан ГАГУА, кандыдат гістарычных навук, дацэнт Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта**. — Гэта фантастычная колькасць для тых часоў пры іх сістэме фарміравання войска. Хутчэй, лічбы былі меншыя, недзе ў сярэднявечных крыніцах згадваецца пра 12 тысяч, але ўсё роўна гэта была адна з самых вялікіх бітваў Сярэднявечча! Дарэчы, значэнне Грунвальда заключалася ў тым, што змянілася стратэгія вядзення вайны: да гэтага 200 гадоў канфлікты зводзіліся да невялікіх набегаў і невялікіх бітваў да 6 тысяч чалавек, а тут адбылося аб'яднанне сілаў з нанясеннем аднаго ўдару для падпарадкавання краіны.

Таксама ён бачыць значэнне Грунвальда ў тым, што падчас бітвы загінула эліта Тэўтонскага ордэна — каля 600 братоў-рыцараў, знішчана вялікая колькасць коней, што вельмі падарвала магутнасць Ордэна.

Дарэчы, Грунвальдская бітва сёння цікавіць не толькі навукоўцаў, але і сучасных вайскоўцаў. Праўда, больш у выхаваўчым аспекце. Як расказаў **падпалкоўнік Віталь ЧЫРВІНСКІ, начальнік групы ваенна-гістарычнай работы і геральдычнага забеспячэння ваенна-навуковага камітэта Узброеных Сілаў Беларусі,** тэматыка Грунвальдскай бітвы вывучаецца курсантамі Ваеннай Акадэміі і ваенных факультэтаў грамадзянскіх ВНУ ў ходзе засваення будучымі афіцэрамі дысцыпліны «Ваенная гісторыя». Але, на яго думку, ёсць і некаторыя праблемы ў метадычным забеспячэнні:

— У асноўным гэта абумоўлена адсутнасцю адпаведных вучэбна-метадычных распрацовак, недахопам нагляднага матэрыялу і якаснага мультымедыйнага забеспячэння. Аднак у другой палове года плануецца выдаць дапаможнік «Грунвальдская бітва — гістарычныя і ваенна-стратэгічныя аспекты» і, магчыма, частка праблем знімецца.

Ваенна-навуковы камітэт плануе падрыхтаваць серыю плакатаў па беларускай ваеннай гісторыі:

— Кніжку не кожны прачытае, а вось плакат убачыць кожны. Там будзе не толькі Грунвальдская бітва, але і іншыя бітвы беларускага войска. Я лічу, што такія плакаты павінны быць у кожнай вайсковай часці і кожнай ваеннай навуковай установе, — пераканаў падпалкоўнік Віталь Чырвінскі.

Ён жа паведаміў, што пры ўдзеле ваеннага мастака Віктара Ляхара распрацаваны праект памятнага нагруднага знака, прысвечанага 600-годдзю Грунвальдскай бітвы:

— Спадзяюся, што гэты сімвал будзе добрым напамінам беларусам пра іх славутае мінулае, — сказаў Віталь Чырвінскі. — Пакуль праект не зацверджаны, ён толькі прайшоў экспертызу Геральдычнага савета пры Прэзідэнце, але пакуль не вырашана, ці гэта будзе нагрудны знак на ўзроўні Узброеных Сілаў, ці памятны медаль на ўзроўні краіны.

Падпалкоўнік Чырвінскі пераканаты, што вывучэнне Грунвальдскай бітвы мае важнае вучэбна-выхаваўчае значэнне і садзейнічае фарміраванню ў вайскоўцаў дзяржаўна-патрыятычнай свядомасці, але лічыць, што часам маладыя салдаты і афіцэры ведаюць пра Грунвальд болей за старшых па званні:

— Тэма Грунвальдскай бітвы з'явілася ў вучэбнай праграме Ваеннай Акадэміі, ваенных факультэтаў і кафедраў адносна нядаўна, яе праходзілі і ў школьнай праграме, такім чынам пра Грунвальд ведаюць як ваеннаслужачыя тэрміновай службы, так і малодшы і сярэдні афіцэрскі састаў. Тут, верагодна, менш дасведчаным з'яўляецца старшы афіцэрскі састаў, бо, калі яны вучыліся ў школе, пра Грунвальдскую бітву нічога не апавядалася, і ў ваенным вучылішчы таксама такой тэмы не было. І, бывае, калі сустракаешся з палкоўнікамі, яны не ведаюць, што такое Грунвальд. Гэта не іх віна, яны проста трапілі ў такі час, — сказаў Віталь Чырвінскі і звярнуўся з жартам да навукоўцаў: — Так што, бачыце, у дадзеным кірунку поле для працы яшчэ ёсць.

Дарэчы, што тычыцца патрыятычнага выхавання на прыкладзе Грунвальдскай бітвы, то, на думку **Юрыя БОХАНА, доктара гістарычных навук, вядучага навуковага супрацоўніка аддзела гісторыі Беларусі Новага часу Інстытута гісторыі НАН**, нават уцёкі першай лініі ліцвінаў не змяншаюць гераізм нашых продкаў:

— Усе крыніцы сцвярджаюць, што супраць фланга Вітаўта была звернутая асноўная маса войскаў: магчыма, гэта была свядомая пабудова, разлічаная на разгром менш узброенага ліцвінскага фланга, магчыма, асноўныя сілы нямецкіх рыцараў прыцягнуў той факт, што ліцвіны першыя ўступілі ў бітву. Я асабіста не бачу нічога страшнага і ганебнага, калі пад націскам магутнага праціўніка ваяры кінуліся наўцёкі. Прычым, па ўсёй верагоднасці, на ўцёкі кінулася толькі першая лінія, — сказаў Юры Мікалаевіч і дадаў, што не варта гэты факт замоўчваць у падручніках. — Будзе не зусім прыстойна, калі правай рукой пісаць адно, а левай — другое. Нашы студэнты чытаюць не толькі падручнікі, але і навуковыя працы, і калі там будуць розныя звесткі, то маладыя людзі прыйдуць і зададуць пытанне прафесару: «Дзе вы былі шчырыя: калі пісалі падручнік ці манаграфію?». Мне падаецца, мы трошачкі ўтрыравана разумеем гераізм: як у сталінскія часы — калі трапіў у палон ці адступіў, то, значыць, загінуў. Ёсць іншы гераізм — гераізм памерці, гераізм адступіць і зноў вярнуцца ў бітву. Той факт, што мы так доўга ваявалі і ўзялі такі чынны ўдзел у гэтай бітве, сам па сабе з'яўляецца гераізмам.

А вось **Павел ЛОЙКА, кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў БДУ**, заявіў, што Грунвальдская бітва для яго мае не толькі прафесійнае значэнне, але і асабістае:

— У 1995 годзе мы з маім швагрaм выйшлі на балкон, і я кажу: «Міхась, дай цыгарэтку». Узяў, а потым зноў кажу: «Ты ведаеш, не! Вось ніхто нічога не ўспомніў пра Грунвальд сёння, то я засведчу гэты момант — кіну паліць!». Дарэчы, з 15 ліпеня 1995 года я не выкурыў ніводнай цыгарэты!

Павел БЕРАСНЕЎ.

БЕЛОРУССКИЙ ИНДУСТРИАЛЬНЫЙ БАНК

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2010 года

ОАО «БЕЛОРУССКИЙ ИНДУСТРИАЛЬНЫЙ БАНК»

220004, г. Минск, ул. Мельникайте, 8

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.04.2010 г.	01.04.2009 г.
1	2	3	4	5
1	**АКТИВЫ**			
2	Денежные средства	1101	10 540,6	10 736,2
3	Средства в Национальном банке	1102	6 027,3	8 747,2
4	Ценные бумаги:	1103	17 401,8	2 904,8
	для торговли	11031	4 071,5	2 904,8
	удерживаемые до погашения	11032	0,0	0,0
	в наличии для продажи	11033	13 330,3	0,0
5	Кредиты и другие средства в банках	1105	16 904,9	23 680,8
6	Кредиты клиентам	1106	81 544,9	68 252,8
7	Долгосрочные финансовые вложения	1107	0,0	0,0
8	Основные средства и нематериальные активы	1108	30 345,8	25 075,1
9	Прочие активы	1109	2 936,4	1 392,5
10	**ИТОГО активы**	**110**	**165 701,7**	**140 789,4**
11	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**			
12	Средства Национального банка	1202	0,0	1 991,9
13	Кредиты и другие средства банков	1205	15 003,5	11 326,2
14	Средства клиентов	1206	86 820,4	75 455,8
15	Ценные бумаги, выпущенные банком	1208	11 993,9	5 534,1
16	Прочие обязательства	1209	1 021,5	3 754,8
17	**ВСЕГО обязательства**	**120**	**114 839,3**	**98 062,8**
18	**КАПИТАЛ**			
19	Уставный фонд	1211	22 323,9	19 989,1
20	Эмиссионные разницы	1212	0,0	0,0
21	Резервный фонд	1213	1 123,2	3 018,8
22	Накопленная прибыль	1214	8 662,0	5 581,9
23	Фонд переоценки статей баланса	1215	18 753,3	14 136,8
24	**ВСЕГО капитал**	**121**	**50 862,4**	**42 726,6**
25	**ИТОГО обязательства и капитал**	**12**	**165 701,7**	**140 789,4**
26	**ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ**			
27	Требования	1301	128 701,3	49 447,5
28	Обязательства	1302	23 972,9	31 866,7

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 апреля 2010 года

ОАО «БЕЛОРУССКИЙ ИНДУСТРИАЛЬНЫЙ БАНК»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.04.2010 г.	01.04.2009 г.
1	2	3	4	5
1	Процентные доходы	2011	6 187,1	3 906,0
2	Процентные расходы	2012	2 449,7	2 201,3
3	**Чистые процентные доходы**	**201**	**3 737,4**	**1 704,7**
4	Комиссионные доходы	2021	1 676,7	2 099,1
5	Комиссионные расходы	2022	243,9	148,8
6	**Чистые комиссионные доходы**	**202**	**1 432,8**	**1 950,3**
7	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	203	1 507,9	852,6
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	43,4	3,5
9	Доход в форме дивидендов	205	0,0	0,0
10	Чистые отчисления в резервы	206	212,3	-49,5
11	Прочие доходы	207	213,0	974,7
12	Операционные расходы	208	4 142,4	3 551,0
13	Прочие расходы	209	493,7	440,8
14	Налог на прибыль	210	516,1	491,3
15	**ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)**	**2**	**1 570,0**	**1 052,2**

И.о. Председателя Правления **Д.М. Богуш**

Главный бухгалтер **Н.А. Кузьмицкая**

Лицензия НБ РБ на осуществление банковской деятельности № 20 от 30.11.2009 г., ОАО «Белорусский Индустриальный Банк». УНП 100195493.

Шануй сваё!

ДАЛУЧАЙСЯ ДА РЭСТАЎРАЦЫІ НАВАГРАДСКАГА ЗАМКА!

18 красавіка — Міжнародны дзень помнікаў і гістарычных мясцінаў. Напярэдадні на прэс-канферэнцыі, што прайшла ў Нацыянальным прэс-цэнтры, намеснік міністра культуры Тадэвуш Стружэцкі расказаў пра захады, якія прымае дзяржава для захавання спадчыны ў нашай краіне.

У Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцяў Беларусі сёння адзначаны 4911 аб'ектаў спадчыны (з іх 4779 нерухомыя, 73 рухомыя і 59 нематэрыяльныя). Штогод гэты спіс папаўняецца на 30—50 новых аб'ектаў, якія бярэцца пад ахову дзяржавы. Летась Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Беларусі выдадзены асобнай кнігай і разасланы ва ўсе дзяржаўныя ўстановы, органы мясцовай улады.

Падрыхтаваны шэраг прапаноў, якія тычацца захавання, выкарыстання, уцягнення ў турыстычныя праекты сядзібных комплексаў. У поле зроку трапілі занядбаныя сядзібы, гістарычныя палацы, якія знаходзяцца ў вёсках і малых гарадскіх населеных пунктах. Сумесна з абласнымі выканкамамі прааналізаваны іх стан і падрыхт

ПАВЯЛІЧВАЕЦЦА ПОПЫТ НА СУЧАСНЫЯ КВАТЭРЫ Ў ПРЫГАРАДЗЕ СТАЛІЦЫ

Сяргей КУРКАЧ

Аналіз развіцця жыллёвага рынку сталічнага рэгіёна прапанавала рэдакцыі дырэктар РДУП «Дзяржаўнае рыэлтарскае агенцтва па г. Мінску і Мінскай вобласці» Валянціна КРАСНІКАВА.

Новабудоўля Мінска ўпэўнена даражэе

У матэрыяле за 9 красавіка мы паведамлялі пра тое, што кошт квадратнага метра другаснага жылля сталіцы за першыя тры месяцы патаннеў больш як на працэнт. У той жа час на жыллёвым рынку актывізуецца новая тэндэнцыя, калі пачынае даражэць новае камерцыйнае жыллё, у тым ліку па лініі долевага будаўніцтва. Спецыялісты адзначаюць, што за квартал сёлета жыллё не для чаргавікоў у Мінску падаражэла ўжо на 3 працэнты. Між іншым, і сёння цэны пры будаўніцтве новага жылля застаюцца больш прывабнымі на жыллёвым рынку Мінска.

Нагадаю, што сярэдні кошт квадратнага метра ўсіх тыпаў кватэр на другасным рынку складае сёння 1530—1450 долараў. У Савецкім раёне па падобным кошце ў рангу новага жылля прапануецца толькі некалькі элітных жыллёвых аб'ектаў, а астатнія маюць меншы цэннік. Напрыклад, у жылым доме па вуліцы Беларускай жыллёвы квадрат кватэр каштуе 1500 долараў. Прапануюцца кватэры ў новабудоўлі па вуліцы Я. Коласа, 34, дзе кошт квадратнага метра жылля складае 1560 долараў.

За 1100 долараў за квадратны метр прапануюцца кватэры ў жылым комплексе «Прэстыж» па вуліцы Бялінскага і ў жылым доме па вуліцы Кальцова. Аб'екты будуць здадзеныя ў эксплуатацыю адпаведна ў другім і чацвёртым квартале наступнага года. Даволі прывабны дом будуецца цяпер у квартале вуліца Лук'яновіча — завулак Усходні — вуліца Літаратурная. Адна секцыя дома там будзе здадзена ўжо сёлета. Кошт ад 1050 да 1150 долараў за квадратны метр. Кліентам прапануецца будаўніцтва сучасных кватэр па вуліцы Платонава, 21—1, дзе кошт квадратнага метра складае 4 млн 200 тысяч рублёў. А вось у жылым комплексе «Дынастыя» на Лагойскім тракце квадратны метр кватэр каштуе 3 млн 96,79 тысячы рублёў. Дом будзе здадзены ў апошнім квартале сёлета.

Самае дарагое жыллё сёння прапануецца кліентам у Першамайскім раёне па праспекце Незалежнасці 85 Б. Кватэры ў гэтым элітным доме каштуюць ад 1700 да 3000 долараў за квадратны метр. Прадае іх акцыянернае таварыства «Белрэканструкцыя». Выстаўлены на продаж кватэры ў элітным доме па вуліцы Калініна, 7а, дзе квадратны метр каштуе ад 1500 да 1700 долараў.

Цяпер будуюцца дамы павышанай камфортнасці ў квартале вуліц Сурганава — Акадэмічная. Кошт квадратнага метра жылля 1400 долараў. Увогуле забудоўшчыкам Першамайскага раёна падабаецца музычная тэма. У наступным годзе будзе здадзены ў эксплуатацыю жылы комплекс «Вівальдзі» прэміум-класа па вуліцы Гінтаўта. Кошт квадратнага метра ад 1320 да 1430 долараў. Працягваюць прадаваць кватэры ў 151-кватэрным доме ў мікрараёне Уручча-6 па вуліцы Шафарнянскай. Там квадратны метр жылля каштуе 3 млн рублёў. У Партызанскім раёне цяпер прапануецца двухпавярховы дом па вуліцы Дзвінская, 17. Кошт квадратнага метра кватэр складае 1070 долараў.

У Маскоўскім раёне самае дарагое новае жыллё прапануецца па вуліцы Шорная. Квадратны метр кватэр гэтага элітнага дома каштуе 1750 долараў. У мікрараёне «Новая Грушаўка» пабудаваны дом па вуліцы Шчорса, дзе квадратны метр каштуе ад 1250 да 1350 долараў. А вось у мікрараёне «Брылевічы-2» па вуліцы Ежы Гедройца ў новым доме кватэры каштуюць ад 1100 да 1150 долараў за квадратны метр. У чацвёртым квартале сёлета будзе здадзены дом жылога комплексу «Дружны» па вуліцы Напалеона Орды. Квадратны метр кватэр там прапануецца за тысячу долараў. Самае таннае камерцыйнае жыллё ў Маскоўскім раёне прапануецца ў жылым доме па вуліцы Высокай. Дом будзе здадзены ў эксплуатацыю ў першым квартале 2011 года, а кошт кватэр складае 2 млн 970 тысяч рублёў за квадратны метр. У Ленінскім раёне даволі дарагі жылы комплекс бізнэс-класа «Кантынент» прапануецца кліентам на Партызанскім праспекце, 19а, дзе новыя сучасныя кватэры каштуюць ад 1500 да 2000 долараў за квадратны метр. На праспекце Ракасоўскага, побач з кінатэатрам «Салют», пабудаваны шматпавярховы жылы дом, у якім кватэры прадаюцца па 1350 долараў за жыллёвы квадрат.

Самы маленькі цэннік трымаецца на кватэры ў новабудоўлях Заводскага раёна. Двух- і трохпакаёвыя кватэры ў жылых дамах па вуліцы Крупскай каштуюць 3 млн 195 тысяч рублёў за квадратны метр. Жыллё ў шматкватэрным жылым доме па вуліцы Хабараўскай прапануецца па кошце ад 900 да 1000 долараў за жыллёвы квадрат. Сёлета ў верасні будзе пабудаваны жылы дом па вуліцы Адэскай. У ім квадратны метр будзе каштаваць новым гаспадарам ад 2 млн 690 тысяч да 3 млн 330 тысяч рублёў.

У Смалявічах і Заслаўі будуецца таннейшае жыллё

На фоне падаражання камерцыйнага жылля ў сталіцы жыхары Мінска ўсё часцей прыглядаюцца да невялікіх гарадкоў побач з мегаполісам краіны. Сацыяльная інфраструктура такіх гарадкоў як Заслаўе, Жодзіна, Смалявічы, Бараўляны, а таксама бліжэйшых вёсак пачынае дасягаць сталічных стандартаў. Яшчэ адным прывабным фактарам прыгарада з'яўляецца развітая сетка грамадскага транспарту і наяўнасць уласных аўтамабіляў.

Валянціна Краснікава адзначае, што ў прыгарадзе сталіцы будуюць сабе жыллё ўжо не толькі тыя людзі, у каго не хапае фінансаў для набыцця кватэры ў Мінску, а і такія кліенты, якія больш увагі звяртаюць на экалогію рэгіёна. Пытанне цаны тут таксама існуе.

Напрыклад, у жылым комплексе новабудоўлі г. Смалявічы па вуліцы Маскоўскай кватэры каштуюць 790 долараў за квадратны метр. Дом будзе здадзены ў другім квартале сёлета. Прапануюцца ў Смалявічах кватэры ў цёплым цагляным доме, дзе кошт жыллёвага квадрата дасягае 850 долараў. У жылым комплексе «Дабрадзеева» вёскі Тарасава па вуліцы Ратамская кошт кватэр складае 900 долараў за квадратны метр. Дом будзе здадзены сёлета ў снежні. Новы сучасны дом пабудаваны ў Жодзіне па вуліцы Каліноўскага, у ім квадратны метр каштуе 900 долараў. Прадаюцца кватэры ў вёсцы Зарэчча па кошце ад 605 да 790 долараў за квадратны метр. Выстаўлены на продаж кватэры ў сучасным доме пасёлка Калодзішчы. Жыллё каштуе ад 850 да 900 долараў за квадратны метр.

У жылым комплексе «Лясная казка», што ў пасёлку Азярыцкая Слабада (9 км ад МКАД) кватэры каштуюць 2 млн 700 тысяч рублёў за квадратны метр.

ПРАФСАЮЗЫ ЗАПАТРАБАВАЛІ ПАВЫШЭННЯ ЗАРОБКУ Ў САЦЫЯЛЬНАЙ СФЕРЫ

Пра гэта падчас камандзіроўкі ў горад Нароўля Гомельскай вобласці заявіў Леанід КОЗІК, старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі.

— Мы правялі нядаўна пасяджэнне нацыянальнага савета і паставілі перад урадам Беларусі пытанне прама — пара павышаць заробкі ў сацыяльнай сферы, — кажа спадар Козік. — І не трэба чакаць снежня, каб даць справаздачу, што мы выйшлі на нейкую там велічыню заработнай платы. Патрэбна сёння вырашыць гэтае пытанне. Людзям жыць трэба сёння. І я ведаю, што пасля гэтай нарады прэм'ер-міністр сабраў пасяджэнне, і дадзена ўказанне рыхтаваць адпаведны дакумент.

— Разам з тым, мы разумеем, што крызіс моцна паўплываў на прадпрыемствы, — адзначае Ленід Козік. — І ФПБ патрабуе, каб кошты на самыя значныя тавары заставаліся прыкладна на тым узроўні, на якім яны зараз ёсць. І кошты паслуг ЖКГ таксама. Але мы разумеем, што ведамствы не вытрымаюць такога ціску коштаў і ім давядзецца іх падымаць. Аднак мы патрабуем, каб заробак ішоў апераджальнымі тэмпамі. Прафсаюз не падпісаў ніводнага дакумента, які б скасоўваў гэтыя дамоўленасці.

Нагадаем, што па звестках Нацыянальнага статыстычнага камітэта Беларусі сярэдні заробак па краіне ў сферы культуры і мастацтва складае 777 095 рублёў, адукацыі — 736 474, аховы здароўя — 794 997, сацыяльнага забеспячэння — 612 988 рублёў.

Настасся ЗАНЬКО.

Грошы

УКЛАДЫ ПА-РАНЕЙШАМУ ЦІКАВЯЦЬ

НЯГЛЕДЗЯЧЫ НА ПЭЎНАЕ ЗНІЖЭННЕ ДАХОДНАСЦІ ДЭПАЗІТАЎ, АБ'ЁМ ПРЫЦЯГНУТЫХ БАНКАМІ СРОДКАЎ НАСЕЛЬНІЦТВА РАСЦЕ

Ігар ШЧУЧЭНКА

Што цалкам зразумела, таму што прапаноў на дэпазітным рынку шмат, і ўкладчыкам ёсць з чаго выбіраць, каб памножыць свае зберажэнні, а прывабнасць захавання свабодных сродкаў у банках відавочная. Тым не менш трэба канстатаваць, што за апошні час працэнтныя стаўкі па дэпазітах у параўнанні з леташнімі пакрысе змяншаюцца. Паступовае зніжэнне банкамі працэнтных ставак, як вядома, рэалізоўваецца згодна з рэкамендацыямі галоўнага банка краіны. Нагадаем, што паводле прагнозаў апошняга, да канца года стаўкі на новых рублёвых дэпазітах прадугледжваюцца на ўзроўні 10—13 працэнтаў гадавых пры ўмове выканання тэмпаў інфляцыі, узровень якой сёлета, як мяркуецца, не павінен выйсці за межы ў 8-10 працэнтаў.

А пакуль, калі браць сакавік і пачатак красавіка, даходнасць дэпазітаў упала нязначна. Так, у прыватнасці, па рублёвых укладах у шэрагу банкаў працэнтныя стаўкі страцілі каля 1-2 працэнтаў. Што ж датычыцца даходнасці валютных дэпазітаў, то яна зменшылася і таго менш, улічваючы, што ўжо ў мінулым годзе, у адрозненне ад рублёвых, укладчыкі ў замежнай СКВ гублялі сваю прывабнасць з-за зніжэння працэнтаў па іх. Сёлета ж асобныя банкі «асадзілі» назад па валютных дэпазітах яшчэ каля 0,5—1,5 працэнта. Разам з тым, верхняя мяжа даходнасці дэпазітаў у доларах і еўра на працяглыя тэрміны захоўвання ў асобных банках даходзіць нават да 10-11 працэнтаў, але ў большасці яна не вышэй за 8 працэнтаў гадавых. А вось даходнасць тэрміновых укладаў у нацыянальнай валюце істотна перавышае валютныя зберажэнні, стаўкі па іх вагаюцца ад 20 да 23 працэнтаў. Мабыць, таму ў студзені-сакавіку беларусы больш ахвотна і размяшчалі ў банках грашовыя сродкі ў рублях, а дэпазіты ў замежнай валюце спасавалі перад укладамі ў нацыянальнай. Гэта пацвярджаецца апошнімі звесткамі, якія прадставіла Упраўленне інфармацыі Нацыянальнага банка. Згодна са звесткамі галоўнага банка краіны, за першы квартал аб'ём прыцягнутых банкамі грашовых сродкаў насельніцтва ў рублях і валюце (уключаючы аб'ём выпушчаных для фізічных асобаў аблігацый, сертыфікатаў і сродкаў нерэзідэнтаў) павялічыўся больш як на 1,56 трыльёна рублёў і склаў на пачатак красавіка звыш 20,32 трыльёна рублёў (напачатку мінулага месяца людзі трымалі ў банках амаль 19,33 трыльёна рублёў). Прычым сродкі ў нацыянальнай валюце за тры месяцы ўзраслі на 875,67 мільярда рублёў, ці на 10,8 працэнта, а ў замежнай — на 692,13 мільярда рублёў, ці на 6,5 працэнта. Як прадугледжваецца Асноўнымі напрамкамі грашова-крэдытнай палітыкі, у гэтым годзе прырост дэпазітаў фізічных асобаў складзе 5,6—7,2 трыльёна рублёў.

ЗАБОЙСТВА НА ХУТАРЫ

Жудаснае забойства днямі адбылося на хутары паміж вёскамі Сурынка і Забулле Слонімскага раёна. Невядомыя ўначы прыйшлі на хутар, дзе ў доме жылі дзве жанчыны-пенсіянеркі — Ніна і Яўгенія Навумчыкі.

Паводле слоў сваякоў жанчын і вяскоўцаў, бандыты праз акно залезлі ў дом да хутаранак і, магчыма, запатрабавалі ў іх грошы. Але, мусіць, нічога каштоўнага яны не атрымалі, бо ў пакоях перавярнулі ўсё дагары нагамі. Што ім удалося знайсці і забраць, пакуль невядома. Пасля ўсяго забойцы зарэзалі жанчын і зніклі.

Паводле слоў жыхароў суседніх вёсак, сёстры Навумчыкі трымалі добрую гаспадарку: карову, авечак, курэй. Рабаўнікі да іх на хутар прыходзілі не аднойчы, мяркуючы, што ў іх ёсць грошы. Але жанчынам неяк удавалася ад нечаканых гасцей адбіцца. Аднойчы пенсіянеркі на дапамогу выклікалі міліцыю.

На гэты раз бандыты дзейнічалі нахабна і жорстка.

Мёртвых жанчын раніцай знайшоў мясцовы малаказборшчык, які прыехаў па малако, але на панадворку нікога не было. Ён зайшоў у хату, дзе і ўбачыў забітых жанчын. Хутка выклікаў міліцыю, якая пачала шукаць забойцаў. Затрыманы двое падазроных — 20-гадовы і 40-гадовы мужчыны.

Сяргей ЧЫГРЫН. Фота аўтара.

ХАКЕЙНАЕ «ДЫНАМА» ПАЗБАВІЛАСЯ АД ЛЕГІЯНЕРАЎ І ВЯРТАЕ ЛІТАРУ «Д»

У наступным сезоне ў камандзе могуць з'явіцца Аляксей Калюжны і Сяргей Касціцын

Новы сезон хакейны клуб «Дынама-Мінск» пачынае з новым кіраўніцтвам. Гэта расійскі спецыяліст Сяргей Каткоў, які стаў генеральным дырэктарам і запрасіў на пасаду галоўнага трэнера чэха Марэка Сікору. Дапамагаць галоўнаму трэнеру будуць Аляксандр Андрыеўскі і Анатоль Чысцякоў. Паводле слоў Сяргея Каткова, Андрыеўскі пагадзіўся на паніжэнне, бо не мае вялікага вопыту для вырашэння сур'ёзных задач. Анатоль Чысцякоў — расійскі трэнер, які дапамагаў Марэку Сікоры ў магнітагорскім «Металургу» і «Аўтамабілісце» з Екацярынбурга.

З мінулагодніх легіянераў у «Дынама» застануцца толькі Джэф Плат, кантракт якога падпісаны да 2011 года, і, магчыма, абаронца Д'юві Уэскат. «Уэскат папрасіў некаторыя дадатковыя ўмовы да свайго кантракта. У прыватнасці, няньку для свайго наванароджанага дзіцяці. Мяркую, мы выканаем гэтыя ўмовы і падпішам кантракт», — расказаў Сяргей Каткоў. Тут ён заявіў, што гэтым спіс легіянераў, якія гулялі летась, і абмяжоўваецца. Генеральны дырэктар з галоўным трэнерам наведаюць чэмпіянат свету і там паназіраюць за некаторымі гульцамі, у прыватнасці, шведскім хакеістам Андэрсанам. Праўда, шанцаў у іх трапіць у «Дынама», відаць, няшмат. «Я маю на руках сур'ёзнае медыцынскае заключэнне аб стане здароўя Віле Пелтанена. Мы з Марэкам у курсе, які гэта быў баявіты капітан, але мы павінны падумаць, можам мы рызыкаваць, ці не. Ёсць падставы меркаваць, што такія траўмы ў яго ўзросце, а яму 37, не аднаўляюцца», — расказаў Сяргей Каткоў.

Затое з беларускіх хакеістаў у «Дынама» застануцца амаль усе. Сяргей Каткоў агучыў імёны Мялешкі, Кулакова, Дзянісава, Міхалёва, Стася, Антонава, Варламава, Качаткова, Чупрыса і Задзялёнава. У варатарскай лініі пакуль няма яснасці. Кантракт Андрэя Мезіна заканчваецца 30 красавіка, і яго перспектывы будуць залежаць ад гульні на чэмпіянаце свету — гэтак жа, як і Віталя Коваля (праўда, у яго кантракт яшчэ на год). Акрамя таго, на гэтую пазіцыю разглядаецца яшчэ тры кандыдатуры, адзін з варатароў гуляе ў НХЛ.

Здаецца, курс на вяртанне беларускіх хакеістаў узяты ў «Дынама» і ў наступным сезоне будзе ўвасабляцца ў жыццё. Цалкам верагодна, што ў камандзе з'явіцца Аляксей Калюжны, Сяргей Дзямагін ці Сяргей Касціцын. «Я размаўляў з усімі беларускімі гульцамі, якія гуляюць у КХЛ. Гэта і Угараў, і Калюжны, і Дзямагін, і Кальцоў. Хтосьці катэгарычна адмовіўся адразу, хтосьці звязаны кантрактам (гэта Косця Кальцоў), Дзямагін пакуль думае. Калюжны пагадзіўся спачатку, але на наступны дзень патэлефанаваў яго агент і сказаў, што ў іншым клубе ім прапануюць удвая большыя грошы. Так што Аляксей пакуль думае. Мы нават тройку пад Калюжнага пачалі фарміраваць. Я дамовіўся і з Сяргеем Касціцыным, і калі «Манрэаль Канадзіенс» не прапануе яму аднабаковы кантракт, ён гатовы разглядаць нашу прапанову. Аднак гэта таксама будзе нятанны гулец», — падзяліўся Сяргей Каткоў.

Да радасці шматлікіх прыхільнікаў «Дынама», на эмблему клуба вернецца літара «Д». «У «Дынама», якому 85 гадоў, свае багатыя традыцыі. Я звярнуў увагу, што некалькі гадоў таму гэты надпіс прыбрала з формы маскоўскае «Дынама», але своечасова адумалася і вярнула. Рыжане пры ўсёй іх насцярожанасці таксама захавалі назву. Чаму мы павінны парушаць традыцыі, якім не адзін дзясятак гадоў?». Сяргей Каткоў паведаміў, што заказаў вытворцу формы расійскай кампаніі «Луч» некалькі варыянтаў з лагатыпам «Дынама» на грудзях, і, магчыма, галава зубра на форме ўсё ж застанецца на плячы ці іншых месцах.

Сяргей Каткоў паведаміў, што меў размову з усімі гульцамі «Дынама» і ўсім задаў адно і тое ж пытанне: што не дазволіла камандзе трапіць у плэй-оф? І атрымаў шэраг самых розных адказаў. «Пры такой наяўнасці недахопаў вырашыць пастаўленую задачу было амаль немагчыма. Высветлілася, што гульцы падзяліліся на дзве-тры групоўкі. Таму адна з нашых задач — згуртаваць хакеістаў», — паведаміў генеральны дырэктар. Сярод метадаў былі названыя традыцыйныя шашлыкі і вячэры з сем'ямі, паездкі да шахцёраў і спусканне ў шахту.

Новы галоўны трэнер каманды Марэк Сікора пакуль асвойваецца ў «Дынама» і беларускай сталіцы. «Я бачу прыгожы горад, добрае надвор'е. У мяне ўжо ёсць кватэра ў 20—25 хвілін хады пешшу да арэны, гэтак як я і хацеў. Класна зрабілі. Прадукты паглядзеў — добрыя. Ведаю, што ў «Дынама» за 2 гады змянілася 5 трэнераў. Мяркую, што са мной атрымаецца лепш», — падзяліўся пан Сікора.

Наконт манеры гульні каманды трэнер выказаўся наступным чынам: «Будзем гуляць па сітуацыі. Я не хачу сказаць, што мы будзем дзейнічаць у адкат, але я той трэнер, які на першае месца ставіць гульню ў абароне. Абарона — гэта вынік. Прычым гульня ў абароне датычыць кожнага хакеіста — і абаронцы, і нападаючага. Так у мяне было ў Екацярынбургу, і ў многім дзякуючы гэтаму ўдалося дасягнуць выніку з камандай, патэнцыял якой ніжэйшы за мінскае «Дынама».

Алена АЎЧЫННІКАВА.

РАСКРЫТАЕ ЗАБОЙСТВА ЖАНЧЫН У МАГІЛЁВЕ

Дзве сяброўкі, чые раздзеленыя целы былі знойдзеныя на вуліцы Фаціна 23 і 31 сакавіка, як мяркуецца, сталі ахвярамі 40-гадовага мясцовага жыхара.

Як паведамілі ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў, цяпер можна з упэўненасцю сцвярджаць, што чуткі, якія хадзілі наконт з'яўлення «фацінскага» маньяка і серыйнасці забойстваў, не мелі пад сабой ніякай глебы. Рэальнасць аказалася куды больш «празаічнай», бо цяжкае злачынства было ўчыненае падчас сумеснага распіцця спіртнога ахвярамі і іх забойцам. Загінулыя вялі асацыяльны чын жыцця. Пасля таго, як была ўстаноўлена асоба адной з іх — 35-гадовай непрацуючай магіляўчанкі, якая злоўжывала спіртным, высветлілася, што яна знікла 13 сакавіка. Разам з ёй знікла і яе сяброўка, 40-гадовая жыхарка гэтага ж горада. Падчас расследавання па падазрэнні ва ўчыненні расправы над жанчынамі быў затрыманы 40-гадовы мясцовы жыхар, у кватэры якога і адбылося забойства.

Ігар ГРЫШЫН.

Минский городской центр недвижимости

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 29 АПРЕЛЯ 2010 ГОДА ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

по продаже права заключения договоров аренды (сроком на 5 лет) специфических сооружений, предоставляемых в аренду для размещения объектов сезонной мелкорозничной торговли плодоовощной продукцией в г. Минске

№ лота	Адрес специфического сооружения для размещения объекта сезонной мелкорозничной торговли плодоовощной продукцией	Арендуемая площадь, кв. м	Начальная цена, тыс. руб.
Ленинский район г. Минска, т. 223-81-41, 223-89-21			
1.	ул. Белорусская, 17, место № 1	5	1000
2.	ул. Белорусская, 17, место № 2	5	1000
Октябрьский район г. Минска, т. 224-49-95, 224-59-12			
3.	ул. Кижеватова, 72, место № 4	5	1000
4.	ул. Кижеватова, 72, место № 6	5	1000
5.	ул. Кижеватова, 72, место № 7	5	1000
6.	ул. Кижеватова, 72, место № 8	5	1000
7.	ул. Кижеватова, 72, место № 9	5	1000
8.	ул. Кижеватова, 72, место № 10	5	1000
9.	ул. Ф. Скорины, 16	5	1000
Партизанский район г. Минска, т. 294-70-94, 294-61-44			
10.	ул. Калиновского, 12	5	1000
Первомайский район г. Минска, т. 280-54-65, 287-30-42			
11.	ул. Седых, 66-68, место № 1	5	1000
12.	ул. Кульман, 39	5	1000
13.	ул. Иодковская, 36 (микрорайон Цна)	5	1000
14.	ул. Платонова, 34-36, место № 1	5	1000
Советский район г. Минска, т. 292-81-80, 292-13-93			
15.	ул. Колесникова, 23	5	1000
16.	ул. М. Танка, 16, место № 2	5	1000
Центральный район г. Минска, т. 306-42-95			
17.	ул. Гая, 29	5	1000
18.	ул. Кропоткина, 42, место № 3	5	1000

Аукцион состоится 29 апреля 2010 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Документы на участие принимаются с 19 по 27 апреля 2010 г. в рабочее время, 28 апреля 2010 г. с 9.00 до 16.00 (обеденный перерыв 13.00 – 14.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Документы, поданные после указанного времени, не рассматриваются.

Телефон для справок (017) 227 40 22; www.mgcn.by.

Организатор аукциона – УП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы: заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с объектом недвижимости, право заключения договора аренды которого выставлено на торги; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесение задатка.

Задаток в размере 10 процентов от начальной цены заявленного лота перечисляется **на расчетный счет 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, код 153001331, УНП 190398583 УП «Минский городской центр недвижимости».** Перечень и порядок подачи документов для участия в аукционе определены Инструкцией о порядке организации и проведения торгов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в коммунальной собственности г. Минска, утвержденной решением Мингорсовета от 23.09.2009 № 250.

Оплата за право заключения договора аренды осуществляется победителем аукциона разовым платежом в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона. Договор аренды с победителем аукциона заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Победитель аукциона в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона обязан возместить УП «Минский городской центр недвижимости» затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом торгов под роспись.

В соответствии с решением Мингорисполкома от 04.09.2003 № 1563 «О функционировании объектов мелкорозничной торговой сети» мелкорозничная торговля плодоовощной продукцией носит сезонный характер и осуществляется с 1 марта по 1 декабря. Указанный срок может быть изменен с учетом климатических условий.

Информация о проведении соответствующих аукционов была опубликована в газетах «Звязда» от 11.02.2010 и «Вечерний Минск» от 11.02.2010 и 12.02.2010.

Доктар адкажа

Ёсць пытанні? Тэлефануйце...

«Гарачая» лінія ўпраўлення аховы здароўя Мінаблвыканкама (017) 220 20 25

19 красавіка — старшыня Мінскай абласной МРЭК Васіль Васільевіч ІЛЬЯШЭВІЧ.

20 красавіка — намеснік галоўнага ўрача Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы Ігар Віктаравіч ЛАЗАРЧЫК.

21 красавіка — загадчык арганізацыйна-метадычнага кабінета Мінскага абласнога супрацьтуберкулёзнага дыспансэра Тамара Паўлаўна МАЦЮКЕВІЧ.

22 красавіка — загадчык траўматалагічнага гнойнага аддзялення Мінскай абласной клінічнай бальніцы Канстанцін Яўгенавіч ХАХЕЛЬКА.

23 красавіка — намеснік галоўнага ўрача Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы Аляксандр Іванавіч КАРАНЕВІЧ.

У графіку магчымыя змяненні.

На наступным тыдні дзяжурыць на «гарачай» лініі Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць:

19 красавіка — галоўны ўрач Мінскай абласной клінічнай бальніцы Юрый Мікалаевіч ЛАДУЦЬКА.

20 красавіка — дырэктар РНПЦ неўралогіі і нейрахірургіі Андрэй Леанідавіч ТАНІН.

21 красавіка — дырэктар РНПЦ пульманалогіі і фтызіятрыі Генадзь Львовіч ГУРЭВІЧ.

22 красавіка — дырэктар Цэнтра экспертыз і выпрабаванняў у ахове здароўя Аляксандр Юр'евіч СТАЛЯРОЎ.

23 красавіка — галоўны ўрач Мінскага абласнога скурна-венералагічнага дыспансэра Людміла Аляксандраўна КАЛАСКОВА.

У графіку магчымыя змяненні.

Лечымся без лекаў

Залатыя чародкі гаючага падбелу

У красавіку, як толькі растае снег, на берагах рэчак і ўзбочынах дарог, на пясчаных глебах і чыгуначных насыпах зацвітае падбел. Яркія жоўтыя кветкі на голай яшчэ зямлі відаць здалёк. Падбел крыху падобны на дзьмухавец. Такі ж жоўты, але кветкі драбнейшыя. І ў дзьмухаўца спачатку з'яўляюцца лісцікі, а ўжо потым кветкі. А ў падбелу, наадварот, спачатку распусцяцца кветкі, а ўжо потым з'явіцца лісце, пакрытае спадыспаду белымі варсінкамі.

Падбел — лекавая расліна. Яе гаючыя ўласцівасці былі вядомыя яшчэ шмат стагоддзяў назад. Старажытныя рымляне і грэкі называлі яго tussilago — «кашлягон» (ад лацінскіх слоў tussis — кашаль і ago — праганяць). Сваю рускую назву «мать-и-мачеха» расліна атрымала за характэрную асаблівасць лісця: зверху — халоднага і гладкага (асацыюецца са злоснай мачахай), знізу — пушыстага і цёплага (нагадвае пяшчотныя дотыкі маці).

Лекавыя ўласцівасці падбелу абумоўленыя багатым хімічным складам. Так, арганічныя кіслоты (яблычная, галавая, вінная), а таксама аскарбінавая і сапаніны аказваюць супрацьзапаленчы і антытаксічны эфект; эфірны алей і слізістыя рэчывы — абвалакальнае і змякчальнае дзеянне, дубільныя рэчывы і караціноіды ўзмацняюць супрацьзапаленчы эфект.

Настой лісця падбелу — лепшы сродак пры прастудным кашлі, ларынгіце, бранхіце, пнеўманіі, бранхіяльнай астме і сухотах. Ён змяшчае вязкасць макроты, аблягчае яе аддзяленне і стымулюе адхаркванне. Карысная гэтая расліна і пры запаленчых захворваннях страўнікава-кішачнага тракта і мачавога пухіра, дэрматыце, дыятэзе; эфектыўная яна пры ацёках і скурным свербе. Падбел можа дапамагчы і тым, хто хоча пазбавіцца ад сухой себарэі і ўмацаваць валасы. А мужчынам з вельмі адчувальнай скурай можна прымяняць настоі і адвары гэтай расліны ў якасці змякчальнага сродку падчас галення.

НАРОДНЫЯ РЭЦЭПТЫ

● **Пры аслабленым імунітэце** прыгатуйце сок падбелу. Спачатку старанна прамыйце лісце, абдайце яго кіпенем, а затым здрабніце і адцісніце. Прымайце па 2 ст. лыжкі 5 разоў на дзень на працягу тыдня.

● **Ад кашлю:** 10 г здробненага лісця заліце 1 шклянкай гатаванай вады. Настойвайце гадзіну, затым працадзіце і прымайце па 1 ст. лыжкі 4 разы на дзень.

● **Пры запаленчых захворваннях кішэчніка** высушанае лісце падбелу разатрыце ў парашок і прымайце ўнутр па 1 кававай лыжцы, запіваючы цёплым малаком.

● **Пры варыкозе:** 1 ст. лыжку лісця заліце 1 шклянкай кіпеню, кіпяціце 10 хвілін. Настойвайце пры пакаёвай тэмпературы 10—15 хвілін, працадзіце і прымайце па 1 ст. лыжцы 3—4 разы на дзень. На запаленыя вузлы накладвайце кампрэсы з кашкай з гэтага адвару.

● **Для выкліку апетыту:** 3 ст. лыжкі сыравіны заліце 400 мл кіпеню, настойвайце 3—4 гадзіны ў цёплым месцы. Прымайце па 1/2 шклянкі 3 разы на дзень за 30 хвілін да яды.

● **Пры насмарку** свежы сок лісця закапваюць у нос па 2—3 кроплі 3 разы на дзень.

● **Пры галаўным болі** і гарачцы прыкладзіце ліст падбелу да галавы бліскучым халодным бокам — атрымаеце хуткую палёгку.

● **Пры нарывах** і фурункулах кашку са свежага лісця прыкладвайце да хворых участкаў для больш хуткага «выспявання» нарываў.

● **Калі скура на руках сухая,** трэскаецца і свярбіць, па некалькі разоў на дзень змазвайце яе сокам расцёртага лісця падбелу.

Увага! Падбел і травяныя зборы, у склад якіх ён уваходзіць, супрацьпаказаныя цяжарным, кормячым маці, людзям з хворай пячонкай і дзецям да 2 гадоў. Каб пазбегнуць пабочных эфектаў, не рэкамендуецца прымаць прэпараты падбелу больш як 4—6 тыдняў запар. Пры перадазіроўцы, асабліва ў дзяцей, з'яўляюцца прыступы спастычнага болю ў жываце, млоснасць, ваніты, таму перад прымяненнем падбелу варта параіцца з доктарам.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»

❖ Оценка оборудования и транспортных средств
❖ Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

№ лота	Наименование объекта/ Краткая характеристика объекта	Начальная цена продажи лота, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.
1	**Открытый склад № 2** с пропарочными камерами (инв. № 350/С-85654)/ общая площадь 2049 кв.м; фундамент – ж/б блоки, стены – сборно-железобетонный каркас, перекрытия – металлические фермы	149 295 960	14 930 000
2	**Здание растворного узла № 2** с пристройкой (инв. № 350/С-44483) и галереей/ кирпичное 4-этажное здание общей площадью 255,84 кв.м	59 355 180	5 936 000
	Продавец имущества: Комиссия по работе с имуществом, обращенным в доход государства при администрации Центрального района, адрес объектов: **г. Гомель, ул. Борисенко, 7.** Шаг торгов – 5 %		
3	**Сооружение «Ограждение»** (инв. № 42) – общая длина 335 м.п. Адрес объекта: г. Речица, ул. Пролетарская, 118	13 630 306	682 000
4	**Сооружение «Склад-навес»,** общая площадь 300,0 кв.м, год постройки – 1968, строение капитальное, инв. № 38. Адрес объекта: г. Речица, ул. Луначарского, 97	31 179 660	1 559 000
	Продавец имущества: управляющий ООО «Реми». Шаг торгов – 10 %		
Срок подачи заявления	**До 17.00 3 мая 2010 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а		
Дата, время, место проведения аукциона	**4 мая 2010 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34/а, Гомельское областное управление Филиал РУП «Жилкоммунтехника» Центр «Белтехинвентаризация»		
1	**Здание мебельного цеха и бытовых помещений** общей площадью 1394,50 кв.м.

ХАБАР БРАЎ КУРАНЯТАМІ

За атрыманне хабару быў затрыманы чыноўнік упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Брэсцкага райвыканкама. Службовую асобу міліцыянеры спынілі каля Меднаўскай птушкафабрыкі. У машыне знаходзілася 110 куранят, а таксама курынае мяса, 180 яек, больш за 20 кілаграмаў рыбы.

Як паведамілі ў прэс-службе Брэсцкага абласнога УУС, па версіі следства, матэрыяльныя каштоўнасці чыноўніку перадаў кіраўнік сельгаспрадпрыемства за станоўчае вырашэнне пытання па ўтойванні недахопаў у рабоце птушкафабрыкі.

Яна СВЕТАВА.

Дом без металу

Жыхарка Мазыра пасля зімы знайшла сваю дачную сядзібу ў вёсцы Лясец Калінкавіцкага раёна пазбаўленай ад усяго металічнага. З пабудовы невядомы злодзей-паляўнічы за другаснай сыравінай выкраў двое металічных дзвярэй пячной топкі, засланку выцяжной трубы пячнога ацяплення. З летняй кухні ў двары — металічныя дзверы топкі пліты, чыгунную пліту для прыгатавання ежы, металічную выцяжку трубы, а з лазні — металічныя дзверцы і засланку.

Здавацца больш хворым,

чым насамрэч, захацеў 59-гадовы жыхар Гомеля. Для гэтага ён пераправіў у пасведчанні інваліда сваю трэцюю групу на другую, якая дае некаторыя льготы, у прыватнасці, пры праездзе на транспарце. Махляр паказаў свой адноўлены дакумент кіроўцу аўтобуса «Гомель — Чырвонае». Але ж нумар не прайшоў, і сёння грамадзянін абвінавачваецца ў падробцы афіцыйнага дакумента.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Жанцы!

У беларускага вяселля — жаночы «твар».

І хто з мужчын супраць?!.

Такая думка міжволі ўзнікла пасля наведвання міжнароднай спецыялізаванай выставы-кірмашу «Вясельны салон», што распачала сваю працу ў сталічным выставачным комплексе па праспекце Пераможцаў, 14. «Крэатыў на 80 працэнтах вясельляў задаюць нявесты...», «Кожная дзяўчына хоча верыць, што гэта першае і апошняе вяселле ў яе жыцці, таму гэтае свята павінна запомніцца назаўсёды», «Магчыма, апошнім часам вяселлі сталі трохі больш сціплыя: па ўпрыгажэнні і велічыні залаў, колькасці гасцей, без лімузінаў. Аднак на сабе маладыя, і найперш нявесты, не эканомяць...», «Некаторыя дзяўчаты ў пошуках індывідуальнасці не саромеюцца даставаць з куфраў бабуліны вясельныя сукенкі і выглядаюць у іх вельмі годна...» — гэта толькі невялікая частка меркаванняў, пачутых на прадстаўнічым форуме ад яго ўдзельнікаў. Ды і само адлюстраванне ўсяго спектра прапаноў на рынку шлюбных паслуг вонкава, як падалося, скіраванае хутчэй у бок прыгожай паловы чалавецтва: сукенкі, упрыгажэнні, букеты, посуд. Пра гэта, а таксама пра асаблівасці цяперашніх беларускіх вяселляў — наш сённяшні фотарэпартаж.

Дырэктар вясельнага агенцтва Арына БРЫЛЕЎСКАЯ і кіраўнік праекта Настасся БЯЛЯЕВА паказваюць эксклюзіўны праект (манекен) «Лэдзі-фуршэт».

Супрацоўнік ТДА «Стылёвая паштоўка» Ніна ВАСІЛЕЎСКАЯ: «Паглядзіце, якая прыгажосць!»

...З чаго пачынаецца любое вяселле? Вядома, калі юнак і дзяўчына гатовыя зрабіць такі крок у сваім жыцці і ўжо адбыліся заручыны? З запрашэння гасцей, так! У адрозненне ад колішніх часоў, цяпер праблемы з выбарам адпаведнай паштоўкі заключаюцца якраз у гэтым самым выбары. Напрыклад, у ТДА «Стылёвая паштоўка», што займае каля 40 працэнтаў гэтага рынку Беларусі, у асартыменце — каля 150 найменняў, каля 10 тысяч відаў паліграфічнай прадукцыі. Распаўсюджваецца яна па ўсёй краіне, а 30 працэнтаў ад аб'ёму нават ідзе на экспарт — у Германію, краіны Балтыі. Зараз вядуцца перамовы з Ізраілем.

Ад выбару сапраўды, як кажуць, вочы разбягаюцца. Цэны на тыя ж запрашальныя паштоўкі самыя дэмакратычныя — ад 300 рублёў да 5 тысяч за адну. Прычым у апошнім выпадку гаворка ідзе пра ручную работу.

— Мы распачыналі сваю працу на выставе літаральна з невялікага «катушка», дык наведвальнікі ў чарзе літаральна ў чатыры рады стаялі. Таму цяпер вырашылі павялічыць плошчу экспазіцыі ўдвая, — распавёў кіраўнік фірмы Алег ШАЎЧЭНКА.

Яшчэ фірма прапануе рознага кшталту жартоўныя плакаты на вясельную тэматыку, шыльды, нават гатовыя наборы: для выкупу нявесты — для сяброваК-сведак, для правядзення ўсёй урачыстасці — для тамады. Апошняга ў гэтым выпадку і запрашаць неабавязкова, такі набор у дапамогу можна ўручыць якому небудзь актыўнаму гасцю. Праўда, добра гэта ці не, вырашаць не нам.

— Сапраўды, з аднаго боку, мы становімся бліжэй да Захаду, культура правядзення падобных святаў павялічваецца, — згодны Алег Шаўчэнка. — З другога боку, губляюцца народныя традыцыі, што не вельмі добра... Вось вы спыталі, чаму няма вясельнай паліграфічнай прадукцыі на роднай мове. Мы спрабавалі яе выпускаць, аднак пакупнікі чамусьці не ацанілі яе. Магчыма, усё яшчэ наперадзе?..

Што ж, хочацца верыць, што некалі госці будуць атрымліваць запрашэнні на беларускае вяселле на роднай мове...

Для нявесты галоўнае што? Правільна, вясельная сукенка! І яшчэ букет нявесты!

— За модай людзі, бясспрэчна, сочаць, імкнуцца да індывідуальнасці і арыгінальнасці. Напрыклад, нядаўна было вяселле, на якім жаніх быў у чорным смокінгу, чырвоных туфлях і гальштуку, з чырвонай палкай. Тыя ж сукенкі многія прывозяць самі аднекуль, — з веданнем справы паведаміла нам супрацоўніца сталічнага вясельнага салона «Дотык» Ганна ЛАПЧЫНСКАЯ. — Яшчэ трэба сказаць, што ў кожнай пары — свае звычаі, свае забабоны. Для адных той жа чырвоны колер — абарона ад злых духаў. Нехта лічыць, што кідаць нявесце на вяселлі букет нельга, маўляў, нельга раскідвацца сваім шчасцем.

Як пэўную праяву крызісу суразмоўца адзначыла, што цяпер сукенкі сталі менш выкупліваць, а болей — браць напракат. Хоць увогуле крызіс не паўплываў на колькасць шлюбаў. Праўда, гэта таксама адзначылі работнікі салона, маладыя сталі больш строга прытрымлівацца пастоў. Сёлета вясельляў у гэты час, што мусілі канстатаваць не толькі ў вясельных салонах, але і ў рэстаранах, кавярнях і сталовых, іншых месцах па прадастаўленні паслуг, практычна не было. Хіба толькі калі па «залёце»... «Таму на наступны год нашы работнікі ўсур'ёз думаюць на час посту пайсці ў водпуск». Але калі ўсё ладзіцца, жаніх з нявестай імкнуцца зрабіць свята і ўспамін пра яго незабыўным.

— Скажам, у нас можна заказаць вясельныя келіхі. Мы працуем з гатовай прадукцыяй шклозавода «Нёман». Іх можна аздобіць і жывымі кветкамі (прастаяць два-тры дні), і штучнымі (захаваюцца на ўсё жыццё). У першым выпадку пара келіхаў будзе каштаваць 50 тысяч, у другім — 40 тысяч рублёў. Букет з жывых кветак для нявесты абыдзецца прыкладна ў 25 долараў, а яго дублёр са штучных — у 25 тысяч рублёў, — дапоўніла свой аповед Ганна Лапчынская.

— Наша прадукцыя для тых, хто цэніць якасць і стыльнасць, — далучаецца дырэктар гомельскай фірмы «Ma Belle» Ірына ГРАМЫКА. — Цэны на іх — вышэй за сярэднія, аднак і сукенкі ўпрыгожаныя сапраўднымі стразамі Свароўскі, горным хрусталём. Прычым гэта не скапіраваныя мадэлі, а распрацаваныя намі, з высакаякаснай тканіны, што вытрымлівае некалькі мыццяў. Усяго ў шасці калекцыях прадстаўлена 200 мадэляў сукенак, 30 з якіх з апошняй калекцыі мы прывезлі на выставу. Цана «пытання»? Сукенка напракат — 300 долараў, набыць яго ў розніцу — ад 450 долараў. Дарэчы, у сувязі з крызісам мы распрацавалі калекцыю эканом-класа. Там толькі менш упрыгажэнняў, таму на продаж такая сукенка — пры той жа якасці — будзе каштаваць 150 долараў.

...Калі пытанні з вясельнымі строямі вырашаныя, банкетная зала заказаная, а меню — узгодненае, паўстае пытанне: чым здзівіць гасцей, каб і для іх памятная дата ў жыцці маладых запомнілася надоўга? Напрыклад, увагу журналістаў «Звязды» на выставе прыцягнула прапанова сталічнага агенцтва «Пара па парам» — эксклюзіўны праект «Жывы стол» або «Лэдзі-фуршэт». Што гэта такое? Уявіце, што вашых гасцей перад банкетам сустракае не звыклы тамада ці распарадчык вяселля, а дзяўчына, апранутая ў шыкоўны касцюм мінулай эпохі. І запрашае прыбыўшых на аперытыў да свайго стала. Або, па вашым заданні, як расказала дырэктар агенцтва Арына БРЫЛЕЎСКАЯ, праводзіць, напрыклад, латарэю або раздае заданні для будучых конкурсаў — што падкажа вам фантазія. Кошт паслугі не такі ўжо і вялікі — 100 долараў за некалькі гадзін прысутнасці на свяце «Лэдзі-фуршэт». А можна здзівіць гасцей яшчэ больш, калі заказаць ...«Шоу пясчаных карцін».

— Гэта новы від мастацтва, які мы першыя і засвоілі, займаемся ім ужо два гады. Мастакі-прафесіяналы не адзін год папярэдне вывучалі тэхніку, — дасказала кіраўнік гэтага праекта агенцтва Настасся БЯЛЯЕВА.

Шкада, што словамі апісаць, як малююцца карціны на пяску, вельмі складана. Магчыма, нехта з чытачоў бачыў гэта па тэлебачанні? Гэта сапраўды шоу, калі на пяску ў суправаджэнні музыкі і пры падсветцы з'яўляюцца мастацкія творы... А ўвесь гэты працэс транслюецца для ўсіх прысутных на вялікі экран. Назаўсёды захаваць карціны, вядома ж, не атрымаецца, але ўспамін пра іх застанецца. Тым больш, што пасля шоу прафесіяналаў можна будзе ўсім ахвотным паспрабаваць сябе ў гэтай незвычайнай справе. Майстар-клас на 10-15 хвілін будзе каштаваць заказчыку, у залежнасці ад падсветкі (чорна-белай або каляровай) 250—350 долараў. А пасля — выпусціць «Нябесныя чароўныя ліхтарыкі»...

Вяселле скончылася, жыццё ўвайшло ў сваю будзённую, не заўсёды святочную, каляіну...

Што часам дапамагае ўзняць настрой, прыгадаць прыемныя моманты? Фотаздымкі з уласнага вяселля! Толькі вось неспадзяванка: папяровыя фота ў традыцыйных некалі альбомах практычна ўжо выйшлі не толькі з моды, але і ўвогуле — з нашага ўжытку. Фотаархіў многія захоўваюць цяпер на электронных носьбітах. Для сябе яшчэ куды не ішло, але вось калі госці наведаліся? А калі фотакнігу?!. Гэты накірунак з'явіўся ў Еўропе гадоў 5—7 таму і набірае там усё большую папулярнасць. У нас гады чатыры таму першымі справу па вырабе фотакніг пачала асвойваць сталічная фірма «Фотадом.by».

— За гэты час паслуга па стварэнні фотакніг рознай — на густ заказчыка (вяселле, адпачынак, сям'я і іншае) — тэматыкі стала запатрабаванай, — адзначыў дырэктар Артур ПІЛІПЕНКА. — Мы прымаем здымкі на розных носьбітах — ад файлаў да колішніх плёнак з архіваў. Тэрмін выканання заказу — ад трох тыдняў да месяца. І кліент трымае ў руках сапраўдную фотакнігу з цвёрдай вокладкай, у якой на старонках — любімыя здымкі. Кніга невялікага фармату на 12 старонак, напрыклад, каштуе 30—35 долараў, на 15—25 старонак і значна большая па памеры — 250—350 долараў.

Сяргей РАСОЛЬКА.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

«Мы працуем для тых, хто шукае свой стыль», — кажа дырэктар гомельскай фірмы Ірына ГРАМЫКА.

CREDEX BANK

ЗАО «Кредэксбанк»

ул. Некрасова, 114, 220068, г. Минск, Республика Беларусь
МФО 153001273, УНП 807000030, ОКПО 37560001

Т/факс (+375 17) 287 83 21
E-mail:mail@credexbank.by
S.W.I.F.T.NOIBBY2X Телекс: 252100 NIBBY

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 19 выдана 29.12.2008 г. Национальным банком Республики Беларусь. УНП 807000030.

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2010 г.

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	2009 год	2008 год
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101	1, 28	1 417,4	624,3
3	Средства в Национальном банке	1102	2, 28	15 314,8	932,9
4	Ценные бумаги	1103	3, 28	34 682,4	-
	для торговли	11031	3	34 682,4	-
	удерживаемые до погашения	11032		-	-
	в наличии для продажи	11033		-	-
5	Кредиты и другие средства в банках	1105	4, 28	45 549,5	22 191,3
6	Кредиты клиентам	1106	5, 28, 30	20 704,9	24 392,8
7	Долгосрочные финансовые вложения	1107		-	-
8	Основные средства и нематериальные активы	1108	6	1 798,7	652,2
9	Прочие активы	1109	7	845,4	641,1
10	ИТОГО активы	110		120 313,1	49 434,6
11	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
12	Средства Национального банка	1202		-	-
13	Кредиты и другие средства банков	1205	8, 28	452,4	
14	Средства клиентов	1206	9, 28, 31	54 282,2	14 048,6
15	Ценные бумаги, выпущенные банком	1208	10, 32	7 309,8	-
16	Прочие обязательства	1209	11	14 885,4	689,1
17	ВСЕГО обязательства	120		76 929,8	14 737,7
18	**КАПИТАЛ**				
19	Уставный фонд	1211	12	30 054,6	24 677,5
20	Эмиссионный доход	1212		-	-
21	Резервный фонд	1213		3 881,7	3 881,0
22	Накопленная прибыль	1214	13	9 352,0	6 100,9
23	Фонд переоценки статей баланса	1215	14	95,0	37,5
24	ВСЕГО капитал	121	25	43 383,3	34 696,9
25	ИТОГО обязательства и капитал	12		120 313,1	49 434,6
26	**ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ**				
27	Требования	1301	15	16 632,4	17 916,8
28	Обязательства	1302	16	8 445,6	12 015,7

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ за 2009 год

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	2009 год	2008 год
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		7 169,6	4 429,6
2	Процентные расходы	2012		679,7	131,9
3	Чистые процентные доходы	201	17	6 489,9	4 297,7
4	Комиссионные доходы	2021		4 730,0	2 687,9
5	Комиссионные расходы	2022		1 758,0	1 374,6
6	Чистые комиссионные доходы	202	18	2 972,0	1 313,3
7	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	203	19	12 440,0	6 650,4
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	20	(-17,7)	-
9	Доход в форме дивидендов	205		-	-
10	Чистые отчисления в резервы	206	21	2 900,5	216,5
11	Прочие доходы	207	22	216,8	226,7
12	Операционные расходы	208	23	6 820,0	4 755,5
13	Прочие расходы	209	24	1 034,8	321,7
14	Налог на прибыль	210		2 716,7	1 816,6
15	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2		8 629,0	5 377,8
16	Прибыль на акцию (рублей)		34	503 737,35	353 732,82

ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИИ КАПИТАЛА за 2009 год

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование показателей	Символ	Наименование статей капитала					
			уставный фонд	эмиссионный доход	резервный фонд	накопленная прибыль (убыток)	фонды переоценки статей баланса	всего капитал
1	2	3	4	5	6	7	8	9
Раздел I. За год, предшествующий отчетному								
1	Остаток на 1 января 2008 г.	3011	16 350,8	-	988,7	3 615,3	7,4	20 962,2
2	Изменения статей капитала	3012	8 326,7	-	2 892,2	2 485,6	30,2	13 734,7
2.1	В том числе: совокупный доход	30121	x	x	x	5 377,8	30,2	5 408,0
2.2	направление прибыли на пополнение фондов	30122		x	2 892,2	(-2892,2)	x	
2.3	операции с учредителями (участниками)	30123	8 326,7		x		x	8 326,7
2.4	внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников)	301231	8 326,7		x	x	x	8 326,7
2.5	выплата дивидендов акционерам	301232	x	x	x		x	
2.6	операции с собственными выкупленными акциями	301233		x	x	x	x	
2.7	перераспределение между статьями капитала	30125						
2.8	прочие изменения	30126						
3	Остаток на 1 января 2009 г.	3013	24 677,5	-	3 880,9	6 100,9	37,6	34 696,9
Раздел II. За отчетный год								
4	Остаток на 1 января 2009 г.	3011	24 677,5	-	3 880,9	6 100,9	37,6	34 696,9
5	Изменения статей капитала	3012	5 377,1		0,8	3 251,1	57,4	8 686,4
5.1	В том числе: совокупный доход	30121	x	x	x	8 629,0	57,4	8 686,4
5.2	направление прибыли на пополнение фондов	30122	5 377,1	x	0,8	(-5377,9)	x	0,0
5.3	операции с учредителями (участниками)	30123			x		x	
5.4	внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников)	301231			x	x	x	
5.5	выплата дивидендов акционерам	301232	x	x	x		x	
5.6	операции с собственными выкупленными акциями	301233		x	x	x	x	
5.7	перераспределение между статьями капитала	30125						
5.8	прочие изменения	30126						
6	Остаток на 1 января 2010 г.	3013	30 054,6	-	3 881,7	9 352,0	95,0	43 383,3

СВЕДЕНИЯ о совокупном доходе за 2009 год

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	2009 год	2008 год
1	2	3	4	5	6
1	Прибыль за отчетный период	301211	25	8 629,0	5 377,8
2	Прочие компоненты совокупного дохода за отчетный период	301212	25	57,4	30,2
2.1	В том числе: переоценка основных средств	3012121		57,3	30,2
2.2	переоценка незавершенного строительства и неустановленного оборудования	3012122		0,1	
2.3	переоценка ценных бумаг	3012123			
2.4	переоценка инструментов хеджирования	3012124			
2.5	переоценка прочих статей баланса	3012125			
3	ИТОГО совокупный доход за отчетный период	30121		8 686,4	5 408,0

ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ за 2009 год

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2009 год	2008 год
1	2	3	4	5	6
1	**ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ОПЕРАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ**				
2	Полученные процентные доходы	7010		7169,6	4429,6
3	Уплаченные процентные расходы	7011		-493,1	-131,8
4	Полученные комиссионные доходы	7012		4730,1	2688,0
5	Уплаченные комиссионные расходы	7013		-1757,9	-1374,6
6	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	7014		6724,6	6535,6
7	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	7015		193,8	
8	Доход в форме дивидендов	7016			
9	Прочие полученные доходы	7017		18,9	69,6
10	Прочие уплаченные расходы	7018		-7352,2	-4753,3
11	Уплаченный налог на прибыль	7019		-2523,8	-1582,8
12	Итого денежная прибыль (убыток) до изменения в операционных активах и операционных обязательствах	701		6710	5880,3
13	Чистое снижение (прирост) денежных средств в Национальном банке	7020		-14483,8	-169,9
14	Чистое снижение (прирост) денежных средств в ценных бумагах (кроме ценных бумаг, удерживаемых до погашения)	7021		-35324,2	
15	Чистое снижение (прирост) денежных средств в форме кредитов и других денежных средств в банках	7022		-12849,3	2640,4
16	Чистое снижение (прирост) денежных средств в форме кредитов, выданных клиентам	7023		3909,8	-18392,1
17	Чистое снижение (прирост) денежных средств в прочих операционных активах	7025		137,9	-732,5
18	Итого потоки денежных средств от изменения операционных активов	702		-58609,7	-16654,1
19	Чистый прирост (снижение) денежных средств Национального банка	7030			
20	Чистый прирост (снижение) денежных средств в форме кредитов и других средств банков	7032		372,0	-75,0
21	Чистый прирост (снижение) денежных средств клиентов	7033		38366,3	4172,9
22	Чистый прирост (снижение) денежных средств от ценных бумаг, выпущенных банком	7034		6941,7	
23	Чистый прирост (снижение) денежных средств в прочих операционных обязательствах	7035		14066,8	-127,6
24	Итого потоки денежных средств от изменения операционных обязательств	703		59746,7	3970,3
25	Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от операционной деятельности	70		7847,1	-6803,5
26	**ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ИНВЕСТИЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ**				
27	Приобретение основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	7110		-1271,3	-377,6
28	Продажа основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	7111		29,7	-25,5
29	Приобретение долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц	7112			
30	Продажа долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц	7113			
31	Приобретение ценных бумаг, удерживаемых до погашения	7114			-114110,3
32	Погашение (реализация) ценных бумаг, удерживаемых до погашения	7115			115610,4
33	Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от инвестиционной деятельности	71		-1241,6	1097,0
34	**ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ФИНАНСОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ**				
35	Эмиссия акций	7211			8326,7
36	Выкуп собственных акций	7212			
37	Продажа ранее выкупленных собственных акций	7213			
38	Выплата дивидендов	7214			
39	Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от финансовой деятельности	72			8326,7
40	Влияние изменений валютного курса на денежные средства и их эквиваленты	73		5120,5	191,1
41	Чистый прирост (снижение) денежных средств и их эквивалентов	74		11726	2811,3
42	Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного периода	740	1	x	21155,4
43	Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного периода	741		32881,4	x

Генеральный директор **А.А. Аксеневич**

Главный бухгалтер **Н.П. Круглова**

Дата подписания 26 февраля 2010

Достоверность бухгалтерского баланса, отчета о прибыли и убытках, отчета об изменении капитала, сведений о совокупном доходе, отчета о движении денежных средств подтверждена.

Директор частного предприятия «КПМГ» **А.Н. Шкодин**

24 марта 2010

KPMG

Частное предприятие «КПМГ»
ул. Сторожевская, 8
220002, Минск, Беларусь

Телефон +375 (17) 210 04 73
Факс +375 (17) 210 04 75
Интернет www.kpmg.by

Акционерам ЗАО «Кредэксбанк»
ул. Некрасова, 114
г. Минск
Республика Беларусь
220068
ЗАО «Кредэксбанк» зарегистрировано в Национальном банке Республики Беларусь 27.09.2001, регистрационный номер 807000030

Исх. номер 04-03/11/277

Аудиторское заключение по бухгалтерской (финансовой) отчетности ЗАО «Кредэксбанк» за 2009 год

Мы провели аудит прилагаемой бухгалтерской (финансовой) отчетности Закрытого акционерного общества «Кредэксбанк» (далее – «Банк»), состоящей из бухгалтерского баланса на 1 января 2010 года, отчета о прибыли и убытках, отчета об изменении капитала и отчета о движении денежных средств за 2009 год, а также пояснительной записки.

Ответственность руководства относительно бухгалтерской (финансовой) отчетности

Ответственность за подготовку и объективное представление бухгалтерской (финансовой) отчетности в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь несет руководство Банка. Ответственность руководства Банка заключается в разработке, внедрении и поддержании системы внутреннего контроля, относящейся к подготовке и объективному представлению бухгалтерской (финансовой) отчетности, не содержащей существенных искажений, вызванных мошенничеством либо ошибкой; а также в выборе и применении соответствующей учетной политики и определении оценочных значений, адекватных текущим обстоятельствам.

Ответственность аудиторов

В наши обязанности входит выражение мнения о бухгалтерской (финансовой) отчетности на основе проведенного нами аудита, а также предоставление сведений о выполнении Банком нормативов безопасного функционирования и состоянии внутреннего контроля Банка.

Мы провели аудит в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь и Международными стандартами аудита, если они не противоречат названным требованиям. Эти стандарты и требования обязывают нас соответствовать этическим требованиям и планировать и проводить аудит таким образом, чтобы обеспечить разумную уверенность в том, что бухгалтерская (финансовая) отчетность не содержит существенных искажений.

Аудит включает в себя проведение процедур для получения аудиторских доказательств по суммам и раскрытиям, представленным в бухгалтерской (финансовой) отчетности. Отбор процедур проводится на основании суждений аудитора, включающих оценку риска наличия существенных искажений в бухгалтерской (финансовой) отчетности, вне зависимости от того, явилось ли их причиной мошенничество или ошибка. При оценке данного риска аудитор рассматривает работу системы внутреннего контроля, относящуюся к подготовке и объективному представлению бухгалтерской (финансовой) отчетности Банка, в целях разработки соответствующих аудиторских процедур, но не в целях выражения мнения об эффективности работы самой системы внутреннего контроля Банка. Аудит также включает в себя оценку приемлемости используемой учетной политики, обоснованности оценочных значений, сделанных руководством Банка, и оценку общего представления бухгалтерской (финансовой) отчетности.

Мы полагаем, что полученные нами аудиторские доказательства обеспечивают достаточные и надлежащие основания для выражения нашего аудиторского мнения.

Аудиторское мнение

По нашему мнению, бухгалтерская (финансовая) отчетность достоверно отражает во всех существенных отношениях финансовое положение ЗАО «Кредэксбанк» на 1 января 2010 года, а также результаты деятельности и движение денежных средств за 2009 год, в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь, касающимися подготовки бухгалтерской (финансовой) отчетности.

В ходе аудита нами было установлено, что Банком в течение 2009 года не соблюдался норматив минимального размера нормативного капитала для действующего банка, имеющего право на осуществление банковских операций по привлечению денежных средств физических лиц, не являющихся индивидуальными предпринимателями, во вклады (депозиты) и (или) открытию и ведению банковских счетов таких физических лиц, установленных Национальным банком Республики Беларусь. Другие факты несоблюдения Банком нормативов безопасного функционирования в 2009 году, установленных Национальным банком Республики Беларусь для банков, не обнаружены.

Мы также не обнаружили факты, свидетельствующие о существенном несоответствии состояния системы внутреннего контроля Банка характеру и объему осуществляемых им операций, которые могли бы привести к существенному искажению бухгалтерской (финансовой) отчетности Банка.

Заключение по иным требованиям законодательства

В наши обязанности также входит оценка методики расчетов и достоверности информации, включенной в формы пруденциальной отчетности 2801 «Расчет достаточности нормативного капитала», 2807 «Отчет о размере специальных резервов на покрытие возможных убытков по активам и операциям, не отраженным на балансе», 2809 «Расчет ликвидности», составленные Банком и представляемые на 1 января 2010 года. Ответственность за подготовку данных форм пруденциальной отчетности несет руководство Банка. В наши обязанности входит выражение мнения о достоверности указанных форм пруденциальной отчетности.

По нашему мнению, вышеназванные формы пруденциальной отчетности на 1 января 2010 года составлены ЗАО «Кредэксбанк» достоверно во всех существенных аспектах в соответствии с Инструкцией о порядке составления и представления банками и небанковскими кредитно-финансовыми организациями пруденциальной отчетности в Национальный банк Республики Беларусь, утвержденной постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 31 октября 2006 года № 172 (с учетом дополнений и изменений).

Шкодин Александр Николаевич
Директор

Кондратьева Наталья Викторовна
Руководитель аудиторской группы

24 марта 2010 года

г. Минск, Республика Беларусь

Частное предприятие «КПМГ»

Свидетельство о государственной регистрации выдано Минским горисполкомом на основании решения от 20.11.2008, УНП 190241132

Лицензия на право осуществления аудиторской деятельности № 02200/0495354 выдана Министерством финансов Республики Беларусь до 25.02.2014 на основании решения от 05.01.2009 № 3.

Специальное разрешение (лицензия) на осуществление аудиторской деятельности в банках и небанковских кредитно-финансовых организациях № 10 выдано на основании решения специальной квалификационной комиссии Национального банка Республики Беларусь № 4 от 10.09.2008 сроком на 5 лет.

КАРАЛЕЎСКІ СПАКОЙ

У Вавельскай катэдры ў Кракаве адбудзецца першае пахаванне ў гісторыі сучаснай Польшчы

Палякі ў жалобе. Але нават у такі сумны момант яны ўзгадваюць гісторыю сваёй краіны з пытаннем: ці правільнае рашэнне — прэзідэнта Леха Качыньскага і яго жонку хаваць побач з вялікімі каралямі? Надта адказнае рашэнне, хоць і нельга сказаць, што нечаканае. Першая асоба ў краіне загінула пры выканні сваіх абавязкаў, дабіваючыся гістарычнай праўды для палякаў, якія чакалі гэтага моманту 70 гадоў... Гэта шмат чаго вартае. Але голас народа пачуты — у Вавелі, але не з каралямі. Бо народ памятае імёны каралёў, якія не проста кіравалі народам, але стваралі для яго краіну, мацавалі яе, здабывалі слаўныя перамогі. Народ шануе асобаў, якія здабывалі і адстойвалі незалежнасць, апявалі свабоду. Сярод асобаў, якім дадзена права вечна спачываць у Вавелі, шмат тых, хто родам з ВКЛ ці з земляў сучаснай Беларусі.

Іх спакою наўрад ці што пагражае — ўсё-такі пад крыжамі сабора, лічы, пад аховай нябёсаў. Хіба не самай надзейнай аховай, якой вартыя каралі. І гэта пры тым, што шлях да іх і сёння адкрыты для любога чалавека. Нездарма Вавельская катэдра, як і крыпта святога Леанарда ў ёй — месца надзіва запоўненае турыстамі.

Не люблю сумныя месцы. У мяне ніякіх модных гоцкіх схільнасцяў не было, каб думаць пра смерць, а тым больш на яе глядзець у нейкай незразумелай здранцвеласці і загадкавасці. Ды, здавалася б, ну хіба цікава хадзіць на могілкі і глядзець на помнікі? Кожны з наведвальнікаў Вавеля, напэўна, мае свой адказ на гэтае пытанне. Мой выглядае чыста беларускім: каб быць у Кракаве і не зайсці схіліць галаву перад Ягайлам, унукам вялікага князя Вялікага Княства Літоўскага Гедыміна, заснавальнікам славутай дынастыі польскіх каралёў? Я б сабе гэтага не даравала. Таму заставалася настроіцца на доўгае блуканне па маральных пакутах і адганяць думкі пра магчымую бяссонніцу пасля такога адпачынку.

Дарога ўверх, да ўзгорка, на якім па-над Віслай размешчаны замак. Уздоўж яе — сцяна з імёнамі. Не, не каралеўскімі. З імёнамі тых, хто на пачатку мінулага стагоддзя даваў грошы на аднаўленне замка, дзе дух каралёў у спакоі. Брама з гербамі. Аднак яшчэ на падыходзе да яе ты ўжо бачыш здалёк магутную фігуру на кані — помнік Тадэвушу Касцюшку. Ён не быў каралём па крыві, аднак быў уладаром душ, натхняўшы магутнае паўстанне 1794 года. Сапраўдны народны кароль, бо ні ў каго не выклікае сумненняў, што ён і цяпер стаіць на ахове дзяржаўнасці краіны. І паспрабуй ты каму-небудзь сказаць: гэта мой зямляк з Беларусі! Хоць гэта сапраўды так: маёнтак Касцюшак на Берасцейшчыне зусім недалёка ад горада, дзе вырасла я... У нас пра яго, героя не адной краіны, памятаюць. Аднак у Вавелі жыве яго дух. Падумаўшы гэта, я зразумела, што не маю права не спусціцца да саркафага з яго труной. Герою паўстання адвялі месца ў крыпце Кафедральнага сабора побач з каралямі!

На нас глядзелі з непаразуменнем: немагчыма толькі да Касцюшкі — і назад, наверх, дзе свеціць сонца і ходзяць людзі. Калі ты ўжо зайшоў у кафедральны сабор Вавеля, то мусіш прайсці ўсе этапы да спасціжэння адной думкі: каралямі не нараджаюцца, а ўсё-такі становяцца; нават тыя, хто насіў у сабе каралеўскую кроў, увесь час павінны былі пацвярджаць свой гонар справамі. А такіх спраў у гісторыі народа выпадала нямала. Вось гэтую гісторыю краіны найлепшым чынам можа распавесці Вавель. Прычым не толькі той краіны, але і нашай.

Сам замак доўгі час з'яўляўся рэзідэнцыяй польскіх каралёў, з імі звязаны росквіт дзяржавы. А сабор — яе сімвал, бо менавіта тут і каранаваліся каралі. І каралевы!.. Пад высокім зводам шмат думак раіцца, і карцінкі з ўяўлення паўстаюць перад вачыма: наша панна Барбара Радзівіл атрымала сваю карону менавіта тут. Праўда, ненадоўга. Затое ёй выпаў гонар стаць жонкай Жыгімонта II Аўгуста, апошняга са славутай дынастыі Ягелонаў.

Ягайла стаў уладаром замка ў Кракаве дзякуючы сваёй жонцы, каралеве Ядзвізе, якая ў 1386 годзе дала згоду выйсці замуж за літоўскага князя. Ягайла прыняў каталіцтва і стаў каралём Польшчы Уладзіславам II. Аднак нашчадкаў яму нарадзіла не Ядзвіга, якая цяпер прызнаная за святую і спачывае ў саборы. Маці дынастыі польскіх каралёў стала не яна, а Соф'я Гальшанская, якая зусім юнай 16-гадовай паненкай пайшла за старога, але вельмі ўганаванага караля. І калі чытаеш імя Соф'і ў капэле Ягелонаў, то разумееш, наколькі былі знітаваныя народы, калі іх каралёў і каралеў ведалі далёка-далёка за межамі адной ці нават дзвюх краін.



Кракаў. Вавель.

Як Ягайлу, напрыклад, які дамогся уніі Польшчы і Вялікага Княства. Гэтаму спрыяла перамога над крыжакамі ў Грунвальдскай бітве, дзе ваявалі воіны Вітаўта, але Ягайла ўзначальваў аб'яднаныя войскі. Ён прынёс у Вавель харугвы Тэўтонскага ордэна і ўсклаў іх на «алтар Айчыны». Гэта не метафара, а канкрэтнае месца ў Вавельскай катэдры — ля срэбнай ракі з мошчамі святога Станіслава. Глядзела на яе і думала, што, напэўна, ёсць нейкія апекуны нябесныя над усім чалавечым светам, калі столькі падзей пражыла краіна, ды і сам Кракаў, Вавель, а месца гэтае стаіць. І каралі тут у спакоі: на саркафагах — іх выявы з рэгаліямі ў руках, у адзенні, у якім каранаваліся — пры поўным парадзе.

Пра «беларускі след», як бы сказалі сёння, у гісторыі Польшчы можна разважаць ля кожнага саркафага дынастыі Ягелонаў. Пра тое, як узнік і мацаваўся ў Кракаве знакаміты ўніверсітэт. Пра тое, як перабудоўваўся сам Вавельскі палац — ужо пры Жыгімонце Старым і не ў малой ступені дзякуючы яго жонцы Боне Сфорцы, якая давярала італьянскім майстрам. І яе сын Жыгімонт Аўгуст да Вавеля ставіўся як і трэба каралю — з трымценнем. А на пахаванні апошняга з Ягелонаў быў зламаны яго меч — кажуць, што і дагэтуль часткі захоўваюцца ў саборы. Гаспадар яго стаў апошнім каралём, для якога Кракаў быў сталіцай.

Між іншым, і ў гэтым ёсць пэўная праява беларускага ўплыву. Пры Жыгімонце III з дынастыі Вазаў землі Польшчы і ВКЛ былі аб'яднаныя і ўтварылася новая дзяржава — Рэч Паспалітая. Агульнай сталіцай стала Варшава. Аднак усё роўна шлях каралёў пачынаўся з каранацыі ў Вавелі і скончаўся тут жа, дзе ім была накананаваная вечная пашана. Вось толькі самы апошні кароль Рэчы Паспалітай Станіслаў Аўгуст Панятоўскі не быў каранаваны ў Вавелі — і памяці пра яго тут не знайсці...

Што значыць памяць пра вялікіх асобаў, выдатна разумееш калі падыходзіш да месца спачыну Адама Міцкевіча. І сапраўды адчуваеш спакой. Вялікі паэт-рамантык (мо яго дух?) нават у крыпце, пад зямлёй, напаўняе розум святлом: зямны чалавечы шлях можа быць варты найвышэйшай пашаны, калі адзначаны талентам. А паэты — каралі думак. Каралі мараў. Каралі нават пасля смерці, бо яшчэ паглядзець, каго найчасцей узгадваюць людзі. Ярка-чырвоная ружа з буйнымі пялёсткамі на саркафагу сцвярджала пра жывую веру ў словы, якія належалі генію. І хоць цёмна было там і неяк няёмка сярод усіх гэтых бясконцых трунаў, аднак цяпло напаўняла душу. Сапраўднае цяпло, якім ахінута здабытае шчыра і сумленна права на вечнасць. І зноў-такі не каралём! Паэтам, які быў родам з Навагрудчыны. Вялікім чалавекам.

Калі ты там, у Вавельскім саборы, аглядаеш мінулае праз імёны пахаваных, то паняцце вялікасці асобы неяк трансфармуецца. Ты разумееш, што гэта не героі з легендаў. Гэта не імёны з кніжак, энцыклапедый. Гэта рэальныя людзі, якія рабілі сваю справу так, як яе разумелі. І яшчэ нехта з нашчадкаў потым разумеў штосьці галоўнае літаральна так жа. Супадзенне разуменняў скрозь часы і вядзе да прызнання вялікасці. Не было ў палякаў сумнення наконт пахавання ў Вавелі Юзафа Пілсудскага, які на пачатку мінулага стагоддзя рабіў усё магчымае і немагчымае для таго, каб з'явілася незалежная краіна пад назвай Польшча. І часам тое, што яму падавалася здзейсніць лёгка, для некага было немагчыма зусім: у беларусаў знайшліся б пытанні да Пілсудскага, што тады, што і цяпер. Тым больш, лічыце, да свайго чалавека... Аднак ён абраў для сябе шлях, за што ўшанаваны ў Вавелі — сучасная труна ў лаканічным аздабленні выдае асобу, якая на службе. Не хачу разважаць пра вялікасць гэтага чалавека. Але галоўны прынцып яго жыцця — служэнне — выклікае павагу. Гэта служэнне кіраўніка сваім падначаленым. Служэнне той краіне, якую лічыш сваёй і якая абрала цябе. А народ уславіў.

Народ быў на першым месцы. Ён зрабіў каралямі паэтаў, ваенных, герояў, памяць пра якіх хацеў пранесці праз стагодзі. І, напэўна, усіх гэтых герояў лічыў сваімі. Бо так доўгі час і было. Што тут казаць, калі нават дагэтуль у Польшчы святкуецца Дзень канстытуцыі, якая найстарэйшая ў Еўропе і была прынятая 3 мая 1791 года — каб захаваць дзяржаву Рэч Паспалітую ад распаду. На гэты гістарычны дакумент можна было нават паглядзець — літаральна летась зусім не маленькая кніга выстаўляўся ў Варшаве для агляду ўсіх ахвотных. І вы б бачылі, колькі пад гэтай канстытуцыяй подпісаў са знаёмымі прозвішчамі — ужо з беларускай гісторыі!..

Ларыса ЦІМОШЫК.

НА ФЕСТЫВАЛЬ «BE2GETHER» БЕЛАРУСЫ ЗМОГУЦЬ АТРЫМАЦЬ ВІЗЫ БЯСПЛАТНА

Міжнародны фэст музыкі і мастацтваў «Be2gether», што адбудзецца 25—27 чэрвеня гэтага года на адкрытай пляцоўцы каля літоўскага палаца Нарвілішкес — у 50 метрах ад мяжы з Беларуссю, пройдзе сёлета ўжо ў чацвёрты раз. Арганізатары традыцыйна запрашаюць гасцей з розных краін свету правесці разам тры дні, каб пачуць і ўбачыць «модную музычную палітру сучаснай Еўропы».

Сёлета, напрыклад, гледачоў парадуюць сваімі выступленнямі аўстралійская электра-поп-каманда Empire Of The Sun і нарвежскі гурт таго ж стылю Casiokids, брытанскія рокеры Skunk Anansie і выканаўца хіп-хопу Roots Manuva, датчане WhoMadeWho і аўстрыйцы Bauchklang, украінскія рок-казакі «Гайдамакі» і расійскія панкі «Рубль». Беларусь на фестывалі прадставіць гурт «Open Space», які нядаўна выпусціў дэбютны альбом і атрымаў узнагароду як лепшы поп-рок праект на сёлетняй «Рок-каранацыі», а таксама Лявон Вольскі, які прэзентуе свой альбом «Белая яблыня грому» на вершы беларускіх класікаў, а таксама парадуе хітамі з папярэдніх праектаў — «Я нарадзіўся тут», «Крамбамбуля». Зрэшты, паводле слоў гаспадара палаца, ідэйнага натхняльніка фэсту Гедруса Клімкявічуса, склад удзельнікаў канчаткова яшчэ не вызначаны: «Ёсць верагоднасць, што будзе праведзены дадатковы конкурс, і мы прапануем маладым гуртам дасылаць свае матэрыялы». З'ядлівы Лявон Вольскі тут жа прапанаваў абставіць гэты адбор, як пародыю на «Еўрабачанне» — «каб была шуміха, пафас, спрэчкі, хто ўсё ж паедзе» — але гэта магчыма зрабіць, мяркуюць арганізатары, не раней чым налета.

Што да цяперашняга фэсту, то для беларусаў, ахвотных яго наведаць, ёсць навіна — недастаткова толькі набыць білет, кошт якога складае 250 тысяч, а бліжэй да падзеі будзе павялічвацца да 350. Яшчэ неабходна зарэгістравацца на афіцыйным сайце www.b2g.lt, і толькі пасля пацвярджэння рэгістрацыі звяртацца ў пасольства дзеля атрымання візы. Дарэчы, як запэўніў пасол Літвы ў Беларусі Эдмінас Багдонас, нягледзячы на тое, што з 6 красавіка ў краінах Еўрасаюза пачаў дзейнічаць новы візавы кодэкс, візы для грамадзян Беларусі пры наяўнасці білета на фэст па-ранейшаму будуць бясплатныя: «Бо наш інтарэс — каб як мага больш з вас пабывала ў нас».

Беларускім наведнікам складуць кампанію, як чакаецца, гледачы не толькі з Літвы, але таксама з Польшчы, Расіі, Украіны. Гасцям будзе прапанаванае размяшчэнне ў намётавым летніку з паркінгам для аўтамабілістаў, душам, прыбіральнямі і абсталяванымі зонамі для вогнішчаў. А акрамя забаўляльнай праграмы — музыкі, што будзе гучаць з асноўнай і малой сцэны, спартыўных спаборніцтваў, мастацкіх пленэраў, цыркавых выступленняў — рыхтуецца яшчэ праграма сацыяльна-экалагічная. Арганізатары будуць прапагандаваць ашчаднае і адказнае абыходжанне з прыродай, каб усе пакідалі месца свайго адпачынку чыстым (летась з той жа мэтай гасцей саджалі на веласіпеды як экалагічны від транспарту, пазалетась — удзельнікі і наведнікі масава садзілі кветкі і зёлкі).

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

З надыходам адпускной кампаніі мы задумваемся над пытаннямі:

Крэдыт на адпачынак

КУДЫ ПАЕХАЦЬ І ДЗЕ ЎЗЯЦЬ ГРОШЫ?

Хто не марыў пабываць на Лазурным беразе Францыі ці ўбачыць егіпецкія піраміды, акунуцца ў ванны, якія прымала сама Клеапатра, або пахадзіць па старадаўнім Эфесе, убачыць артэфакты найстаражытнейшых цывілізацый!?

Але, на жаль, водпуск у многіх суайчыннікаў абмяжоўваецца толькі дачай або зусім праходзіць без якой-небудзь змены абставінаў. Што ж рабіць?

— Галоўнае, каб у чалавека было жаданне падарожнічаць, адкрывацца для сябе новыя краіны, далучацца да новых культур і цывілізацый, бы і проста паваляцца на гарачым пяску ля мора, а фінансавы бок гэтага пытання — выдачу крэдыту на адпачынак — мы бяром на сябе, — кажа **начальнік ЦБУ № 541 ААТ «Беларускі Індустрыяльны Банк» Марына АЎЧЫННІКАВА**. — У рамках спажывецкага крэдытавання для фізічных асобаў мы прэзентуем «крэдыт на адпачынак» у беларускіх рублях пад 17 % гадавых на 18 месяцаў у наяўнай або безнаяўнай форме. Асабліваасцю гэтага крэдыту з'яўляецца тое, што ён афармляецца без падатку і паручыцельства, на працягу аднаго дня. Сума крэдыту — да 2,5 млн руб. Для яго атрымання неабходныя толькі даведка аб сярэднямесячным даходзе за апошнія 3 месяцы і пашпарт, а для пенсіянераў — даведка аб пенсіі за апошнія 3 месяцы. Анкету-заяву крэдытаатрымальнік запаўняе ў банку пры падачы дакументаў. Абслугоўванне ў ЦБУ ажыццяўляецца па прынцыпе «аднаго акна» — без чэргаў і хаджэння з кабінета ў кабінет. Акрамя таго, пры афармленні крэдыту нашы супрацоўнікі пачастуюць кліента духмянай кавай з фірменным шакаладам.

Яшчэ адна асаблівасць «крэдыту на адпачынак» заключаецца ў тым, што, калі ў кліента з'явіліся грошы і ён жадае пагасіць усю суму, плату за датэрміновае пагашэнне банк **не бярэ**.

У ЦБУ можна атрымаць таксама міжнародныя банкаўскія пластыкавыя карткі Visa Electron у беларускіх рублях, долярах ЗША ці еўра, камісія за выраб і суправаджэнне якіх **не спаганяецца**.

Такім чынам, крэдыт атрыманы, пуцёўка забраніравана, наперад — за новымі адчуваннямі і адкрыццямі, за адпачынкам, пра які даўно марылі!

Алена АФАНАСЬЕВА.

Перад Вялікаднем я, як усе прыстойныя хатнія гаспадыні, рабіла генеральную прыборку ў кухні і знайшла забыты мяшочак з фасоляй. Сумленна спрабавала ўзгадаць, калі я апошні раз штосьці з яе гатавала — і не змагла. Таму сёння, паважаныя нашы чытачы, мы з вамі будзем гатаваць стравы з гэтага вельмі каштоўнага прадукту. На думку дыетолагаў, бабовыя ўваходзяць у дзясятку самых каштоўных для здароўя прадуктаў. Фасоля прыдатная для дыябетычнага харчавання і разгрузачных дыет. Асаблівая харчовая каштоўнасць фасолі ў спалучэнні высакаякаснага бялку з крухмалам, цукрам, мінеральнымі рэчывамі, вітамінамі і незаменнымі амінакіслотамі. Бялок фасолі засвойваецца лёгка і змяшчае жыццёва неабходныя амінакіслоты трыптафан, лізін, аргінін, ціразін, метыянін, да таго ж бялок фасолі блізкі да бялку жывёл і прыраўноўваецца да дыетычных курыных яек. Таму фасолю называюць раслінным мясам. У працэсе апрацоўкі фасолі губляецца зусім мала харчовых рэчываў. У кансерваванай фасолі захоўваецца да 70 % вітамінаў і да 80 % выходных мінеральных рэчываў. Фасоля валодае лячэбнымі ўласцівасцямі і шырока прымяняецца ў народнай медыцыне. Дзейнічае як ачышчальны, супакойваючы, мачагонны сродак, карысная для зубоў, лечыць дыябет, гіпертанію і многае іншае. Вараная працёртая фасоля з раслінным алеем і сокам лімона — цудоўны сродак для амаладжэння скуры твару. І апошняя далікатная заўвага. Каб фасоля не пушыла, рэкамендуецца спалучаць яе з гарчыцай, перцам або воцатам з соллю. Засвойваецца яна лепш за ўсё з гароднінай.

альбо На пампушкі да Алены

САЛАТА З ФАСОЛІ З СУХАРЫКАМІ

Нам спатрэбіцца: 1 бляшанка кансерваванай фасолі, 1—2 пакецікі сухарыкаў, можна жытнія, 200 г сыру, 2 салёныя агуркі (можна свежыя), часнок, зяленіва, маянэз.

Змешваем фасолю, сухарыкі, агуркі, парэзаныя кубікамі, натаркаваны сыр, дробна пасечанае зяленіва. Выціскаем пару зубкоў часнаку і запраўляем маянэзам. Сухарыкі павінны крыху насыціцца, таму трэба даць салаце пастаяць паўгадзіны. Многія любяць, калі сухарыкі не насычаныя, а хрусцяць. У гэтым выпадку сухарыкі лепш класці перад самай падачай на стол.

САЛАТА З ВЯНДЛІНЫ І ФАСОЛІ

Вазьміце: 2 шклянкі фасолі, 1 цыбуліну, 200 г вяндліны, 2 яйкі, 3 сталовыя лыжкі воцату, 4—5 сталовых лыжак алею, соль, перац і спецыі — на смак.

Палажыце ў салатнік добра звараную і адцэджаную фасолю (зерне), дадайце рэпчатую цыбулю, нарэзаную тонкай саломкай, дробна нарэзаную вяндліну (можна выкарыстаць варанае мяса з супу), варанымя яйкі, дробна нарэзаныя кубікамі, соль і чорны перац на смак. Салату заправіць алеем і воцатам, усё добра перамяшаць, палажыць у салатнік і пасыпаць дробна натаркаваным хрэнам.

РАСОЛЬНІК З ФАСОЛЯЙ

Нам спатрэбіцца: 50 г фасолі, 1—2 салёныя агуркі, 3—4 бульбіны, 1 сталовая лыжка сметанковага масла, 1 сталовая лыжка смятаны, 1 яйка, 1 цыбуліна, 1 морква, крыху кораня пятрушкі і сельдэрэю, лаўровы ліст, перац чорны гарошкам, соль — на смак.

Фасолю перабраць, прамыць, замачыць на 6 гадзін, пасля ваду зліць, зноў заліць халоднай вадой, пасля чаго адварыць да гатоўнасці, адвар адцадзіць, але не выліваць. Салёныя крэпкія агуркі ачысціць ад лупіны (хоць я больш люблю з лупінай), нарэзаць саломкай і прыпусціць з невялікай колькасцю вады. Цыбулю, моркву, корань пятрушкі і сельдэрэю адносна дробна нарэзаць і пасіраваць на масле. У адвар фасолі ўліць ваду, давесці да кіпення, пакласці бульбу, нарэзаную брусочкамі, і варыць амаль да гатоўнасці. Дадаць прыпушчаныя агуркі, пасіраваныя карэнні і рэпчатую цыбулю, варыць яшчэ 7—10 хвілін. За 5 хвілін да канца варкі пакласці адвараную фасолю, уліць гатаваны агурочны расол, дадаць перац (гарошкам), лаўровы ліст і пасаліць. Зняўшы з агню, расольнік запраўліць сырым яечным жаўтком, расцёртым з часткай смятаны. Гатовы расольнік разліць па талерках, дадаць смятану і дробна нарэзанае зяленіва.

ПАШТЭТ ЗІМОВЫ З ЧЫРВОНАЙ ФАСОЛІ

Вазьміце: 0,5 кг чырвонай фасолі, 1/2 шклянкі грэцкіх арэхаў, 100 г сметанковага масла, 1 гранат, часнок і соль — на смак.

Замочаную на 5—6 гадзін фасолю варыць да гатоўнасці без солі. Калі фасоля астыне, прапусціце яе праз мясарубку, туды ж пракруціце арэхі, выціснуць 2—3 зубкі часнаку. Пасаліце, перамяшайце. Калі паштэт атрымаўся крыху сухаватым — можна дадаць крыху фасолевага адвару. Частку паштэту вылажыць слоем каля 3 см на плоскае блюда, на яго — сантыметровы слой сметанковага масла і замазаць усё другім слоем паштэту. Зверху ўпрыгожыць зернямі чырвонага граната, прычым чым іх больш — тым смачней паштэт.

КАТЛЕТЫ З ФАСОЛІ

Нам спатрэбіцца: 400—500 г белай фасолі, 2—3 кавалачкі белага хлеба, 1—2 сталовыя лыжкі мукі, 1 сталовая лыжка молатых сухароў, соль, молаты перац — на смак, алей для смажання і паніровачныя сухары.

Для прыгатавання катлетнай масы бяром звараную ў падсоленай вадзе белую фасолю, астуджваем і прапускаем яе праз мясарубку разам з замочаным у вадзе кавалачкам белага хлеба. Дадаём муку, соль, молаты чорны перац. Атрыманую масу старанна вымешваем (нават можна злёгку ўзбіць). Для гушчыні масы можна дадаць 1 поўную сталовую лыжку молатых сухароў. Даць масе пастаяць 30—40 хвілін.

Сфармаваць невялікія катлеткі, запаніраваць іх у сухарах, абсмажыць на алеі. Падаць гарачымі.

ЧЫРВОНАЕ ЛОБІА

Вазьміце: 0,4—0,5 кг чырвонай фасолі, 0,5 л вады, 1,5 шклянкі ачышчаных грэцкіх арэхаў, 2—3 вялікія цыбуліны, 3—4 зубкі часнаку, 50 мл чырвонага віннага воцату або 1 гранат, па палове чайнай лыжкі солі і чырвонага молатага перцу, па 1 чайнай лыжцы хмелі-сунэлі, каляндры, 2 пучкі свежага зяленіва кінзы (калі ёсць).

Фасолю замачыць на ноч у халоднай вадзе. На наступны дзень заліць свежай халоднай вадой і варыць 1,5 гадзіны на вельмі маленькім агні. Рэпчатую цыбулю нарэзаць пёркамі і пасіраваць у раслінным алеі да мяккасці. Грэцкія арэхі змалоць або растаўчы вельмі дробна, змяшаць з соллю, тоўчаным часнаком, чырвоным перцам, сухімі спецыямі. Калі фасоля будзе гатовая, акуратна зліць вадкасць, што засталася, ў іншую каструльку, пры неабходнасці давесці аб'ём прыкладна да 0,5 л кіпеню. Зліваць ваду трэба адразу ж, інакш фасоля зноў стане цвёрдай і больш ужо ніколі не разварыцца! Каструльку з адварам зноў пастаўце на агонь і, калі закіпіць, усыпце арэхі і гатуйце на павольным агні хвілін 5, пасля дадайце смажаную цыбулю і варыце яшчэ хвіліны 3, часта памешваючы. Агульная кансістэнцыя павінна быць на ўзроўні вадкай смятаны.

Пасля ўліце вінны воцат або ўсыпце зерне граната, сечанае свежае зяленіва, пры жаданні яшчэ свежы часнок, размяшайце. Падаваць у гарачым ці халодным выглядзе, пасыпаўшы рэпчатай цыбуляй, нарэзанай тонкімі колцамі і марынаванай у вінным (або звычайным) воцаце 10 хвілін.

Ядомы анекдот

Па вуліцы ідзе поўная жанчына, падыходзіць жабрак:

— Мадам, я пяць дзён ужо нічога не еў.

— Вось каб у мяне была такая воля.

17 красавіка 2010 г. ЗВЯЗДА

УНП 100336711

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
Закрытого акционерного страхового общества «ДЕЛЬТА СТРАХОВАНИЕ» за 2009 год

220073, г. Минск, ул. Ольшевского, 22-111 , тел./факс 256 16 69. *Тыс. руб.*

АКТИВ		ПАССИВ	
1	2	3	4
Основные средства	36 445,7	**Источник собственных средств, всего**	1 958 006,1
Нематериальные активы	-	В том числе: Уставный фонд	1 849 920,0
Финансовые вложения, всего	31 924,2	Резервный фонд	18 490,2
В том числе: Инвестиции в дочерние общества	-	Добавочный фонд	68 431,9
Инвестиции в другие организации	-	Фонд накопления	-
Облигации и другие долговые обязательства	9 924,2	Фонд потребления	-
Прочие финансовые вложения	22 000,0	Целевое финансирование	-
Доля перестраховщиков в страховых резервах	-	Нераспределенная прибыль прошлых лет	0,1
Дебиторы, всего	227,3	Нераспределенная прибыль отчетного года	21 163,9
В том числе: Дебиторская задолженность по операциям страхования, сострахования и перестрахования	-	**Страховые резервы и фонды, всего**	25 578,3
		В том числе: Страховые резервы	21 873,8
		Фонд (резерв) предупредительных мероприятий	3 704,5
Депо премий по рискам, принятым в перестрахование	-	Гарантийные фонды	-
Дебиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования)	227,3	**Кредиторы, всего**	33 864,9
		В том числе: Кредиторская задолженность по операциям страхования, сострахования	220,4
Прочие активы, всего	2 015 097,5		
В том числе: Материальные ценности и затраты	20 421,8	Кредиторская задолженность по операциям перестрахования	-
Денежные средства	1 994 675,7	Депо премии по рискам, переданным в перестрахование	-
Собственные акции (доли)	-	Заемные средства	-
Прочие активы	-	Кредиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования)	33 644,5
Непокрытые убытки прошлых лет	-	Прочие пассивы	66 245,4
Непокрытые убытки отчетного года	-		
БАЛАНС	2 083 694,7	БАЛАНС	2 083 694,7

ОТЧЕТ О ФИНАНСОВЫХ РЕЗУЛЬТАТАХ ЗАСО «Дельта Страхование» за 2009 год

Тыс. руб.

Наименование показателя	Код строки	За отчетный период
1	2	3
I. Страхование жизни Страховые взносы (премии)	10	-
Страховые выплаты	20	-
Изменение резерва по страхованию жизни (+ или-)	30	-
Отчисления в гарантийный фонд	40	-
Расходы на ведение дела	41	-
Результат от операций по страхованию жизни (+или-)	50	-
II. Страхование иное, чем страхование жизни: Страховые взносы (премии) – нетто перестрахование	64	55 393,7
Изменение резерва незаработанной премии – нетто перестрахование (+или-)	67	-13 472,3
Оплаченные убытки (страховые выплаты) – нетто перестрахование	82	4 438,3
Изменение резервов убытков – нетто перестрахование (+ или -)	92	590,4
Изменение других технических резервов (+ или -)	100	-
Изменение иных страховых резервов (+ или -)	105	-
Отчисления в фонд предупредительных мероприятий и гарантийные фонды	110	553,9
Расходы на ведение дела	120	24 407,3
Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, переданным в перестрахование	121	-
Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, принятым в перестрахование	122	-
Результат от операций по видам страхования иным, чем страхование жизни (+ или -)	130	13 112,3
III. Прочие доходы и расходы, не отнесенные в разделы I и II		
Операционные доходы	140	159 483,9
Операционные расходы	145	69 517,6
Внереализационные доходы	150	9 387,4
Внереализационные расходы	155	7 295,2
Финансовый результат	156	105 170,8
Использовано прибыли	157	84 006,9
Нераспределенная прибыль (убытки) отчетного периода (+или-)	170	21 163,9

И.о. директора ЗАСО «Дельта Страхование» Жидень С.В.
Главный бухгалтер Пальцева М.П.

Достоверность баланса и отчета о финансовых результатах ЗАСО «Дельта Страхование» подтверждена аудитором индивидуальным предпринимателем Волчковой А.К. свидетельство № 0067877, выдано Администрацией Заводского р-на г. Минска от 04.03.2002 г.

Минский городской центр недвижимости

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»
18 мая 2010 года

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже здания производственного корпуса № 45 с инв. номером 500/С-34649, общей площадью 589,9 кв. м, расположенного по адресу: г. Минск, проспект Независимости, 58.

Начальная цена – 754 046 000 белорусских рублей.

Собственник помещения – СООО «Боартстрой». На продаваемое имущество обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства, неуплаченных пеней, примененных экономических санкций.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток в размере 75 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, бульвар им. В. Мулявина, 6, код 153001331; УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона.

Оплата объекта осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион состоится **18 мая 2010 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 19.04.2010 по 14.05.2010** включительно в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефон для справок:
(017) 227 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости» (г. Минск, ул. К. Маркса, 39).

РУП «Витебский институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «БЕЛРЕМСТРОЙСВЯЗЬ»

■ здание паровозного депо, инв. № 54, площадь 719,0 кв. м, расположенное по адресу: Витебская область, г. Лепель, ул. Деповская с начальной ценной продажи с учетом НДС 77 484 144 руб., задаток за участие в аукционе 7 748 414 руб., для обслуживания здания выделен земельный участок площадью 0,3410 га.

Аукцион состоится **12 мая 2010 в 12.00** по адресу: Витебск, ул. Свидинского, 4. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни **с 8.00 до 17.00 до 11.05.2010** (включительно) по адресу: Витебск, ул. Свидинского, 4. Порядок участия и проведения аукциона опубликован на сайте www.Ocenka.by. Официальное извещение аукциона опубликовано в бюллетене «Конкурсные торги в Беларуси и за рубежом» № 33 от 08.09.2009.

Контактные телефоны: 8 (0212) 435 435; 8 (029) 591 00 02; эл. почта: Vit.in@tut.by; www.ocenka.by

РУП «Витебский институт недвижимости и оценки»

ВНОСИТ ИЗМЕНЕНИЯ В ИЗВЕЩЕНИЕ,

опубликованное в газете «Звязда» от 10.04.2010 г. № 71

«Аукцион состоится **24 мая 2010 года в 14.00 по адресу: Витебская область, г. п. Бешенковичи, ул. Чуклая, 13…** Последний день приема заявлений и документов **18.05.2010 до 17.00.** Заключительная регистрация участников **24.05.2010 г. с 13.30 до 14.00** по месту проведения аукциона». Начальная цена по Лотам №№ 5, 6, 7 составляет 3 000 000 рублей.

Дополнительную информацию можно узнать у Организатора аукциона: 8 (0212) 435 435; 8 (029) 591 00 02.

В соответствии с Законом Республики Беларусь «Об экономической несостоятельности (банкротство)» и решением Хозяйственного суда Брестской области от 27.06.2008 г. **завершается ликвидационное производство в отношении РУПП «Барановичская фабрика пошива и ремонта обуви»**.

На основании вышеизложенного информируем о ликвидации профсоюзной организации предприятия.

Телефоны для справок:
8 (0163) 42 15 79, 42 44 56, 8 (029) 633 24 90.

УНП 200166804

Трастбанк

ЗАО «Трастбанк»

220035, г. Минск, ул. Игнатенко, 11

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 апреля 2010 года

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	2010 год	2009 год
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101		22 981,5	7 178,8
3	Средства в Национальном банке	1102		61 476,7	120 157,0

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



Усходні гараскоп на наступны тыдзень

Рыбаў чакаюць прыемныя весткі, а Шалям давядзецца папрацаваць

ВАЕН. На першы план цяпер могуць выйсці праблемы кар'еры. Не распыляйцеся і, вызначыўшы сабе выразныя і пэўныя мэты, упэўнена прасоўвайцеся да іх дасягнення. Не ўзвальвайце на сябе чужыя клопаты і праблемы, інакш не справіцеся з пастаўленымі задачамі. У аўторак новыя акалічнасці могуць прымусіць дарабляць ужо, здавалася б, гатовую працу. Можаце разлічваць толькі на ўласныя сілы. А ў пятніцу праца ў адзіноце прынясе больш плённыя вынікі.

ЦЯЛЕЦ. Справы, пачатыя зараз, могуць разваліцца без вашай у тым віны, таму не перанапружвайцеся і не прад'яўляйце занадта шмат прэтэнзій навакольным. Адпачніце і адновіце сілы, калі ёсць магчымасць. У сераду новыя знаёмствы могуць мець непрыемны працяг, так што абмяжуйце кантакты і абараняйцеся ад старонняга ўздзеяння. У пятніцу зможаце дамагчыся добразычлівасці лёсу, але ў адказ ад вас запатрабуецца нямала — набрацца неабходнай рашучасці для сур'ёзнага кроку. Субота можа быць звязаная з адкрыццямі і атрыманнем новых ведаў.

БЛІЗНЯТЫ. Творчы патэнцыял дазволіць актыўна працаваць, увасабляючы ў жыццё загадзя вызначаныя планы і задумы. Спрыяльны час для камандзіровак, вандраванняў або пераезду. Узрастае ваша таварыскасць і камунікабельнасць, так што добра было б сустрэцца з блізкімі сябрамі і абгаварыць даўно набалелыя тэмы. Час падумаць пра набыццё новых ведаў. Выдатна цяпер пойдзе засваенне новай мовы.

РАК. Самавалоданне і несумненныя лідарскія якасці дазволяць без наўмысных намаганняў кіраваць людзьмі. Вы з галавой паглыбіцеся ў працу, разбіраючыся з назапашанымі справамі. Не правакуйце сваімі дзеяннямі і выказваннямі незадаволенасць навакольных. Давядзецца адказваць за свае памылкі. Сцеражыцеся капаць каму-небудзь яму — яна з гарантыяй апынецца вашай. І тым больш не займайцеся самападманам — перабольшваць рэчаіснасць ніколі не варта, а цяпер асабліва.

ЛЕЎ. Паспрабуйце не прыспешваць падзеі і прымаць іх такімі, якія яны ёсць насамрэч, не перабольшваючы карціну жыцця як ружовымі, так і чорнымі тонамі. Галоўнае цяпер — не мітусіцца, а спакойна вырашаць усе праблемы. Паспрабуйце не гаварыць нічога лішняга, каб не стаць аўтарам плётак. Дапамажыце калегам або партнёрам, але не давайце нікому садзіцца сабе на шыю. У другой палове тыдня магчымае з'яўленне новых дзелавых партнёраў.

ДЗЕВА. Апыніцеся на ростані. Збярыцеся з сіламі і паспрабуйце аб'ектыўна ацаніць свае праблемы. Перад рашучым кідком вам неабходны паўнавартасны адпачынак. Гэта дапаможа страпянуцца і знайсці выйсце са становішча, якое стварылася. Вандраванні прынясуць разнастайныя ўражанні, даведаецеся шмат новага, карыснага і цікавага. У чацвер можа скласціся неспадзяваная сітуацыя на працы, якая паставіць вас у цяжкае становішча. З начальствам пры гэтым пажадана не спрачацца і не канфліктаваць.

ШАЛІ. Панядзелак абяцае масу сур'ёзных спраў, і ў вашых інтарэсах заняцца імі шчыльна, з поўнай самааддачай. Не выключана, што вам давядзецца выслухаць нечыя тайны: захавайце пачутае, ды і сам факт такой гутаркі, у таямніцы — вам будуць удзячныя. Сямейныя і асабістыя праблемы могуць стаць перашкодай да актыўнай працы.

СКАРПІЁН. Павысіцца ваша актыўнасць, адчуеце прыліў сіл. Тыдзень спрыяльны для новых пачынанняў, пошуку дзелавых партнёраў і аднадумцаў. Імкніцеся ва ўсім пазбягаць паспешных высноў. У чацвер лепш не пачынаць новых спраў. На выхадных займіцеся добраўпарадкаваннем вашага жылля — абнаўленне падоўжыць лёгкасць і натхненне.

СТРАЛЕЦ. Надыходзіць досыць спрыяльны перыяд, але памятайце, што канкурэнты не дрэмлюць. Не варта дэманстраваць усім і кожнаму свае слабыя месцы. Рашучасць — гэта выдатна, але не трэба даходзіць да неразважлівасці. У пятніцу, калі вы хочаце разумна разважаць сілы, зоркі раяць накіраваць іх на здабыццё душэўнай раўнавагі. Давярайце інтуіцыі. У суботу вы можаце пацешыць сябе і навакольных цікавымі ідэямі і нечаканымі рашэннямі.

КАЗЯРОГ. Ваша самакрытычнасць і патрабавальнасць да сабе і навакольных дазволіць здзейсніць цуды ў працы, але можа падпсаваць адносіны з блізкімі людзьмі і калегамі. У першай палове тыдня будзьце абачлівей у кантактах, не шакіруйце людзей сваёй празмернай лінейнасцю і залішняй рэзкасцю. У панядзелак з'явіцца магчымасць скарыстацца добрым шанцам, які зусім нядаўна перад вамі замаячыў, — не прапусціце яго, бо сітуацыя ў любы момант можа змяніцца не на вашу карысць.

ВАДАЛЕЙ. Вашы намаганні пажадана накіраваць на захаванне раўнавагі ў навакольным свеце. Выніковасць аўторка найперш будзе залежаць ад самавалодання і самадысцыпліны. Нешта няўлоўнае зменіцца ў сераду — і жыццё стане больш прыемным і спакойным. А непаразуменні, якія паўстануць у чацвер бліжэй да вечара, хутка ўладзяцца і не паўплываюць на паспяховы зыход справы. У пятніцу верагодная вялікая нагрузка, стомленасць, блытаніна ў справах і праблемы.

РЫБЫ. Можна чакаць прыемных вестак і прывабных прапаноў здалёк. Серада спрыяльная для любых пачынанняў, звязаных з грамадскай дзейнасцю. Гармонія ў адносінах з навакольнымі, узаемнае разуменне зробяць працэс выпрацоўкі сумесных рашэнняў эфектыўным. У суботу адчуеце ўздым сілаў і раскрыццё сваіх магчымасцяў. У гэты дзень удала вырашацца любыя праблемы — было б што вырашаць.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд (10 красавіка).

Па гарызанталі: Торф. Капліца. Збыт. Хаос. Рот. Якут. Банту. Елка. Мяжа. Ват. Марсо. Калуга. Яік. «Оза». Каза. Грым. Карачы. Стралок. Тын. Залом. Поза. База. Катар. Сцяг. Імамат. Пяро. Карагач. Мулявін.

Па вертыкалі: Магамаеў. Апёк. Ат. Аклад. Грыб. Рана. Вучыч. Зыкіна. Крагі. Мыза. Фаза. Такт. Стапа. Борт. Пляц. Мяч. Крысо. Явар. Тля. Смог. Том. Бамбук. Анапа. Наркоз. Лот. Залоза. Талкунова. Кардамон.

ЦЫРК дый толькі!

17 красавіка па ініцыятыве Еўрапейскай асацыяцыі цыркаў і Сусветнай федэрацыі цырка, што дзейнічае пад патранажам Яе вялікасці прынцэсы Манака Стэфаніі, абвешчана першым у гісторыі Міжнародным днём цырка. Адзначыць гэты асаблівы дзень прапануецца як самім забаўляльным установам, арганізаваўшы своеасаблівы «дзень адчыненых дзвярэй» для экскурсій або зрабіўшы адкрытыя вулічныя прадстаўленні, так і ўсім прыхільнікам цыркавога мастацтва, якія могуць не толькі наведаць прадстаўленні, але таксама зладзіць свае ўласныя святочныя мерапрыемствы.

Як паведамляе афіцыйны сайт Сусветнай федэрацыі цырка (The Federation Mondiale du Cirque), ініцыятыву падтрымалі сёлета Беларусь, Данія, Іспанія, Канада, ЗША, Індыя, Нідэрланды, Германія, Францыя, Швецыя, Швейцарыя і Паўднёвая Афрыка, запланаваныя таксама мерапрыемствы ў Венгрыі, Мексіцы, Расіі і іншых краінах.

Дарэчы, у Еўрапейскую цыркавую асацыяцыю на сёння ўваходзіць 21 цырк. Усе яны атрымалі лісты за подпісам прэзідэнта гэтай арганізацыі Урса Пілса, дзе акрамя ідэй святкавання змешчана анкета з галоўным пытаннем — «што робіць цырк цыркам?». Адказы, дасланыя з еўрапейскіх цыркаў, асацыяцыя збіраецца выкарыстаць у падрыхтоўцы дакументаў для ЮНЕСКА ў якіх прапануе падтрымаць цыркавое мастацтва як частку сусветнай культурнай спадчыны.

Напрыклад, у Маскоўскім цырку Нікуліна на Цвятным бульвары адзначаюць, што было б цікава арганізаваць сумесны перфоманс з клубамі фанатаў цырка, запрасіць на прадстаўленне ў гэты дзень членаў урада і іншых уплывовых асобаў, а таксама размясціць на ўваходзе ў цырк спецыяльную гасцявую кнігу, дзе наведнікі змогуць выказаць свае пажаданні і ідэі наконт святкавання Дня цырка.

Як збіраецца адзначыць свята Беларускі дзяржаўны цырк, «Звяздзе» расказаў яго **галоўны рэжысёр**

Легенда савецкага цырку, клоун Алег ПАПОЎ.

Сяргей БАНДАРЧУК:

— Адмысловага прадстаўлення рабіць не будзем, падчас спектаклю проста раскажам наведнікам пра гэты дзень — хто і навошта яго прыдумаў, таксама развесім у холе адмыслова падрыхтаваныя святочныя плакаты. У антракце зробім для гледачоў экскурсію за кулісы, каб крыху бліжэй пазнаёміць іх з работай і жыццём артыстаў.

— А прапановы, пажаданні і віншаванні ад публікі прымаць будзеце?

— Калі нехта захоча нас павіншаваць і штосьці пажадаць — прымем з задавальненнем!

— Вы ўжо далі свой адказ на пытанне анкеты Еўрапейскай цыркавой асацыяцыі, што робіць цырк цыркам?

— Безумоўна, артысты. Ну, а калі меркаваць па дзіцячых асацыяцыях — найперш клоўны.

...Як казаў некалі знакаміты Юрый Нікулін, чалавек прыходзіць у цырк як мінімум тройчы ў жыцці: дзіцем — з бацькамі, потым са сваімі ўласнымі дзецьмі, і нарэшце з унукамі. То чаму б не скарыстаць дадатковую нагоду і не акунуцца ў свет жанглёраў і акрабатаў, паветраных гімнастаў і бясстрашных коннікаў, факіраў і ўтаймавальнікаў, увогуле таленавітых і забаўных артыстаў, двухногіх і чатырохлапых, яшчэ раз — пазапланава?

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

ТРЫ КОНКУРСЫ

Падаём іх чарговыя заданні:



Аўтарскі-9/16 (Уладзімір Матус). **Белыя:** 12, 18, 19, 23, 32, 37, 41, 43, 49 (9). **Чорныя:** 9, 10, 25, 28, 34, 35, 39 (7). Выйгрыш.

На гэтым гэты конкурс завяршаецца.



Аўтарскі-10/10 (Віктар Шульга). **Белыя:** b6, c3, c7, d6, f2 (5). **Чорныя:** a3, a5, d8, e5, f4, g5, g7 (7). Таксама перамога белых.

Мемарыяльны бліц-53/4 (мініяцюра з калекцыі Анатоля Рогача, якому прысвечаны конкурс): 1. cd4 dc5 2. bc3 ed6 3. gf4 ba5 4. d:b6 5. fg3 fe5 6. gf2. Дэбют «Старая партыя»; трэба было 6. ... gf6 з роўнасцю. Чорныя ж пайшлі 6. ... de7. Дапусціўшы ў сваёй пазіцыі такую істотную хібу, як «рэшата», яны даюць магчымасць белым правесці шыкоўную дзевяціхадовую камбінацыю з «колам пашаны» ў фінале. Пашукайце яе і вазьміце партыю на заметку.

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».**

УДЗЕЛЬНІЧАЕМ, ПЕРАМАГАЕМ

У класіфікацыйным конкурсе «Пагода ў доме»-6 удзельнічалі: І. Астроўскі, В. Варушыла, А. Нікіфараў, А. Літвінаў і В. Шульга (Мінск), В. Голас (Любань), В. Талкачоў (в. Уздзевічы Клімавіцкага раёна), Д. Камчыцкі (Магілёў), У. Бандарык (в. Лугавая Слабада Мінскага раёна), А. Кіслы (Узда), А. Шурпін (Клімавічы), Аляксандра Камінская (Вілейка), С. Нячаеў (Баранавічы), А. Белы і П. Шклудаў (Наваполацк), Б. Завадскі (Брэст), А. Пераводнікаў і У. Сапяжынскі (Рагачоў), Г. Будзіловіч (Івацэвічы), А. Пярхальскі (Глыбокае), настаўніца Марыя Яўгенаўна Лічко і яе вучні Дар'я Малашка, А. Жур, Я. Казлоў і М. Фокін (в. Возера Уздзенскага раёна), А. Кагоцька (Пінск), Л. Вітошкін і В. Ціханенка (Гомель), І. Працук (Паставы), С. Бурко (Орша), С. Кацэр (Сянно), М. Саўкін (п/а Суднікі Валожынскага раёна), І. Ананіч і К. Козел (Гродна), А. Цішураў (пас. Друцк Талачынскага раёна), У. Статкевіч (пас. Зялёны Бор Івацэвіцкага раёна), А. Агіевіч (Кобрын), М. Трухан (в. М. Пагост Салігорскага раёна), А. Янчук (Камянец) і інш.

А перамаглі ў конкурсе Сяргей Бурко, Леанід Вітошкін, Аляксандр Кагоцька, Дзмітрый Камчыцкі, Уладзімір Сапяжынскі і Пётр Шклудаў, якія знайшлі поўнае пабочнае рашэнне ў заданні № 6 і прыватнае — у № 4 і набралі па 16,5 ачка. Яны пацвердзілі сваё высокае званне першакласных рашальнікаў, а астатнія справіліся з нормай другога разраду. Згодна з класіфікацыяй, зацверджанай Міністэрствам спорту і турызму Рэспублікі Беларусь, для выканкамаў гэта публікацыя з'яўляецца падставай, каб прысвоіць звяздоўскім канкурсантам адпаведныя разрады.

Сярод жанчын адзначаецца Аляксандра Камінская. У яе актыве — 16 ачкоў, як і ў В. Варушылы, А. Шурпіна, А. Кіслага, І. Працука, А. Белага, В. Ціханенкі, І. Астроўскага, І. Ананіча, В. Талкачова і Б. Завадскага. Яны таксама ўбачылі іншую развязку ў заданні № 6.

Лаўрэатаў конкурсу, яго суддзю Мікалая Грушэўскага і каардынатара Яўгена Ляхава чакаюць сюрпрызы ад Свіслацкага прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі (кіраўнік Канстанцін Міхайлавіч БАРЭЛЬ).

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.05	20.15	14.10
Віцебск —	5.51	20.07	14.16
Магілёў —	5.55	20.05	14.10
Гомель —	5.55	19.58	14.03
Гродна —	6.21	20.30	14.09
Брэст —	6.25	20.27	14.02

Месяц

Маладзік 14 красавіка.
Месяц у сузор'і Блізнятаў.

Імяніны

Пр. *Веньяміна, Георгія, Івана, Іосіфа, Мікалая.*

К. *Германа, Роберта, Сцяпана.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НАДВОР'Е на заўтра

Дзве даты

17 красавіка

1899 год — нарадзілася Лідзія Іванаўна Ржэцкая, вядомая беларуская актрыса, народная артыстка БССР (1944) і СССР (1955). Працавала ў Першым таварыстве беларускай драмы і камедыі, Беларускім тэатры імя Я. Купалы. Стварыла на сцэне рознахарактарныя вобразы драматычнага і камедыйнага плану. Сярод найлепшых роляў: Альжбета («Паўлінка» Я. Купалы), Маці («Айчына» К. Чорнага), Вярбіцкая («Спяваюць жаўрукі» Я. Купалы) і інш. Здымалася ў кінастужках «Хто смяецца апошнім» і «Гадзіннік спыніўся апоўначы». Вядомая выступленнямі па радыё. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1951). Памерла ў 1977 годзе.

1939 год — Савецкі Саюз прапанаваў Англіі і Францыі заключыць трохбаковы дагавор аб узаемнай дапамозе на выпадак германскай агрэсіі, аднак перамовы, якія працягваліся да сярэдзіны жніўня, не прынеслі жаданага плёну, і 21 жніўня 1939 года СССР заключыў дагавор аб ненападзе з Германіяй.

Цытата дня:

«Памерці за ідэю — гэта гучыць нядрэнна, але чаму б не паспаць ідэю памяраць за нас?».

Артур Льюіс (1915 —1991), англійскі эканаміст.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ДЛЯ ВАШАЙ КАРЫСЦІ

Расткі здароўя

Вясна — гэта не заўсёды цёплае сонейка і добры настрой. На жаль, гэта яшчэ авітаміноз і абвастрэнне прастудных захворванняў. Як умацаваць сваё здароўе? Выдатную падтрымку можа аказаць прарошчанае семя. Пераканайцеся ў гэтым самі.

Жывая ежа

Чым жа добрае прарошчанае зерне? Галоўная яго перавага ў тым, што яно — не лякарства, вынайдзенае ў лабараторыі, і не харчовая дабаўка. Прараслі — здаровая ежа, падараная нам прыродай! Што робіць іх карыснымі для чалавека? Гэта той унікальны выпадак, калі мы ўжываем у ежу цэласны арганізм, што знаходзіцца ў фазе мінімальнай актыўнасці. Менавіта гэтая асаблівасць — жывы арганізм — і з'яўляецца самай важнай. Зерне, якое рыхтуецца прарасці, змяшчае нашмат больш вітамінаў і мікраэлементаў, чым «сухое».

Чым яны карысныя?

Рэгулярнае ўжыванне «жывых» зярнят прыводзіць у норму абмен рэчываў, кіслотна-шчолачны баланс. У іх шмат вітамінаў і мікраэлементаў, а яшчэ яны ачышчаюць арганізм ад таксічных рэчываў. Вельмі карысныя такія зярняты як для арганізма, які расце, так і для сталых людзей (запавольваюць працэс старэння), рэкамендуюцца яны і тым, у каго праблемы са стравараннем, бо аблягчаюць нагрузку на стрававальную сістэму амаль на 90%. Псіхолагі прыйшлі да высновы, што энергія прарошчанага семені дае чалавеку зарад бадзёрасці.

Акрамя агульнага станоўчага ўплыву на арганізм, расткі кожнай асобнай культуры маюць свой асаблівы набор карысных рэчываў, вітамінаў і мікраэлементаў, валодаюць спецыфічным лекавым дзеяннем і могуць быць рэкамендаваныя пры тых ці іншых захворваннях.

Ільняныя зародкі ад усялякіх немачаў

Прараслі лёну дапамагаюць безадказна працаваць многім органам і сістэмам нашага арганізма. Дзякуючы сваёй унікальнай слізістасці яны з'яўляюцца эфектыўным ачышчальнікам усяго страўнікава-кішачнага тракта, паскараюць стрававanne і рэгулююць работу кішэчніка.

Яшчэ адна добрая якасць гэтага цудоўнага прадукту — вялікая колькасць кальцыю,таму прараслі лёну рэкамендуюцца цяжарным, дзецям у перыяд актыўнага росту, пры лячэнні касцёва-мышачных траўмаў.

Такія прараслі з-за вялікай колькасці натуральных тлушчаў, з'яўляюцца выдатным сродкам прафілактыкі атэрасклерозу галаўнога мозга, садзейнічаюць захаванню эластычнасці сценак крывяносных сасудаў, паляпшаюць стан пры гіпертаніі, паніжаюць узровень халестэрыну. Ужываць прараслі лёну лепш перад ядой зранку ці ўдзень па 15—20 г.

Пажыўныя бабовыя

Гэтыя «жывыя» зярняты з'яўляюцца багатай крыніцай вітамінаў А, С, B_1, B_2, B_3, B_6, а таксама мікраэлементаў: жалеза, крэмнію, бору.

Калі вы хочаце забыць аб прастудзе, пачніце ўжываць прараслі бабовых. Натуральны бялок, які змяшчаецца ў іх, павышае імунітэт арганізма. Яны валодаюць цукрапаніжальным, мачагонным і супрацьмікробным дзеяннем. Іспанскі гарох (яго яшчэ называюць нут) асабліва карысны тым, у каго праблемы з лішняй вагой. Калорый у ім мала, а вітамінаў шмат.

Каласіцца пшаніца

У прарошчанай пшаніцы больш за ўсё лекавых рэчываў, бо яна змяшчае практычна ўвесь набор мікраэлементаў і вітамінаў (асабліва шмат вітаміну Е). Аднак неабходна ўлічваць, што іх чароўнае дзеянне праяўляецца толькі пры сістэматычным выкарыстанні. Сярод кароткатэрміновых вынікаў можна назваць знешні выгляд валасоў і скуры. Пры працяглым выкарыстанні праросткаў пшаніцы адбываецца ачышчэнне арганізма ў цэлым. Неабходна адзначыць, што свае лепшыя якасці вітамін Е праяўляе, калі знаходзіцца ў тлустым асяроддзі, таму гатуйце з іх салаты з алеем.

Салата з прарошчаных зярнят. *Вазьміце любое прарошчанае зерне, старанна прамыйце, пракруціце праз мясарубку, дадайце на смак мёд, разынкі, натаркаваную моркву, сушаную і свежую садавіну, арэхі, цукаты, цэдру лімона.*

-2652-

ПАДКАЗКІ КВЕТКАВОДАМ

Каб дом патанаў у зеляніне!

Свежае паветра — абавязковая ўмова для добрага развіцця раслін. Кактусы, напрыклад, могуць не зацвісці толькі таму, што ім не хапае свежага паветра. Усе расліны не любяць халодных скразнякоў.

1. Пастарайцеся забяспечыць расліне пастаяннае месца ў доме, бо большасць раслін не любіць, калі іх перастаўляюць з месца на месца.

2. Не думайце, што, паварочваючы вазон з кветкамі вакол восі, вы зробіце асвятленне больш раўнамерным. Многія расліны ўспрымаюць гэта як сігнал трывогі і рэагуюць скідваннем бутонаў. Выкарыстоўваць такі прыём можна двойчы на год — восенню і вясной.

3. Памятайце, што нават невялікі слой пылу на акне затрымлівае вялікую колькасць сонечнага святла, таму шыбы павінны быць чыстымі. Двайныя рамы затрымліваюць больш святла, чым адзінарныя.

4. Не паліваце кветкі вадой з-пад крана. Набярыце ў коўш ваду, дайце ёй пастаяць як мінімум суткі.

5. Калі хочаце, каб у кватэры было прыемнае паветра, пастаўце ў пакоі некалькі гаршкоў з кветкамі. Пакаёвая папараць, герань, філадэндран выцягваюць з паветра шкодныя рэчывы, ачышчаюць яго, забіваюць хваробатворныя мікробы. А герань плюс да ўсяго пазбаўляе ад галаўнога болю.

6. Калі расліна захварэла, вазьміце лупу і ўважліва агледзьце з абодвух бакоў лісце, сцябліны, кветкі, каб знайсці шкоднікаў, якіх, дарэчы, быць не павінна. Некаторыя здзіўляюцца, адкуль бяруцца шкоднікі, калі іх раней не было. Большасць з іх пераносіцца насякомымі, іншыя ў выглядзе лічынак захоўваюцца ў глебе і чакаюць спрыяльных умоў, расліны бываюць заражанымі ўжо пры набыцці, але бачна гэта толькі праз пэўны час.

7. Калі вы забываеце паліваць кветкі, завядзіце кактусы ці іншыя сукуленты. Некаторыя расліны выдатна «жывуць» без глебы — у вазах з вадой. Гэта таксама аблягчае працэс паліву.

8. Глебу для кветак, прынесеную з вуліцы, трэба абавязкова апырскаць растворам марганцоўкі, каб выдаліць дажджавых чарвякоў.

9. Калі расліна захварэла, неадкладна пастаўце яе асобна ад іншых. Грыбковыя захворванні вельмі заразныя!

10. Гаршкі, у якіх вырошчваюцца расліны, 2-3 разы на год трэба мыць звонку гарачай вадой з мылам жорсткай шчоткай, а затым апалоскваць.

11. Калі гліняныя гаршкі старыя і на іх з'явіліся белыя вапнавыя разводы, натрыце іх лупінамі сырой бульбы і пакіньце на ноч. Затым пачысціце шчоткай.

РУКАДЗЕЛЛЕ

Упрыгожваем кашпо

Ідэя ўпрыгожваць кашпо і гаршкі для кветак не новая. Толькі ўсе іх упрыгожваюць па-рознаму. Прапануем яшчэ адзін варыянт — вельмі просты, даступны нават дзіцяці і танны.

Пасля рамонту і святаў у многіх застаюцца кавалачкі шпалераў, шчыльнай абгортачнай паперы, кардон. Разлажыце іх на стале, падумайце, як лепш спалучыць іх па колеры, малюнку. А далей усё проста: выразайце прамавугольнікі розных памераў і наклейвайце пры дапамозе клею «Момант» на ваша кашпо. Гэтак жа можна аформіць і скрыначку для нітак, шкатулку і нават перайначыць старую тумбачку, калі пафарбаваць яе ў прыдатны колер і размясціць такі калаж на скрынках.

-2653-

Веснавое ўшанаванне зямлі

На Дабравешчанне зямля «прачынаецца і адчыняе свае нетры». Вялікім грахом лічылася чапаць яе ў гэты дзень — араць, гарадзіць плот, забіваць калы.

● Паўсюдна лічылі, што калы, забітыя ў зямлю да ворыва і сяўбы, «забіваюць» урадлівасць, і пасеянае зерне можа не прарасці. Вясковы люд строга сачыў за тым, каб ніхто да Дабравешчання не ўваткнуў у зямлю аніякай галінкі, каб не патурбаваць яе раней часу. Лічылася, што такія парушэнні выклікаюць халодную вясну і засушлівае лета.

● У дзень Светлага Уваскрасення Хрыстовага дзеці збіраліся на пагорках і пачыналі качаць чырвоныя яйкі. Для іх гэта была простая святочная забава, а дарослы люд глядзеў на гэта зусім інакш: яйка — сімвал новага жыцця, таму непасрэдным дотыкам да зямлі яно павінна было абудзіць жыватворныя сілы карміцелькі.

● З той самай мэтай шалупінне велікодных яек і іншыя рэшткі святочнай ежы закопвалі на жытнёвай ніве або на агародзе.

● Радаўніца, як і Дабравешчанне, з'яўлялася той сакральна-магічнай мяжой, якая, з аднаго боку, стрымлівала працу на зямлі, а з другога — наадварот, дазваляла яе распачынаць. Залатое правіла народнай культуры патрабавала: перш чым пачаць наводзіць парадак на сваім прысядзібным участку, трэба было пайсці і навесці парадак на магілах сваіх продкаў, каб заручыцца іх падтрымкай. Таму нават калі Радаўніца адзначаецца даволі позна, то ўсё роўна спачатку наводзіцца парадак на могілках, а затым ужо гаспадар распачынае ворыва і сяўбу.

● **Іакаў, Якаў (13 мая).** У народным асяроддзі пра гэты дзень казалі: «На Якава зямля ніякая», і таму катэгарычна забаранялі што-небудзь у гэты дзень садзіць або сеяць.

● Для старажытных славянскіх вераванняў характэрная персаніфікацыя зямлі. Яна, як і чалавек, можа спаць, абудзіцца, заціжарыць, урадзіць, стагнаць, плакаць, таму на працягу года былі дні, калі яна святкавала «свае імяніны». Заўважалі, што «на Сямёна Зілота — 23 мая — у зямлі імяніны». Лічылі, што ў гэты дзень нельга араць, сеяць, гарадзіць плот, таму што зямля адпачывае.

Духаў дзень (першы панядзелак пасля Тройцы)

● Дзень найвялікшага шанавання зямлі. У некаторых мясцінах Беларусі існаваў выключны па сваім эмацыйным змесце звычай: жанчыны выходзілі ў поле, станавіліся на калені і тройчы цалавалі зямлю, называючы яе імянінніцай.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнемся!

Сын — бацьку:

— Тата, а наша бабуля лаялася сёння страшнымі словамі.

— Як?

— Яна казала: «А каб гэты нясшчасны тэлевізар зламаўся сёння перад самым футболам!»

☺

Тлумачальная начальніку за спазненне на працу: «За Вас маліўся.»

☺

У дзіцячым садку:

— Вовачка! Хто твае бацькі?

— Мой тата працуе, а мама прыгожая!

☺

Караблекрушэнне. Пасажыры боўтаюцца ў вадзе, тырчаць адны галовы. Матросы на шлюпцы спяшаюцца выратаваць іх: хапаюць за валасы і зацягваюць у лодку. Раптам побач са шлюпкай з'яўляецца абсалютна лысая галава. Адзін матрос некалькі секунд збянтэжана глядзіць на яе, потым б'е па лысіне вяслом:

— Нам тут не да жартаў!

«Першы і апошні раз я паабяцаў жонцы забраць малых з садка...»

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 1848. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12